
ЛІДА



НАШ РАДАВОД

1993 г.

ГАРАДЗЕНСКАЯ КРАЯЗНАЎЧАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ

НАШ РАДАВОД

Кніга 6

Выданне заснована ў
1990 г.

Гродзенскае абласное аддзяленне Беларускага фонда культуры

Ліда 1994

63. 3 (4 Бел)
З 11

БЕЛАРУСКАЕ КРАЯЗНАЎЧАЕ ТАВАРЫСТВА
ГРОДЗЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛАРУСКАГА ФОНДУ КУЛЬТУРЫ
ГРОДЗЕНСКАЯ КРАЯЗНАЎЧАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ
ЛІДСКІ ГАРВЫКАНКАМ
ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ САВЕТ ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПОМНІКАЎ
ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

З гісторыі Лідчыны

(Матэрыялы міжнародных гісторыка-краязнаўчых чытанняў у Лідзе 24 — 26 ліпеня 1993 г.)

Укладальнік і рэдактар выдання
А. У. БОГУШ, кандыдат гістарычных навук.

© — Гарадзенская краязнаўчая асацыяцыя
© — Гродзенскае аддзяленне Беларускага фонда культуры

ПРАДМОВА

Працягвае свой шлях выданне Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі „Наш радавод". Выданне, якое ўжо стала адметнай з'явай у культуры Гарадзеншчыны, у вывучэнні, захаванні і прапагандзе яе культурна-гістарычнай спадчыны, у вяртанні славутых імён Прынеманскага краю, якія раней былі забаронены ці забыты. Кожная новая кніга „Нашага радаводу" – гэта, па традыцыі, вынік рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, якая не толькі дае магчымасць усведаміць багацце гістарычных і культурных здабыткаў народа Беларусі, але і далучае да даследніцкай, краязнаўчай, асветніцкай працы новых зацікаўленых людзей, такім чынам, данесці светлае зерне Адраджэння да многіх гарадоў і весяў.

Менавіта таму канферэнцыі „Нашага радавода" вандруюць па Гродзенскай вобласці. Будзе да месца ўзгадніць, што свой шлях яны пачалі 18 лістапада 1989 г. у Воранаўскім раёне, дзе адначасова адбылася ўрачыстасць да 205-годдзя з дня нараджэння і 125-годдзя з дня сканання Тэадора Нарбута. У месцы, дзе нарадзіўся выдатны сын Прынёманскага краю, быў адчынены памятны знак, прысвечаны сям'і Нарбутаў – удзельнікам паўстання 1863 года. Такім чынам „Наш Радавод" – гэта фактычна выданне, якое адлюстроўвае плённую працу навукоўцаў, дзеячаў культуры, краязнаўцаў, якія мэтанакіравана працуюць у рэчышчы культурна-асветніцкай праграмы, ці не галоўнай часткі, у складзе агульнавядомай „Спадчыны".

Аб гэтым сведчаць і наступныя канферэнцыі, адбыўшыеся ў Гродне, і тыя памятныя знакі і помнікі, адкрыццё якіх пад час працы канферэнцый стала традыцыйнай з'явай. Цікавасць да навуковых пытанняў, якія ўздымаюцца праграмай „Наш радавод", вельмі вялікая, яны маюць рэзананс сярод спецыялістаў і аматараў культуры ў сумежных краінах. Не выпадкова ад самага пачатку канферэнцыі адбываюцца як міжнародныя. Гэта можа тлумачыць, чаму чарговыя выпускі „Нашага радавода" становяцца і ўжо сталі бібліяграфічным здабыткам. Яшчэ раз нагадаем аб выданнях кнігі „Наш радавод".

1. „Наш радавод". Сб. ст. „Материалы I и II межреспубликанских научных конференций по историческому краеведению Белоруссии и генеалогии. Кн. 1–2. Гродно, 1990.

2. „Наш радавод". Материалы международной научной конференции по региональной истории Восточной Европы „Культура народов Великого княжества Литовского и Белоруссии. XIII– нач. XX в.". Кн. 3. Часть 1–3. Гродно, 1991.

3. „Наш радавод". Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі „Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі. XIII – пач. XX ст.". Кн. 4. Частка 1–3. Гродна, 1992 г.

4. „Наш радавод". Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі „Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі. XIII – пач. XX ст.". Кн. 5. Частка 1–3. Гродна. 1993 г.

Гэта кніга, паважаемы чытач, з'яўляецца 6-ай у серыі „Наш радавод". У ёй вынікі працы „Міжнародных гісторыка-краязнаўчых чытанняў у Лідзе, якія адбыліся 25–26 ліпеня 1993 г. і былі прысвечаны Дню Незалежнасці Беларусі. 26 ліпеня была адзначана адкрыццём помніка беларускаму нацыянальнаму генію Францыску Скарыне, што стала з'явай агульнадзяржаўнай. У чарговай кнізе „Наш Радавод" дзей-насць і жыццё Скарыны стала тэмай асаблівай увагі, а многія факты і ідэі скарыназнаўства ўпершыню ўведзены ў навуковы зварот. Гэта, як і паседжанні канферэнцыі „Гісторыя і краязнаўства Лідчыны" выклікалі вялікую зацікаўленасць у навуковай і культурнай грамадскасці Ліды, далі магчымасць выпрацаваць галоўныя накірункі развіцця музейнай справы ў Лідскім краязнаўчым музеі. Кніга змяшчае таксама матэрыялы сімпозіума „Археалогія Лідчыны", прысвечанага памяці Міхася Ткачова – выдатнага гісторыка, археолага, даследчыка, сапраўднага патрыёта Беларусі, нястомнага змагара за справу Нацыянальнага Адраджэння.

Андрэй МАЙСЯЁНАК,

нам. старшыні камісіі Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў па навуцы, культуры, адукацыі і выхаванню, старшыня Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі.

І. СКАРЫНІЯНА

Францішак Скарына, як прыхільнік паяднання народаў

Адам Мальдзіс
г. Мінск.

Францішак Скарына рабіў сваю вялікую справу ў часы, калі актывізавалася фармаванне беларускай народнасці. Побач з імкненнямі да цэнтралізацыі, узмацнення ўлады, у Вялікім княстве Літоўскім, дзяржаве этнічна разнароднай, ажывіліся дэцэнтралісцкія тэндэнцыі, барацьба „рускага" (беларускага) і літоўскага пачаткаў, далейшае размежаванне якіх станавілася тады актуальным і перспектыўным. Гэтая барацьба выявілася, да прыкладу, у міжусобіцы Гаштольдаў і Астрожскіх, а калі ўзяць сферу ідэалагічную – у „Хроніцы Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага" (1527), якая, магчыма, была свайго роду адказам гаштольдаўскай групоўкі на выхад „рускіх" кніг Ф. Скарыны. Радаслоўная літоўскіх князёў узводзіцца ў хроніцы да легендарнага заснавальніка княства Палемона, які самому „цесару Нерону был кровныи"[1].

Скарынаўскія выданні адыгралі велізарную ролю ва ўзмацненні „рускага" пачатку ў княстве, фармаванні беларускай народнасці і нацыянальнай самасвядомасці. Даючы свайму народу, „людем простым посполитым"[2], друкаваную кнігу на роднай мове, вялікі палачанін, гаворачы словамі В. Пічэты, „уводзіў Беларусь у сям'ю славянскіх еўрапейскіх народаў, ён заяўляў аб праве беларускага народа на нацыянальна-культурнае самавызначэнне"[3]. Дзякуючы Скарыне беларусы атрымалі новыя, большыя магчымасці для развіцця сваёй асветы, літаратуры, далучэння да агульнаеўрапейскай культуры, выхаду на гістарычную арэну.

У сваіх поглядах Францішак Скарына кіраваўся пераважна не сярэдневяковай, а рэнесанснай канцэпцыяй народа. Як вядома, сярэдневяковы ўніверсалізм быў наднацыянальны, касмапалітычны. Беларускі ж першадрукар падзяляў нацыянальна-дзяржаўную дактрыну Новага часу, якая абвяшчала права кожнага народа на самастойнае развіццё. У прадмовах Скарыны яўную перавагу над

„хрысціянскім касмапалітам" бярэ рэнесансны патрыёт „рускага" краю, роднага Полацка (полацкае паходжанне паслядоўна падкрэсліваецца). Патрыятызм гэты свядомы, дзейсны, страсны. Крылатымі сталі словы з прадмовы да „Книги Иудиф-вдовицы": „Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возьдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають" (59). Скарына ўхваляе „вдовицу Іудиф", якая „для места рожения", баронячы радзіму сваю, „выдала ест живот свой на небезпеченство" (59).

Кансалідацыі беларускай народнасці садзейнічаў скарынаўскі пераклад Бібліі на „рускый язык" (24). Тым самым гэтая мова, у многім агульная для тагачасных беларусаў і украінцаў, перастала быць „lingua vulgaris„узвышалася, станавілася ўпоравень з такімі „свяшчэннымі" мовамі, як старажытнаяўрэйская, грэчаская, лацінская. Не выпадкова ў Скарыны лексічныя прыклады з гэтых моў вельмі часта (26, 56–56, 88 і інш.) ставяцца ў адзін поравень са словамі, узятымі з таго „языка", з якога аўтара прадмоў Бог „на свет пустил". Трэба было мець грамадзянскую мужнасць, каб сцвярджаць такое, калі ў Еўропе быў яшчэ моцны дух Сярэдневякоўя.

Любоў Скарыны да свайго народа, да роднай мовы, аднак, нідзе не перарастае ў нацыянальны эгаізм ці эгацэнтрызм. Як шануючы чалавечую асобу, беларускі першадрукар адначасна паважаў грамадства, сукупнасць людзей, так і ўзвялічваючы „рускі" народ, ён нідзе не абасабляў яго, не супрацьпастаўляў іншым народам, чалавецтву. Наадварот, у прадмовах да скарынаўскіх выданняў часта падкрэсліваецца роўнасць народаў і іх моў. Уся шматлікасць „языков, царств, людей и народов" (70) узыходзіць да адных і тых жа першаасноў. Перад законам аднолькавыя „вси народи, буди іудеи или еллини" (127). „Каждый народ" можа ўхваліць свае „права земская" (95). Такімі ж раўнапраўнымі з'яўляюцца мовы: для таго, каб „провещевати" „правду Божию", аднолькава прыдатныя ўсе „языки, еже суть под солнцем" (120).

На такой жа, раўнапраўнай аснове павінны, паводле Скарыны, будавацца ўзаемныя адносіны паміж дзяржавамі („царствамі"). Кожная з іх мае аднолькавую рацыю гістарычнага быцця, бо аднолькава ўзыходзіць сваім пачаткам да легендарнага Ноя (70). Кожнай з іх належыць быць суверэннай адзінкай, дастаткова моцнай, каб абараніць сваю незалежнасць, і дастаткова мірнай, каб не крыўдзіць суседзяў. Найпершы абавязак грамадзян – шанаваць сваё „царство", умацоўваць яго, але не чужым коштам. Патрыятызм Скарыны не меў нічога агульнага з замкнутасцю ці, тым больш, нецярпімасцю, агрэсіўнасцю. Сваімі выданнямі, сваім асабістым прыкладам беларускі першадрукар актыўна садзейнічаў уваходжанню Вялікага

княства Літоўскага ў супольнасць еўрапейскіх дзяржаў, іх мірнае сужыццё (гэтыя ідэі асабліва актуальныя цяпер, калі Беларусь здабыла суверэннасць).

У першай палове XVI ст. Вялікае княства Літоўскае знаходзілася, як і іншыя краіны тагачаснай Еўропы, у стане канфлікту з суседнімі дзяржавамі. На 1512–1522 гг. якраз прыпадала чарговая зацяжная вайна з Масквой – актыўнай яго суперніцай у „збіранні" „рускіх" зямель (Іван ІІІ толькі што абвясціў сябе „государем всея Руси"). У такіх умовах лёгка было паддацца ваяўнічым настроям, супрацьпаставіць адзін народ другому і тым самым падліць алею ў палаючы агонь. Але ў прадмовах да выданняў Скарыны такой варожасці і такога супрацьпастаўлення няма. Наадварот, беларускі гуманіст дае чытачам, у тым ліку панам-радзе, таму ж К. Астрожскаму, які выступаў супраць Маскоўскай дзяржавы, зусім іншы ўзор для пераймання. І ўзор гэты – мудры Саламон, пры панаванні якога „был мир и покой по вся времена царства его" (17). Ідэал Скарыны – моцны, суверэнны, абсалютны манарх, які, аднак, няўхільна кіруецца нормамі права, у тым ліку і ў зносінах з іншымі дзяржавамі. Міралюбства, карысная для ўсяго грамадства „згода" (130) – вызначальная рыса кожнага законнага правіцеля. Што ж датычыцца беззаконнікаў, тыранаў (Навухаданосар, Артаксеркс), то яны, услед за Бібліяй, надзелены ў прадмовах Скарыны крайняй агрэсіўнасцю. Гэта – заваёўнікі, рабаўнікі, разбуральнікі.

Францішак Скарына не асуджаў войны ўвогуле. Як і правіцеляў („О царех добрых и о злых"), ён падзяляў іх на „законныя" і „незаконныя", справядлівыя і несправядлівыя. Першыя з іх вядуцца дзеля абароны айчыны ад чужаземных захопнікаў, вызвалення з няволі. І тут, у справядлівай вайне, прыдатныя ўсе сродкі. Скарына ўхваляе ўчынак Юдзіф, якая „для высвобожения отчизны, взор на собе мужем даючи, не лютовала ест живота своего" (66). Такім жа подзвігам лічацца ўчынкі царыцы Эсфір, што выбавіла „от побитий" сваіх суайчыннікаў. На баку праведнікаў звычайна нябесныя сілы, прырода. Гедэону, напрыклад, „дал ест Бог знамя на руне волняне, и поразил со тремисты мужми сто тысещей и двадцеть тысещей воин медиамлян и амалехитян" (113). Калі Ісус Навін пачаў абараняцца ад Амалеха, „солнце стало ест на едином месте так долго, якобы за целых два дни, и не двигалося с него, дондеже побил всих врагов своих" (52). Усведамленне таго, што на іх баку праўда, памнажае сілы біблейскіх персанажаў: „двана-десятый судья" Самсон „единою щекою ословою тысещу мужей филистымских убил" (115). Ухваляючы такія патрыятычныя ўчынкі, такую мужнасць у абароне радзімы, Скарына, безумоўна, даваў добры прыклад жыхарам княства, якім тады трэба было адбіваць татарскія набегі.

Зусім інакш ставіўся беларускі гуманіст да войнаў несправядлівых, захопніцкіх – яны супярэчаць пісанаму і няпісанаму праву,

маральна-этычным нормам. У прадмове да „Книжки плачу Еремиина" дадзена рэзка адмоўная ацэнка дзеянняў вавілонскага цара Навухаданосара, які, узяўшы Іерусалім, па-варварску разрабаваў храм Саламона, узяў у палон „людей словутных", пасля чаго пачалося „опустение и скажение града" (110). Плач Ераміі і на руінах Іерусаліма гучаў у часы Скарыны (і гучыць сёння) як страсны пратэст супраць разбуральных вынікаў вайны, якая не пакідае пасля сябе „каменя на камени" (111).

У пашырэнні міралюбства Францішак Скарына ўскладваў вялікія надзеі на веды і мастацтва. Паэтычнае слова, музыка, на яго думку, змякчаюць „жестокое сердце", робяць „душу и смыслы" больш высакароднымі, узмацняюць у чалавеку духоўны пачатак і тым самым „людей в приязнь зводять" (10). Беларускі першадрукар горача рэкамендуе чытачам псалмы Давіда, таму што яны „гнев и ярость усмиряють, мир и покой чинять" (10). Скарыне была ўласціва рэнесансная вера ў мастацтва як фактар збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў.

Такому ж мірнаму сужыццю народаў і дзяржаў служыла практычная дзейнасць Скарыны. Карыстаючыся ўсходнімі (рукапіснымі) і заходнімі (друкаванымі) ўзорамі, перакладаючы і выдаючы адну з самых універсальных кніг чалавецтва, ён нібы перакідваў мост паміж краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы, паміж Руссю Літоўскай і Руссю Маскоўскай, ахопленымі тады ўзаемнай варожасцю. Справа Скарыны збліжала ўсходнеславянскія народы, усю „братию своей Руси", узмацняла ў яе пачуццё кроўнага адзінства. А гэта, у сваю чаргу, вяло (няхай больш у патэнцыі) да змяншэння напружанасці, узмацнення даверу паміж „Масквой" і „Літвой".

Скарынаўскае сцвярджэнне міру як нармальнага стану грамадства сфармавалася і развілося пад уплывам некалькіх дзейсных фактараў. Найперш гэта народная мараль, мясцовае звычаёвае праправа, традыцыі старажытнарускага пісьменства. Затым – раннехрысціянскае вучэнне з яго заклікамі да міру, любві і міласці васці, ідэі Фамы Аквінскага, які стварыў „тэорыю справядлівых войнаў"[4]. Урэшце – рэнесансны гуманізм. Многія палажэнні Скарыны генетычна і тыпалагічна блізкія да палажэнняў тагачасных заходнееўрапейскіх мысліцеляў – найперш Эразма Ратэрдамскага і Томаса Мора. Першы з іх нястомна заклікаў народы да міру, спрабаваў прымірыць варожыя еўрапейскія краіны. У „Пахвале Дурасці" (1511) і „Скарзе Міру, адусюль выгнанага і ўсюды раструшчанага" (1517) Эразм Ратэрдамскі ўсю адказнасць за жахі і разбурэнні вайны ўскладваў, як і беларускі гуманіст, на дрэнных і неразумных правіцеляў, што, па сутнасці, з'яўляюцца „падонкамі грамадства"[5]. Сугучнае асуджэнне „злачыннай справы – вайны" мы знаходзім у сучасніка Скарыны Міколы Гусоўскага[6], у іх паслядоўніка, асветніка-друкара Сымона Буднага, які параўноваў чужаземнае

захопніцтва з разбоем.[7].

З прадмоў вялікага палачаніна нарадзілася антываенная гуманістычная традыцыя, што развівалася на працягу стагоддзяў і асабліва выявілася ў нашы дні.

---

[1] Полное собрание русских летописей: Летописи белорусские и литовские. М., 1980. Т. 35. С. 128.

[2] Скарына Ф. Прадмовы і пасляслоўі. Мн., 1969. С. 20. Далей спасылкі на гэта выданне даюцца ў дужках непасрэдна ў тэксце.

[3] Пичета В. И. Белоруссия и Литва XУ–XУІ вв. М., 1961. С. 670.

[4] Гл. Tazbir J. Mysi polska w nowozytnej kulturze europejskiej. Warszawa, 1986. S. 13.

[5] Эразм Роттердамский. Похвала Глупости. М., 1983. С. 80.

[6] Гусоўскі М. Песня пра зубра. Мн., 1980. С. 80.

[7] Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Мн., 1962. С. 53.

Литературное творчество Франциска Скорины и традиции европейского Ренессанса

Ю. А. Лабынцев
г. Москва.

Имя доктора Франциска Скорины „из славного града Полоцка" становится известным все более широкому кругу людей во всем мире.

В своем „Предъсловии в книгу Иов" Скорина писал: „И всякому человеку потребна чести, понеже есть зерцало жития нашего, Лекарство душевное. Потеха всем смутным наиболей тым они же суть в бедах и в немощах положены. Надежа истинная востания из мертвых и вечного живота".

В этой непростой для понимания современного читателя фразе – тысячелетний опыт человечества, указание пути к осмыслению нашего бытия, общечеловечской его сути, той самой Вечной Истины, поискам которой в разные времена и у различных народов были отданы жизни лучших философов, писателей, музыкантов, художников, религиозных деятелей.

Когда просматриваешь все то, что время сохранило для нас из обширного литературного наследия Франциска Скорины, видишь, сколь еще долго и непросто будет оно входить в круг нашего чтения, ибо нам сложно понять скорининское время, его символи-

ку и язык. Чтение скорининских книг – большой труд, труд философский и эстетический.

Франциск Скорина – писатель-философ, писатель-гуманист, выступивший перед своим народом с яркими патриотическими воззваниями, и одновременно глубокий психолог, лирик, сумевший рассказать людям о величайших тайнах мира.

Наряду со многими книгами, в том числе им самим написанными, Скорина издал в своем переводе значительную часть Библии. Она стала первой печатной Библией у восточно- и южнославянских народов и вышла в свет почти за полстолетия до появления польских печатных Библий.

Её издатель начинал свою деятельность одновременно с реформатором немецкого духа, языка и литературы – Мартином Лютером. Их деяния сопоставимы, но известность совершенно несравнима. Франциска Скорину знают куда меньше, а он ведь порой даже опережал своих великих современников: Мартина Лютера, Эразма Роттердамского, многих других.

Франциск Скорина во многом оказывается первым не только в культурах восточных славян: белорусов, русских, украинцев, но и во всей Восточной и Южной Европе. Он открыл и возглавил целое культурное направление.

Любой народ, любая нация, всё человечество не могут жить вне культуры, вне определенной природной, материальной и духовной среды. Культура сейчас понимается как несомненное условие самой жизни, возможности нашего существования.

Удивительно, что именно так рассуждал полтысячи лет назад и Франциск Скорина. В 1519 г. он писал: „Понеже от прирожения Звери ходящие в пустыни знают ямы своя. Птицы летающие по возъдуху, ведают гнезда своя. Рибы плывающие по морю и в реках чуют виры своя. Пчелы и тым подобная боронят ульев своих. Також и люди игде зродилися и ускормлены суть по бозе к тому месту великую ласку имают".

Задолго до гения мировой литературы Л. Н. Толстого Франциск Скорина доверил бумаге такие сокровенные, выстраданные свои мысли, читающиеся теперь как некая абсолютная законченная формула духовного развития человека: „Есть наивышшая мудрость розмышление смерти и познание самого себе"; „Наиболей любовь ко всим да соблудает, еже есть совершена над все иные дарования, без нея же ничто проспешно есть".

Средством, инструментом пропаганды этой земной всечеловеческой любви гуманист Скорина избрал печатную книгу, доступную его братьям на Руси благодаря хорошо понятному, близкому к народному языку и значительным тиражам.

„Да совершен будет человек" – вслед за авторитетами древности восклицал Франциск Скорина. Он стремился сделать все,

чтобы его народ на родном языке мог постичь сокровенную мудрость человечества.

Как выдающийся европеец-гуманист Скорина страстно желал послужить общему делу духовного возрождения человека, его внутреннему совершенствованию.

Этому и посвящены книги великого белоруса, воспринимающиеся сейчас как самая дорогая национальная реликвия, как духовное сокровище, национальная святыня, как символ всей тысячелетней белорусской культуры. Поражает то, что по своему числу книги белорусского просветителя составляют 2/3 всех изданий кириллицей в мире за XУ – первую четверть XУI в. и более половины подобных изданий, если иметь в виду XУ и всю первую половину XУI столетия.

Скорина поместил в напечатанных им библейских книгах даже свой портрет, тем самым как бы утверждая собственную индивидуальность, свою личность, свое авторство, несомненную причастность к тем глубинным гуманистическим движениям европейского Ренессанса, которые оформились в его эпоху в виде „христианского гуманизма" Эразма Роттердамского и Томаса Мора.

Библия глубоко символична и потому сложна для восприятия, её необходимо не просто читать, а изучать, только тогда и начнет открываться истинный смысл в ней написанного. Франциск Скорина, вслед за Григорием Великим, считал, что она „под простыми словы замыкает тайну".

Такое понимание лежит в основе средневековых и ренессансных учений о символе. Данте Алигьери, например, писал: „...надо знать, что писания могут быть поняты и должны с величайшим напряжением толковаться в четырех смыслах. Первый называется буквальным, и это смысл, который не простирается дальше буквального значения вымышленных слов, – таковы басни поэтов. Второй называется аллегорическим, он таится под покровом этих басен и является истиной, скрытой под прекрасной ложью... Третий смысл называется моральным, и это смысл, который читатели должны внимательно отыскать в писаниях на пользу себе и своим ученикам. Такой смысл может быть открыт в Евангелии... Четвертый смысл называется анаготическим, то есть сверхсмыслом или духовным объяснением писания; он остается истинным также в буквальном смысле и через вещи означенные выражает вещи наивысшие, причастные вечной славе".

В своем взгляде на роль и значение „книги книг" Скорина чрезвычайно близок к Эразму Роттердамскому, этому „Вольтеру XУI века", самому известному тогда европейскому писателю, считавшему, что „Библию должны читать все".

В силу исторических условий, в отличие от западноевропей-

ских гуманистов, Скорина должен был весьма считаться с особой, веками узаконенной восточнославянской книжной традицией, которую, тем не менее, он значительно реформировал. Невозможность отойти в своем литературном творчестве на традиционном литературном языке – церковнославянском – и даже на языке, близком к народному, от этой традиции (иначе он бы не был понят соотечественниками-современниками), вынуждает Скорину максимально опираться на неё, часто высказывать свои собственные суждения устами известных древних авторитетов.

Использование в творчестве чисто традиционных, восточных, начал и сплав их с западными дали необычайно интересный, неповторимый, оригинальнейший литературно-графический материал, ставящий в тупик при его рассмотрении не только современника Скорины, но и ученого наших дней. Рождающийся художественный образ заставляет одновременно помнить и о литературных особенностях Востока, и о достижениях графического искусства Запада, и о той общности культур, которая свойственна всей Европе. Вот почему невозможно отделить в творчестве Скорины эти две главнейшие европейские традиции: традицию византийского Востока и традицию римского, латинского Запада.

Величайшая заслуга Скорины в том, что он предназначает свои издания и сочинения не узкому кругу образованных лиц, пишет для них не на латинском языке, как это делает, например, Эразм Роттердамский, а, используя в основном традиционные литературные жанры и близкий к народному язык, создает народноязычные издания, предназначавшиеся всем людям без исключения. Скорина как мастер слова предстает перед нами сразу в нескольких авторских ипостасях: писателя-прозаика, гимнографа и поэта, великолепного переводчика с нескольких древних и новых языков.

Скорина-прозаик работал во многих жанрах, одни из которых были у нас почти традиционными, другие, и их едва ли не большинство, впервые введены в белорусскую, да и во все восточнославянские литературы именно им.

Скорина – поэт-гимнограф – тема неисчерпаемая.

Ему, Франциску Скорине, принадлежат и многочисленные, порой весьма объемные, произведения классического жанра молений, помещенные в гимнографических сборниках, сборниках канонов и акафистов. В молении гораздо отчетливее обнаруживается индивидуальность писательской работы Скорины по сравнению с другими сочинениями, входящими в тот или иной сборник.

Творчество Скорины – это синтез старого и нового в белорусской литературе. Без использования старой, классической традиции, без опоры на неё его просто бы не поняли соотечественники.

Суть литературного подвига Скорины в том, что ему впервые

столь масштабно и успешно удалось слить в своем творчестве две главнейшие традиции европейской культуры – восточную и западную, ввести новые литературные формы.

Францыск Скарына і навацыі еўрапейскай медыцыны пачатку 16 стагоддзя

А. Г. Майсяёнак
г. Гродна.

У канцы 80-х гадоў і асабліва ў 1990 годзе да 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны з'явілася шмат публікацый пра гэтую высакаадукаваную, шматгранную, таленавітую асобу, яго шлях як нацыянальнага героя, выдатнага прадстаўніка эпохі Еўрапейскага Адраджэння. Вось толькі медычная дзейнасць Скарыны, за рэдкім выключэннем (В. Грыцкевіч), амаль не знайшла свайго адлюстравання ў гэты перыяд. Таму мы лічым неабходным звярнуцца да гэтага аспекта дзейнасці „доктора Франтишка со славного града Полоцка" і разгледзець некалькі пытанняў адносна медыка-біялагічнай дзейнасці Ф. Скарыны. Відаць, пытанняў магло быць і больш, таму што гэты навуковы і практычны аспект дзейнасці нашага вялікага асветніка па сутнасці застаўся па-за рамкамі глыбокіх навуковых даследаванняў. Таму асабліва ўважліва трэба яшчэ раз разгледзець архіўныя матэрыялы, публікацыі айчынных і замежных даследчыкаў, вынікі даследаванняў у сумежных галінах гісторыі навукі, тэхнікі і культуры, каб акрэсліць самае галоўнае.

Першае – гэта вызначэнне галоўных месц лекарскай дзейнасці Скарыны. Вядома, што ў 1504–1506 годзе ён вучыўся ў Кракаўскім універсітэце і 15 снежня 1506 г. быў узведзены ў ступень бакалаўра. Тым не менш, месца яго першапачатковай медычнай адукацыі (Кракаў? Прага? Заходняя Еўропа?), і першых гадоў сталай лекарскай працы невядома. У лістападзе 1512 г. вучоныя Падуанскага ўніверсітэта аднагалосна прызналі яго годным звання доктара медыцыны, і ён атрымаў „знакі медыцынскай годнасці". Найбольш верагодна, што ў наступныя гады медычная дзейнасць Скарыны працягвалася ў Празе, дзе ў 1517–19 гг. ён надрукаваў „Біблію зуполную" са сваімі прадмовамі і пасляслоўямі. Вядомы архіўны запіс храніста В. Гаека пра пажар у Празе 2 чэрвеня 1541 г., дзе сярод загінуўшых значыцца"... Францішак, сын колішняга доктара Руса..." [1]. На падставе гэтага дакумента раней лічылася, што Скарына памёр у 1541 г. (ці не раней?) [2]. На наш погляд гэты дакумент сведчыць аб ранейшай лекарскай (доктарскай) дзейна-

сці доктара Руса (Скарыны) і аб тым, што пасля вяртання ў Прагу ў другой палове 30-х гадоў і пазней ён практычна лекарскай справай не займаўся. Магчыма, што пасада каралеўскага садоўніка абмяжоўвала яго магчымасці, але ён, аднак, мог быць прыватным (хатнім) лекарам у некаторых асоб. Вядомае паведамленне хроніста Бжэзана ад лета 1577 г. пра скананне князя Іржыка Чэтла, дзе ўзгадваецца: „Ён карыстаўся паслугамі доктара, нейкага паляка Сімяона па прозвішчы Рус з Полацка", бязумоўна, трэба аднесці к дзейнасці сына Францыска Скарыны [3].

Амаль усе 20-я гады Скарына правёў у Вільні. На жаль, дакументаў пра яго медычную працу ў Вільні не захавалася, але дзейнасць першадрукара адзначана выданнямі 1522 і 1525 гадоў. Ёсць пра яго звесткі і ў акце Літоўскай метрыкі за 1526 г., дзе ён характарызуецца як „...выдатны муж пан Францыск, доктар медыцыны..." [4]. Магчыма, цяжкія абставіны кнігавыдавецкай працы, прэтэнзіі крэдытараў вымусілі яго пайсці на службу да прускага герцага Альбрэхта. Але тут не ўлічваецца яшчэ адна магчымасць: запрашэнне Скарыны ў Кёнігсберг на выкладчыцкую дзейнасць.

Калі звярнуцца да вядомых лістоў герцага Альбрэхта 1530 года з гэтай версіяй, то становішча зразумела, чаму Скарына характарызуецца як „...доктар прыгожых мастацтваў і медыцыны, ДАРАВІТЫ ВЫКЛАДЧЫК, (у арыгінале - професар)..." (ліст ад 16 траўня) [5]. Вядома, што Альбрэхт Брандэрбургскі, вялікі паборнік ідэй Рэфармацыі, вельмі спрыяў развіццю сістэмы адукацыі. Заснаваны ім у 1544 годзе універсітэт (Collegium Albevitium) магчыма пачынаўся яшчэ раней з дзейнасці аднаго ці некалькі школ альбо калегій. Тут, магчыма і быў адзначаны талент Скарыны, як выдатнага выкладчыка. Побыт Скарыны ў Кёнігсбергу быў кароткім, аднак і тут ён працягваў лекарскую справу. Аб гэтым сведчыць запіс прускага герцага Альбрэхта ў падарожнай грамаце ад 16 траўня 1530 года, якім адзначаецца ўвага да Скарыны „...як... да выдатнага мужа непарадальнага розуму і мастацкага дару, светлага лекарскага таленту і слаўнага вопыту..." [6]. У пачатку 30-х гадоў Ф. Скарына працаваў сакратаром і лекарам віленскага епіскапа Яна [7].

Час Францыска Скарыны - гэта эпоха навацый еўрапейскай медыцыны. Вось якія падзеі, зафіксаваныя ў хроналогіі Дзержаноўскага [8] могуць быць цікавымі для разумення медыка-біялагічных ведаў і дзейнасці Скарыны:

- 1505 - адкрыццё другой кафедры лекарскага аддзела Кракаўскай Акадэміі;
- 1509 - успамінаецца статут цэха хірургаў у Вільні;
- 1512 - выданне першай фармакапеі „Thesaurus avomatariorum";
- 1513 - выданне Рэсліным падручніка акушэрства „Rosengart-

er„;

– 1516 – пасмяротнае выданне працы Ахіла „Corporis Humani Anatomia„;

– 1517 – першае выданне „хірургіі палёвай";

– 1520 – першая друкаваная праца ў Польшчы пра сіфіліс (Кіла);

– 1522 – выданне „Conservatio sanitat is„;

– 1524 – выданне Эленбогам таксілагічнага трактата „Morbi metallici„;

– 1525 – выданне ў Рыме збора прац Гіпакрата на італьянскай мове;

– выданне ў Венецыі збора прац Галена;

– 1526 – праца Парацэльса, які выказаў прынцыпы ятрахіміі;

– 1528 – выданне галоўных трактатаў Парацэльса (1528–1530).

Як вынікае з гэтых звестак, у пачатку 16 стагоддзя на хвалі Адраджэння ішоў перагляд галенізму, абагульненне практыкі медычнай дзейнасці і прапаганда асабістага, эксперыментальнага вопыту, галоўным выразнікам якой стаў Парацэльс (Тэафаст Бамбаст фон Гогенгейм) [9]. Няма падстаў не пагадзіцца з думкай В. П. Грышкевіча аб спатканні і дыскусіі Скарыны і Парацэльса ў час (1520–25 гг.), побыта астатняга ў Польшчы [10]. Аўтары польскай „Гісторыі фармацыі" больш канкрэтна ўспамінаюць месца (Вільня) і год (1520) літоўска-польскай вандроўкі заснавальніка ятрахіміі [11]. Наватарскія погляды Парацэльса патрабавалі абмеркавання і, як сведчыць ён сам, у Вільні перамаглі яго апаненты (Скарына?). На жаль, няма матэрыялаў, якія адносяцца да гэтага дыспута, але магчыма, што сутыкнуліся крайнія пункты гледжання: Парацэльса (як прапагандыста) фармацэўтычнай хіміі і Скарыны, добрага знаўца медычных сродкаў раслінага паходжання (аб гэтым сведчыць праца Ф. Скарыны з сярэдзіны 30-х гадоў аж да сканання ў каралеўскім батанічным садзе). Аднак без пошукаў навуковых прац Скарыны цяжка ўявіць яго адносіны да рэфарматарскіх ідэй Парацэльса, тым больш, што развіццё гэтых ідэй было не простым і далёка не паўсюдным.

---

1. Францыск Скарына: Зб. дакументаў і матэрыялаў. Мн.: Навука і тэхніка. 1988. С. 184–185.

2. Там жа. С. 334.

3. Там жа. С. 187.

4. Там жа. С. 8?–91.

5. Там жа С. 95–97.

6. Там жа С. 98–100.

7. Там жа. С. 150.

8. R. Dzievzanowski Slownik chronologicznj dziejjw medycyny itarmaeji Warszawa, 1983, s. 1513–1529.

9. М. Джуа История химии. М., „Мир", 1966, С. 61–69.
10. В. П. Грицкевич С факелом Гиппократа. Из истории белорусской медицины. Мн., Наука и техника, 1987, С. 102–103.
11. R. Rembiclinski, R. Kurnicka Historia farmacji, Warszawa, 1987, S. 85–87.

Гродзенская Скарыніяна

Л. Р. Шагун

г. Гродна.

Беларускае скарыназнаўства, як раздзел гісторыка-кнігаведчай навукі, прайшоў складаны, 70-гадовы шлях. Яго многагадовая гісторыя часамі азмрочвалася абмежаванасцю і прадузятасцю ў падыходзе да гэтай вялікай і адказнай справы ў вывучэнні гісторыі культуры. Значны ўклад у скарыніяну зрабілі ўраджэнцы Гродзеншчыны: вучоны Я. Ф. Карскі, пісьменнікі Алег Лойка, А. Цётка, Данута Бічэль-Загнетава, Вольга Іпатава, нашы землякі Максім Багдановіч, Валянцін Таўлай, Ларыса Геніюш. Першую значную працу аб Скарыне ў савецкі час надрукаваў у рэвалюцыйным Петраградзе Я. Ф. Карскі. Яна называецца „Доктор Франциск Скорина" ў часопісе „Чырвоны шлях" у нумарах № 3 і № 4 за 1918 год.

Пасля акадэмік Карскі дапрацаваў яе, змясціў у кнізе „Беларусы" ў 1921 годзе. Заслуга гэтай працы ў тым, што ўпершыню быў раскрыты веліч Скарыны, яго шаноўнае месца ў гісторыі беларускага народа. Я. Ф. Карскі выказаў меркаванне, што магчыма некаторыя кнігі, перакладзеныя Ф. Скарынай, засталіся рукапіснымі. Работа Я. Карскага не згубіла сваёй актуальнасці і сёння.

У ненаяўнай форме на спадчыну першадрукара спасылаліся К. Каліноўскі і Ф. Багушэвіч, абгрунтоўваючы гістарычнае права беларусаў на сваю родную мову.

Рэалістычнае, гістарычна-праўдзівае і рамантычна-ўзнёслае адлюстраванне вобраза Скарыны і яго эпохі пачынаецца ў творчасці М. Багдановіча, аднаго з першых даследчыкаў беларускага адраджэння 16 стагоддзя (артыкул „Белорусское возрождение" ў часопісе „Украинская жизнь", 1915 г. №№ 1, 2), аўтара манаграфічнага артыкула пра Ф. Скарыну (1913, не збярогся). Яго цыкл вершаў „Старая Беларусь" (1911) высокамастацкае адлюстраванне духоўнай красы нашых сярэдневяковых асветнікаў эстэтычнай каштоўнасці плёну іх працы – кнігі. У гэтым жа цыкле шэдэўр Багдановічавай гісторыка-філасофскай лірыкі „Безнадзейнасць" –

першы твор у беларускай літаратуры, у якім глыбока раскрываюцца трагічныя супярэчнасці жыцця і светапогляду скарынінскай эпохі:

„Скарына, доктар лекарскіх навук. У доўгай вопрацы на вежы сочыць зоры. Яны спрыяюць! Час! З рухавых рук Скарыны п'е адвар пан земскі пісар хворы...

Але па тым, як імгліцца ізумруд у „пярсцёнку залатым", пісар з болем зразумеў, што яму ўжо не вярнуцца да жыцця (Багдановіч Максім. Вянок. Вільня, 1913: с. 46). Вобраз Францыска Скарыны ўвасабляе ў вершы творча актыўны пачатак тагачаснай культуры пераходнага перыяду ад сярэднявякоўя да новага часу: ён адукаваны ўрач і батанік, знаўца традыцыйнай і народнай медыцыны, разам з тым ён, як і яго сучаснікі, еўрапейскія вучоныя, – астролаг, перакананы ў існаванні таямнічай сувязі паміж рухам зор і душэўна-цялесным станам чалавека.

Мастацкую Скарыніяну складаюць творы розных жанраў: вершы, раманы, апавяданні. У іх аснове ляжаць гістарычныя матывы, але праз іх бачацца і сённяшнія праблемы.

Да імя Скарыны звяртаецца ў сваім вершы „Аб маіх вершах" пясняр рэвалюцыйнай барацьбы Заходняй Беларусі Валянцін Таўлай. У светлых напеўных радках верша „Скарына" Ларысы Геніюш устае славутая Падуя, званы калакалоў, бачна адчуваем строгія экзаменацыйныя залы:

Пад Падуяй неба такое накруг,
як сны мастакоў Адраджэння.
Падуя – горад вялікіх навук,
славутых надзей і імкненняў.

Вобразы Падуі змяняюцца мядзведжымі сцяжынкамі пушчы, па якой едзе ў родную Беларусь „першы доктар на ўсходзе Еўропы":

...Вязе Беларусі, народу свайму
жыццё сваё, знанне і імя.
І першую кнігу на мове сваёй
Друкуе нашчадкам Скарына.

Прасякнуты вялікай любоўю да роднай мовы верш заканчваецца словамі:

Будзем думаць, вучыцца тварыць
Так, як ты.
у сваёй мове,
Скарына.

У выглядзе ўспамінаў напісаны верш Алега Лойкі „Скарына – каралеўскі садоўнік на Градчанах": векавечныя ліпы Прагі – навеялі паэту карціны далёкага мінулага, вобраз выгнанніка доктара Скарыны:

Адсюль, з Градчан, ён пэўна, па-за Влатву
Не раз на поўнач любую глядзеў:
То пах туман над дзвінскаю атавай,
То цвіў чаромхай воблак у вадзе.

Думкі Скарыны аб людзях паспалітых, аб радзіме, аб яе незавершанай справе.

Садоўнік каралеўскі, муж славуты
Доктар мастацкіх лекарскіх навук,
Я б тут не замарудзіў ні мінуты,
Зноў не змываў бы фарб друкарскіх з рук.

Думкі Алега Лойкі пераклікаюцца з вершам Дануты Бічэль-Загнетавай „Рыска". У наш час імя Скарыны, як сцвярджае аўтар, аднагучна з думкамі аб Радзіме, аб яе гістарычным лёсе.

Аб Скарыне „ўспамінае" ў сваім вершы „Вільнюсу" Вольга Іпатава, у роздуме аб старажытным культурным горадзе, дружалюбных адносінах літоўцаў да беларусаў.

Мастацкая Скарыніяна ўключае звыш 50 твораў. Значным творам з'яўляецца раман-эсе Алега Лойкі „Францыск Скарына". Ён выклікае вялікую зацікаўленасць у чытачоў. Вядома, што гістарычна дакладных матэрыялаў аб біяграфіі Скарыны мала. Аўтар выкарыстоўвае сваё права і на мастацкую выдумку і навуковыя даследаванні. Чытачы ўдзячны аўтару за тое, што ён знайшоў прымальныя формы Скарынінскай мовы, зрабіў яе зразумелай сучаснікам.

Новае пакаленне, маладыя імёны пісьменнікаў прынёманскага краю папаўняюць скарбніцу Скарыніяны. Алесь Жамойцін да верша „Не кат Радзіму ўвасабляе" карыстаецца эпіграфам на словы Скарыны: „...Гэтак жа і людзі да таго месца, дзе народзіліся і ўзгадаваліся, вялікую ласку маюць..."

Гродзенскае аддзяленне Беларускага фонда культуры ў бягучым годзе выдала зборнік вершаў „Кола" літаратурнай суполкі „Наднёманскія галасы". Прыемна далучэнне да Скарыніяны Юрася Пацюпы, а Святлана Станкевіч так піша:

Выйдзі з сваіх берагоў.
Выйдзі з чырвонае кнігі,
Мова маіх бацькоў.
Мова Францыска Скарыны.

---

1. Багдановіч М. Безнадзейнасць „Збор твораў" у 2-х т. Т. 1. Мн., 1988. С. 71.
2. Бічэль-Загнетава Д. Рыска. „Вершы і паэмы". Мн., 1982, с. 218.
3. Геніюш Л. Скарына. „Невадам з Нёмана". – Мн., 1967. с. с. 162–163.

4. Іпатава В. Вільнюсу „Раніца". Мн., 1969. с. 24.

5. Лойка А. Скарына – каралеўскі садоўнік на Градчанах „Вершы". – Мн., 1967. – с. 27–28.

6. Лойко О. Франциск Скорина „Неман". – 1988. – № 3 с. 65–110, № 4. с. 34–94.

7. „Народу свайму услугуючы"... Творы беларускіх аўтараў, прысвечаныя Ф. Скарыне Мн. 1990. с. 35, 52, 58, 104–106.

8. Таўлай В. Аб маіх вершах. „Вершы". – Мн., 1979. – с. 68.

Состояние и перспективы увековечивания имени Ф. СКОРИНЫ

Ф. И. Игнатович

г. Гродна.

Одной из лучших традиций большинства народов и стран является увековечение имен выдающихся государственных и общественных деятелей. В равной мере это относится и к известным ученым и специалистам, самоотверженно выполняющим свой профессиональный долг. К числу тех, кто не предан забвению, относится и Ф. Скорина (ок. 1490 – ок. 1551) – доктор медицины, книгоиздатель и просветитель эпохи Возрождения. Его имя бережно сохраняется и увековечено не только на родине в Республике Беларусь, но и в ряде других стран.

На единичные факты увековечения имени Ф. Скорины указывает ряд энциклопедических и справочных изданий. Так, Белорусская советская энциклопедия отмечает, что оно присвоено в Минске улице и типографии, в Полоцке – улице и педагогическому училищу.[1] Проф В. Ч. Бржеский в „Указателе увековеченных имен медицинских работников СССР" зафиксировал 5 наименований в честь Ф. Скорины.[2] По его данным в Полоцке имя Ф. Скорины носят не только улица и педагогическое училище, но и типография. Кроме того, он указал и на наличие улицы Ф. Скорины в Вильнюсе.

Наиболее полные данные, включающие 13 фактов увековечения имени Ф. Скорины, приведены в энциклопедическом справочнике „Их именами названы..."[3] К сожалению, сведения о части из них не были включены в выпущенный этим же издательством капитальный труд „Францыск Скарына і яго час".[4] В статье о скорининских наименованиях С. В. Кузьмин приводит только 14 фактов увековечения. Одновременно он упоминает и о 4 фактах утери имени Ф. Скорины.

В рецензии на последнее издание нами указано на неполноту представленных сведений об увековечении Ф. Скорины. В частности, обращалось внимание на то, что его имя носит типография в Полоцке и одна из улиц в Вильнюсе.[5] Однако при переиздании справочника на русском языке это не было принято во внимание.[6]

Учитывая вышеизложенное, а также появление новых фактов увековечения Ф. Скорины в связи с его 500-летним юбилеем возникла необходимость дополнительного изучения этой важной проблемы с охватом не только Республики Беларусь, но и стран ближнего и дальнего зарубежья. С этой целью нами проведены специальные исследования по более полному выявлению, учету и систематизации фактов увековечения имени Ф. Скорины. Полученные результаты показали, что оно увековечено неоднократно, разными способами и во многих местах (см. таблицу).

Как было установлено, первые попытки увековечивания имени Ф. Скорины в Белоруссии были связаны с подготовкой к празднованию 400-летия начала его издательской деятельности. В 1913–1915 гг. группой деятелей(И. И. Луцкевич, Р. А. Земкевич и др.), объединявшихся вокруг газеты „Наша ніва",предпринимались меры по основанию в Вильно Белорусского научного общества имени Ф. Скорины. В 1915 г. были даже выпущены две рекламные открытки, на которых приводилось название общества с добавлением имени Ф. Скорины. Однако начавшаяся война, видимо, помешала ему развернуть активную деятельность.

В 1917 г., когда отмечался юбилей, на страницах белорусских газет в Минске и Вильно высказывались предложения об увековечении имени Ф. Скорины. В частности, предлагалось создать Белорусскую историческую библиотеку его имени.[7] Возобновились попытки оживить работу научного общества имени Ф. Скорины в Вильно, о чем свидетельствуют недавно обнаруженные А. К. Кавко материалы[8]. Правда, при издании в 1925 г. книги А. В. Станкевича „Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі" на обложке было лишь указано, что спонсором является Белорусское научное общество, но без добавления к названию имени Ф. Скорины.

Когда в 1925–1926 гг. в Белоруссии праздновалось 400-летие белорусского книгопечатания, именем Ф. Скорины по сообщениям печати названы улица и школа в Полоцке,[9] библиотека и изба-читальня на Могилевщине[10]. Но тогда, в условиях начавшейся борьбы с „национализмом", эти наименования долго не смогли продержаться. Да и само имя Ф. Скорины, названного „средневековым монахом", стало чуть ли не запретным.

За рубежом сохранению памяти о Ф. Скорине способствовала белорусская эмиграция. В 20-е годы в столице Чехословакии Праге

активно действовало Белорусское культурное общество имени Ф. Скорины, издававшее журнал „Іскры Скарыны" [11]. В Западной Белоруссии, входившей в состав Польши, Имя Ф. Скорины носила в 1922–1928 гг. белорусская гимназия, располагавшаяся в Радошковичах [12]. В Вильно в 20–30-е годы действовала белорусская типография имени Ф. Скорины[13].

В послевоенный период среди белорусов-эмигрантов существовали общественные организации, носившие имя Ф. Скорины. В Аргентине одна из 16 белорусских групп, до объединения их в Славянский союз, называлась „Георгій Скарына"[14]. В США под именем Ф. Скорины успешно действовали Кривичское (Белорусское) научное общество и типографско-издательское объединение[15].

Наиболее значительная работа по популяризации и увековечению имени Ф. Скорины осуществлена в 1967 и 1990 гг., когда отмечались 450-летие белорусского книгопечатания и 500-летие со дня рождения первопечатника. В ходе проведения юбилейных мероприятий в Республике Беларусь и за рубежом появилось ряд новых улиц, учреждений и других объектов, названных именем Ф. Скорины.

Все выявленные нами факты увековечения имени Ф. Скорины внесены в специальную картотеку. Как видно из представленных в таблице обобщенных данных, имя Ф. Скорины было присвоено 39 объектам, в том числе в Республике Беларусь 28, в странах ближнего и дальнего зарубежья – 11. Не все они сохранили его в своих названиях, чаще всего из-за прекращения существования, реорганизации и пр.

В настоящее время память о Ф. Скорине лучше всего чтят на родине. Его имя носят в Полоцке: педагогическое училище, типография, библиотека, улица, площадь, парк; в Минске: национальный культурно-просветительный центр, товарищество белорусского языка, типография, магазин, проспект, улица, переулок. Имеются единичные случаи увековечения имени Ф. Скорины и в других государствах: Литовской Республике (улица в Вильнюсе), Российской федерации (общество белорусской культуры в Москве с 1989 г.) Англии (библиотека-музей в Лондоне с 1971 г.).

Подытоживая вышеизложенное, можно сделать вывод, что имя Ф. Скорины надежно защищено от забвения, особенно в Республике Беларусь. Между тем, не может не обратить на себя внимание то, что оно пока не присвоено ни одному медицинскому учреждению. Ученый совет Гродненского медицинского института дважды обращался к властям бывшей БССР с просьбой удостоить чести носить имя Ф. Скорины. Но ни в год 475-летия, ни в год 500-летия со дня рождения добиться этого не удалось. Продолжение ходатайств, по-видимому, утрачивает смысл, поскольку с 1988 г. имя Ф. Скорины уже носит Гомельский университет. Более

оправданным было бы присвоение имени первого белорусского доктора медицины и книгоиздателя Республиканской научной медицинской библиотеке в Минске.

Страны	Объекты	Присвоено имя	Носят имя
Республика Беларусь	улицы	12	10
	учреждения	12	8
	общественные организации	1	1
	дипломы	1	1
	медали	2	2
Ближнее зарубежье	улицы	1	1
	учреждения	2	–
	общественные организации	3	1
Дальнее зарубежье	учреждения	1	1
	общественные организации	4	–
ВСЕГО		39	25

---

[1] Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск: Выд-ва БелСЭ, 1973. – Т, 9. – С. 551.

[2] Госархив Гродненской области, ф. 260. Указатель увековеченных имен медицинских работников СССР. – Гродно, 1980. – С. 275.

[3] Их именами названы... – Минск: Изд-во БелСЭ, 1987. – С. 553.

[4] Ф. Скарына і яго час. – Мінск: Выд-ва БелСЭ, 1988. – С. 500.

[5] Игнатович Ф. И. Скорина и его время: рецензия // Здравоохранение Белоруссии. – 1989. – № 11. – С. 72.

[6] Ф. Скорина и его время. – Минск: Изд-во БелСЭ, 1990. – С. 506–507.

[7] Вольная Беларусь. – 1917. – 8 жніўня.

[8] Каўка А. Тут мой народ. – Мінск: Маст. літ-ра, 1989. – С. 217.

[9] Скарынінскі юбілей у Радавай Беларусі // Беларуская доля. – 1925. – 1 красавіка. – С. 4.

[10] Святкаванне 400-годдзя друку на Беларусі.//Сав. Беларусь. – 1926. – 14 студзеня. – С. 7.

[11] Сачанка Б. Сняцца сны аб Беларусі. – Мінск: Маст. літ-ра, 1990. – С. 33.

[12] Ніжанкоўская В. А. Водгук на анкету // Скарыніч. – Мінск: Маст. літ-ра, 1991. – Вып. 1. – С. 63.

[13] Багдановіч Я. На жыццёвым шляху. – Мінск: Маст. літ-ра, 1992. – с. 86.

[14] Дрозд С. Агледзіны былога // Літаратура і мастацтва. – 1993. – 3–9 ліпеня. – С. 6.

[15] Кіпель В. Беларусы ў ЗША. – Менск: Беларусь, 1993. – С. 189, 198.

Доктор медицины Ф. Скорина и медицина средневековья Беларуси в экспозиции республиканского музея истории медицины Беларуси

И. В. Пантюк, Т. П. Разуменко,
г. Минск.

Республиканский музей истории медицины Беларуси организован в мае 1990 года на базе музейной группы при кафедре социальной гигиены и организации здравоохранения Минского медицинского института, основанной в 1957 г, профессором Г. Р. Крючком. Под его руководством была создана и долгое время существовала экспозиция, посвященная медицине Белоруссии в начале XX в., в годы гражданской войны и иностранной интервенции, отражала развитие медицины в республике в довоенные годы.

В настоящее время фонды музея содержат около 25 тыс. экспонатов. Среди них подлинные дореволюционные и довоенные фотографии, дипломы, аттестаты, диссертации, медицинские инструменты, аптечная посуда, журналы, книги XУIII – начала XX в.

На працягу ХУІІ–ХУІІІ ст. уніяцкія прыходы былі створаны ў Лідзе і вёсках Ганчары, Глыбокае, Голдава, Дзікушкі, Дакудава, Жыжма, Лебяда, Збляны, Малое Мажэйкава, Мыта, Орля, Астрына, Радзівонічы (сучасныя Радзівонішкі), Ракаўцы, Сабакінцы (сучасная Першамайская), Турэйск, Васкевічы, Бабры[10] (гл. карту № 2). Паводле „Ведамасці аб грэка-уніяцкіх цэрквах і манастырах Брэсцкай епархіі" за 1827 г., у Лідскім уездзе было 18 уніяцкіх цэркваў і адзін манастыр, якія мелі 22.496 прыхаджан[11]. Згодна з данымі 1838 г., Ганчарскую царкву наведвалі 1230 вернікаў-уніятаў, да Глыбоцкай было прыпісана 1872 чалавекі, да Голдаўскай – 1047, Дзікушскай – 614, Дакудаўскай – 922, Жыжмянскай – 725, Лябёдскай – 812, Зблянскай – 1135, Маламажэйкаўскай – 497, Мытлянскай – 272, Арлянскай – 1400, Астрынскай – 3327, Ракавіцкай – 630, Сабакінскай – 1379, Турэйскай – 947, Баброўскай – 417, Дэмбраўскай – 853[12]. Грэка-уніяцкаму духавенству быў перададзены кармеліцкі манастыр у Лідзе пасля яго скасавання ў 1832 г.[13]

Архівы і дакументальныя публікацыі захавалі крыніцы аб некаторых баках дзейнасці мясцовых уніяцкіх прыходаў і духавенства, іх зямельныя спрэчкі, фінансавыя пытанні, кадравыя справы, захады на ніве адукацыі, клопаты пра аздабленне храмаў: аб

пропусках набажэнства радзівоніцкім святаром з-за п'янства ў 1725 г.[14] і неіспраўнай службе прасвітара гэтай жа царквы Івана Герасімавіча, які ў 1748 г. таксама зрываў набажэнствы[15]; аб незаконным збіранні падаткаў у павялічаных памерах лідскім дэканам Бялькевічам (1787 г.)[16]; аб забойстве святара Мытлянскай царквы Багдана Варацінскага ў 1671 г.[17]; аб абвінавачванні жыжмянскага адміністратара ў „неблагоповедении" (1780 г.)[18]; захавалася завяшчанне лідскага земяніна Сільвестра Войны Аранскага пахаваць яго ў Жыжмянскай царкве (1667 г.)[19], вопіс каштоўнасцей Лябёдскай царквы[20].

Адна з крыніц расказвае, што ў 1753 г. уніяцкія дэканы навагрудскай кангрэгацыі заявілі аб патрэбе адкрыць школы для навучання капланскіх дзяцей. Была прынята пастанова мець у кожным дэканаце па адной школе, у якой бы сыны святароў ва ўзросце ад 7 да 10 гадоў, за кошт бацькоў, тры гады вучыліся чытаць" па руска-славянску" (відаць, на беларускай і царкоўнаславянскай мовах) псалтыры, актоіхі і ірмалогіі, навучаліся бы царкоўным спевам і парадку набажэнства. У лідскім дэканаце такая школа стваралася ў Орлі, адказнасць за пытанні адукацыі неслі святары з вёсак Васкевічы, Збляны, Жыжма[21]. Калі б хто з духавенства не пажадаў аддаць свайго сына ў школу, то падвяргаўся штрафу на працягу трох год па 3 талеры штогод. Гэты штраф паступаў на выхаванне ў школе бедных дзяцей.

У адпаведнасці з данымі Яна Курчэўскага, якія ён прыводзіць у сваёй кнізе „Biskupstwo Wilenskie", у канцы XVIII – пачатку XIX ст. у Лідскім дэканаце існавалі школы каталіцкай і ўніяцкай цэркваў у наступных населеных пунктах: Белагруда, Дылеў, Васілішкі, Ішчолна, Беліца, Ласк (Лацк), Новы Двор, Забалоцце, Восаў (Осаў), Елна, Жалудок, Ражанка, Шчучын, Ятвеск, Каменка, Дэмбраў, Жырмуны, Нецеч.

Найбольшая колькасць вядомых нам дакументаў апавядаюць пра апошнія гады існавання уніяцтва на Лідчыне. Рэформа уніяцкай царквы з мэтай збліжэння яе з праваслаўнай, якая праводзілася самім вышэйшым уніяцкім духавенствам ва ўгоду рускаму царызму, перарасла ў 30-ыя гады XIX ст. у працэс абмежавання сферы ўплыву уніяцтва і ў рэшце рэшт у яго ліквідацыю. На тэрыторыі Гродзенскай губерніі гэты працэс праходзіў пад пільным наглядам і націскам з боку мясцовых улад.

У 1834 г. пачалося ўсталяванне праваслаўных Іканастасаў ва уніяцкіх храмах Лідскага уезда. Унутранаму пераабсталяванню першай падверглася Голдаўская царква, за ёй Ракавіцкая, Астрынская. Арлянская, Сабакінская, Ганчарская і Лябёдская ж аказаліся настолькі беднымі, што былі няздольны за ўласны кошт запрасіць сталяроў і мастакоў. Радзівонішская царква знаходзілася ў такім дрэнным стане, што яе наогул было вырашана зні-

шчыць. Святар і вернікі з Дакудава, відаць, аказалі супраціўленне зменам у інтэр'еры свайго храма, так што, як даносіла афіцыйная асоба, „употребляется деятельнейшее настаивание" аб усталяванні тут Іканастаса[22].

30 снежня 1835 г. гродзенскі губернатар Копцеў загадаў убраць з грэка-уніяцкіх цэркваў усе рэчы, неўласцівыя ўсходняй абраднасці і перанятыя з каталіцтва: арганы , лаўкі, званочкі. На выкананне загада адводзілася 5 месяцаў. 27 сакавіка 1836 г. Лідскі земскі спраўнік палкоўнік фон Берг інфармаваў губернатара, што такая работа ў Лідскім уездзе ўжо распачата і дае абяцанне прасачыць, каб яна была выканана ва ўсёй дакладнасці.

Згодна з распараджэннем грэка-уніяцкай кансісторыі, у трохмесячны тэрмін павінны быць прададзены арганы, а калі не знойдуцца пакупнікі, іх прадпісвалася разабраць. Арганісты перавадзіліся на іншыя духоўныя пасады. Арганы тады меліся ў Баброўскай, Голдаўскай, Сабакінскай і Маламажэйкаўскай цэрквах. Лідскі спраўнік адным з першых зрабіў справаздачу, што арганы знішчаны, лаўкі вынесены, іншыя рэчы ліквідаваны[23]

У 30-ыя гады XIX ст. пачалася перадача уніяцкіх храмаў праваслаўнай царкве, якая завяршылася ў Лідскім уездзе пасля Полацкага сабора 1839 года. Гісторык Баліньскі адзначае, што ў другой палове XIX ст. тут была 31 праваслаўная царква з 16280 вернікамі (католікаў тады ва уездзе налічвалася 41668 чалавек). Праваслаўныя парафіі існавалі ў Лідзе, Беліцы, Ганчарах, Бабрах, Голдаве, Дакудаве, Зблянах, Жыжме, Лебядзе, Мыце, Малым Мажэйкаве, Радзівонішках[24] (гл. карту № 3).

Параўнанне карт 1, 2, 3, складзеных на аснове аналіза крыніц, дазваляе зрабіць наступныя вывады. 1. Гістарычна склалася, што на поўначы Лідскага раёна, там, дзе пераважала каталіцкае насельніцтва, уніяцкіх прыходаў, за выключэннем Ліды, не было. 2. Уніяцтва атрымала распаўсюджанне на традыцыйнай тэрыторыі праваслаўя (па рацэ Нёман, акрамя крайняга поўдня раёна, і ад вёскі Збляны да сярэдняга цячэння рэк Лебяда і Дзітва[25]). 3. Пасля скасавання уніі праваслаўныя парафіі былі створаны (ці адноўлены) там, дзе ў XVII – пачатку XIX ст. існавалі уніяцкія храмы. Карты 2, 3, накладзеныя адна на адну, поўнасцю супадаюць.

У рукапісным аддзеле Навуковай бібліятэкі Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта намі выяўлены цікавы, але, на жаль, недатаваны дакумент, які, па нашым назіранням, можна аднесці да 20–30-х гадоў XX ст. Гэта спіс цэркваў Віленскай архідыяцэзіі, якія падлягалі вяртанню на унію. Сярод іх цэрквы ў Бабрах, Дзікушках, Глыбокім, Ганчарах, Мыце, Наўгародавічах, Орлі, Радзівонішках, Ракавічах і Сабакінцах Лідскага павету і ў Лебядзе Шчучынскага павету[26]. Паўтарыць гісторыю не ўдалося.

[1] Slownik geograficzny Krolestwa Polskiego i innych krajow slowianskich. G. 5 Warszawa, 1884. S. 216.

[2] Францыск Скарына. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1988. С. 358.

[3] Hlebowicz A. Dekanat Lidzki //Zemia Lidzka. 1992. Kwiecien. N7. S. 11; Slownik geograficzny... G. 5. S. 217.

[4] Гаучас П. К вопросу о восточной и южной границах литовской этнической территории в средневековье // Балто-славянские исследования. 1986. М., 1988. С. 202.

[5] Slownik geograficzny... G.5. S. 216.

[6] Мартос А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Мн., 1990. С. 76.

[7] Акты, издаваемые Виленскою археологическою комиссией (далей – АВАК). Т. 12. Вильна, 1883. С. 520.

[8] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 1. Спб., 1897. С. 227-228.

[9] Цэнтральны дзяржаўны архіў старажытных актаў, г. Масква. Ф. 124, 1658 год, спр. 1, л. 30.

[10] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 2. Птг., 1907. С. 863, 1230, 1497.

[11] Дзяржаўны гістарычны архіў Расіі, г. Санкт-Пецярбург. Ф. 824, воп. 1, спр. 78, л. 43-63 зв.

[12] Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў, г. Гродна. Ф. 1, воп. 19, спр. 1752. Л. 5 зв.–9.

[13] Там жа. Спр. 239, л. 44 зв.

[14] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов . Т. 2. С.55.

[15] Там жа. С. 124.

[16] Там жа. С. 461.

[17] Там жа. С. 283.

[18] Там жа. С. 388.

[19] АВАК. Т. 12 С. 592–593.

[20] Описание документов архива западнорусских униатских митрополитов. Т. 2. С. 68.

[21] Там жа. С. 153.

[22] Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў, г. Гродна. Ф. 1., воп. 19, спр. 1004, л. 3.

[23] Там жа. Спр. 1005.


[24] Slownik geograficzny. G. 5. S. 217.


25 Гаучас П. К вопросу о восточной и южной границах литовской этнической территории в средневековье... С. 201-202.


[26] Рукапісны аддзел Навуковай бібліятэкі Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта. Ф. 264, спр. 1365, л. 1.

карта № I

КАТАЛІЦКІЯ КАСЦЁЛЫ НА ЛІДЧЫНЕ




карта № 2
УНІЯЦКІЯ ЦЭРКВЫ
ЛІДСКАГА УЕЗДА
У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ
ХУШ СТ.
ЖЫЖМА
ЛІДА
МЫТА
САВАКІНЦЫ
ДАКУДАВА
РАДЗІВОНІШКІ
ГАНЧАРЫ
АСТРЫНА
ЛЕБЯДА
МАЛОЕ МАЖЭЙКАВА
БАБРЫ
ГОЛДАВА
ДЗІКУШКІ
ЗБЛЯНЫ
сучасная граніца
Лідскага раёна
РАКАВІЧЫ
ОРЛЯ


карта № 3
ПРАВАСЛАЎНЫЯ ПРЫХОДЫ
У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ
XIX СТ.
ЖЫЖМА
ЛІДА
МЫТА
ДАКУДАВА
РАДЗІВОНІШКІ
ГАНЧАРЫ
ЛЕБЯДА
МАЛОЕ МАЖЭЙКАВА
БАБРЫ
ГОЛДАВА
БЕЛІЦА
ЗБЛЯНЫ
сучасная граніца
Лідскага раёна

Саслоўна-групавы склад сялянства Лідскага павета ў першай палове XIX ст.

У. А. Сосна
г. Мінск

У нашых краязнаўчых нарысах і працах, прысвечаных мінуламу Лідскага краю, ды і іншых беларускіх мясцін, адносна сялян да адмены прыгоннага права звычайна агулам канстатуецца, што яны былі ва ўладзе паноў і прыводзяцца для ілюстрацыі асобныя звесткі аб іх павіннасцях, аўтаматычна распаўсюджваючы гэта на ўсю масу дарэформеннага сялянства. Між тым, у сапраўднасці сяляне дзяліліся на цэлы шэраг разрадаў і груп, як па прыналежнасці асобным катэгорыям уладальнікаў, так і паводле асаблівасцяў уласнага юрыдычнага стану. Усё гэта надавала вёсцы кожнага рэгіёну адметны сацыяльна-саслоўны каларыт, абумоўлівала характар паводзін сялян у розных сітуацыях, было прадметам асобых клопатаў царскага ўрада і памешчыкаў.

Колькасць і ўдзельная вага катэгорый сялянства сярод насельніцтва Лідскага павета ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.

Катэгорыі сялян	V рэвізія (1796 г.)[1]		IX рэвізія (1850 г.)[2]	
	душ муж. полу	%	душ муж. полу	%
Памешчыцкія	22815	54,3	29674	53,7
Дзяржаўныя	5065	12,1	13106	23,7
Духоўныя	2101	5,0	63	0,1
Паезуіцкія	655	1,6	—	—
Ленныя	—	—	33	0,1
«Вольныя» людзі	2972	7,1	217	0,4
Аднадворцы	—	—	2569	4,7
Разам сялян	33608	80,0	45662	82,6
Усяго насельніцтва	42033	100,0	55272	100,0

Аб шматсаслоўнасці сялянства Лідскага павета, які да 1843 г. уваходзіў у склад Гродзенскай, а пасля – Віленскай губерняў, сведчаць даныя рэвізій, паводле якіх складалі перапіс падатковага насельніцтва, што абавязана было плаціць падушны падатак і адбываць рэкруцкую павіннасць. Для таго, каб прагледзець эвалюцыю асноўных сялянскіх саслоўяў на Лідчыне, возьмем даныя крайніх па храналогіі рэвізій: пятай, якая праводзілася адразу пасля ўключэння Заходняй Беларусі у склад Расійскай Імперыі, і дзевятай – у сярэдзіне XIX ст. (гл. табліцу)

Памешчыцкія (панскія) сяляне з'яўляліся самай шматлікай і найбольш бяспраўнай часткай сельскага насельніцтва. Іх асоба, праца, маёмасць – усё належала ўладальнікам, якія самі ці пры дапамозе арандатараў і аканомаў чынілі над імі суд і расправу. Прыгонных прадавалі і закладвалі, дарылі і абменьвалі на любую рэч, ссылалі без суда на катаргу, білі розгамі. Самавольства памешчыкаў практычна нічым не абмяжоўвалася, так як сялянам забаранялася падаваць на іх скаргі царскай адміністрацыі. Асноўным абавязкам прыгонных было выкананне на карысць памешчыка розных павіннасцяў, замацаваных у інвентарах, якія складаліся і рэгулярна пераглядаліся самімі ўладальнікамі. Акрамя таго, на плечы сялян клаліся дзяржаўныя падаткі, рэкруцтва і розныя грамадскія работы. Спроба дзяржавы рэгуляваць інвентары ў 40–50-х гг. не прынесла істотнай палёгкі сялянам, бо фактычна замацоўвала той узровень павіннасных адносін іх з памешчыкамі, які склаўся да сярэдзіны XIX ст. Некаторае змяншэнне ўдзельнай вагі памешчыцкіх сялян на Лідчыне можна тлумачыць канфіскацыямі маёнткаў удзельнікаў шляхецкага паўстання 1830–1831 гг.: паводле VIII рэвізіі (1834 г.) у Лідскім павеце лічыліся 1424 душы мужчынскага полу канфіскаваных сялян[3]. Яшчэ раней канфіскаваліся больш 60 маёнткаў (каля 10,5 тыс. душ) у асоб, якія супрацоўнічалі з французскімі ўладамі ў 1812 г.[4], але Аляксандр 1 хутка дараваў шляхце „прошедшие заблуждения".

Другім па значэнні разрадам сельскага насельніцтва з'яўляліся дзяржаўныя (казённыя) сяляне. Аснову іх складалі прыгонныя былых каралеўскіх старостваў, так званыя старосцінскія, тыя з іх, якія пазбеглі падараванняў расійскім памешчыкам. Паводле звестак на 1798 г., казённымі ў Лідскім павеце лічыліся староствы Барцянскае, Цыборскае, Эйшынскае, Рубіцкае, Радунскае, Васіжышскае, Качаўскае, Лідскае, Новадворскае, Астрынскае, Тусаманскае, дзяржавы – (невялікія маёнткі, ці часткі іх, якія знаходзіліся ў трыманні розных асоб) Бакшты і Філіпаўцы, Баблошышкі і Аздзеркі, Кержышкі, Пугачы і Міляцічы, Цемаўцы, Горня, Грынкішкі, Канюхі, Кульбаны, Лядныш, лясніцтва Каняўскае[5]. На працягу канца XVIII – першай трэці XIX ст. казённае саслоўе ўключыла ў свой склад нямала сялян, якія тымі ці іншымі

шляхамі выйшлі з-пад улады вотчыннікаў. Гэта епіскапскія (былых сталовых маёнткаў віленскага каталіцкага епіскапа; ключ Дамбровенскі і фальварак Любор – 591 і 170 душ м. п.[6]), паманастырскія (пасля скасавання ў 1832 г. „малалюдных" каталіцкіх кляштараў; маёнткі Шайбакполь, Старадворцы, Зарэчча, Крупа, Калеснікі, Сцецэлёўшчына, Ельна, Фалькоўшчына, Шкордзе, Радзевічы, Хільчыцы – усяго 676 душ м. п.[7]), канфіскаваныя (ва ўдзельнікаў паўстання 1830 – 1831 гг.; усяго 8 маёнткаў і 1573 душы м. п.[8]) і да т. п. У 1837 г. на тэрыторыі Лідскага павета знаходзілася 49 дзяржаўных маёнткаў і 12938 сялян (душ м. п.)[9].

Ажыццяўленне гаспадарчых, адміністрацыйных і судовых правоў над дзяржаўнымі сялянамі аддавалася арандатарам і адміністратарам казённых маёнткаў. Фармальна аб'ём паншчынных работ і плацяжоў вызначаўся на аснове інвентароў, што зацвярджаліся губернскай казённай палатай, але парушэнні гэтых інвентароў часовымі ўладальнікамі, іх злоўжыванні на сваю карысць былі звычайнай з'явай . Існавала практыка перадачы арандатарамі казённых маёнткаў у карыстанне іншым асобам, так званая субарэнда, у якой, паводле звестак на 1806 г., знаходзіліся 4092 мужчынскага і 3852 жаночага полу душ у 7 маёнтках Лідскага павета, прычым без зацвярджэння і ведама казённай палаты[10]. У выніку, эканамічнае і прававое становішча належачых казне сялян да 40-х гг. XIX ст. практычна не адрознівалася ад становішча памешчыцкіх прыгонных. Толькі дзякуючы рэформе, якую правёў міністр дзяржаўных маёмасцей граф Кісялёў, была ліквідавана арэндная сістэма эксплуатацыі, значна зменшаны павіннасці сялян, а самі яны пераведзены з паншчыны на грашовы аброк. Адсюль з'явіўся стымул для прыватнаўласніцкіх сялян стаць казённымі, чаго, напрыклад, дабіваліся, двойчы звяртаючыся аб сваім старосцінскім паходжанні да цара Аляксандра II, сяляне вёскі Кульбакі, паколькі лічылі далей немагчымым жыць ва ўладзе памешчыка Падгурскага[11]. У 40-х гадах збег ад памешчыка Вільканца ў суседні Гродзенскі павет да казённых сялян маёнтка Ротніца селянін Конюх. Яго добра прынялі і нават жорстка збілі тых, каго паслалі вярнуць уцёкача[12].

Буйнейшым уласнікам зямлі і прыгонных з'яўлялася царква, перш за ўсё каталіцкая. У Гродзенскай губерні ёй належала ў тры разы больш сялян, чым ўсім астатнім канфесіям. У Расійскай імперыі царскі ўрад правёў секулярызацыю царкоўных маёнткаў яшчэ ў 60-х гг. XVIII ст. На новадалучаных тэрыторыях ён з гэтай справай не спяшаўся, бо не хацеў псаваць адносіны з уплывовым царкоўным клірам, канчаткова тут не замацаваўшыся. На Лідчыне спачатку ўзялі ў казну толькі епіскапскія маёнткі ў сувязі са смерцю ад рук касцюшкаўскіх паўстанцаў віленскага епіскапа Масальскага. Далей, як ўжо пісалася, прыйшла чарга да нека-

торых манастырскіх уладанняў, а ў першай палове 40-х гг., пасля распаўсюджання на заходнія губерні агульнаімперскага заканадаўства, шэрагам царскіх указаў перадаваліся ў казну ўсе астатнія царкоўныя маёнткі і сяляне. Паводле даных на 1842 г., секулярызацыі падлягалі 36 маёнткаў, а ў іх 46 вольных і 1452 прыгонных душ м. п. сялян у Лідскім павеце[13].

Пэўная колькасць сялян знаходзілася ва „умоўным уладанні". Гэта так званыя ленныя (раздадзеныя сеймам Рэчы Паспалітай у непадзельную спадчынную ўласнасць да спынення мужчынскай лініі) і паезуіцкія (пасля ліквідацыі у 1773 г. у Рэчы Паспалітай ордэна езуітаў прададзены шляхце пры ўмове ўплаты вызначаных працэнтаў). Такога роду маёнткі знаходзіліся толькі пад „наглядам урада", а кіраваліся як вотчынныя; у перспектыве большасць з іх зліліся з памешчыцкімі.

Акрамя асноўных груп прыватнаўласніцкага і дзяржаўнага сялянства, у беларускай вёсцы існавалі адносна нешматлікія катэгорыі непрыгоннага ці паўсвабоднага насельніцтва. Першае месца сярод іх займалі „вольныя" людзі – асабіста свабоднае насельніцтва Вялікага княства Літоўскага, вядомае яшчэ з XVI ст. Яно папаўнялася пераважна беглымі прыгоннымі, ваенна-служылым людам, замежнымі выхадцамі і г. д. Нямногія з „вольных" людзей мелі ўласную зямлю, асноўная маса карысталася ўчасткамі паводле дагавораў з землеўласнікамі, за што ўносіла чынш, радзей – адбывала паншчынную павіннасць, плаціла значны большы, чым прыгонныя, дзяржаўны падатак. Пры патуранні мясцовых улад і ўрада, памешчыкі выкарысталі ўсе легальныя і нелегальныя спосабы для ператварэння „вольных" сялян у сваіх прыгонных. Так, „вольны" чалавек Ян Дычка неаднаразова скардзіўся віленскаму генерал-губернатару на шляхцянку Ленскую і яе аканома Навіцкага „за рабаванне каня, быдла, усёй гаспадарчай маёмасці, прыгнёт паншчынай па 10 дзён у тыдзень і забранне розных дакументаў, пацвярджаючых вольнасць". Тры гады (1822–1825) цягнулася гэтая справа ў Лідскім павятовым, а пасля Гродзенскім галоўным судзе, паколькі памешчыца Ленская ўсяляк перашкаджала яе справядліваму вырашэнню. І ўсё ж, дзякуючы настойлівасці Яна Дычкі, ён вырваўся з-пад запрыгоньвання[14]. Але гэта было шчаслівым выключэннем, у асноўным колькасць „вольных" людзей рэзка скарачалася. Тых з іх, хто пражываў на казённых землях, ці меў уласныя, указамі 1840 і 1847 гг. залічылі ў склад дзяржаўных сялян.

Катэгорыю аднадворцаў заходніх губерняў стварылі царскія ўлады на падставе ўказа 19 кастрычніка 1831 г. „Аб разборы шляхты ў Заходніх губернях і аб упарадкоўванні гэтага роду людзей". Лідскі павет далёка апярэджваў усе іншыя паветы Гродзенскай губерні па колькасці шляхты (на 1802 г. – 5056 мужчын-

скага і 4753 жаночага полу), відаць таму, што знаходзіўся найбліжэй да г. Вільні – сталіцы былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства (для параўнання: Гродзенскі павет – адпаведна 3248 і 3136, Пружанскі – 801 і 764)[15]. Беспамесная шляхта з'яўлялася асяродкам буржуазных сацыяльных рухаў і нацыянальнай барацьбы, таму царскі ўрад пасля паўстання 1830–1831 г.г. ажыццяўляў перавод яе ў падатковае саслоўе аднадворцаў, якіх, ў сваю чаргу, на аснове законаў 1841 і 1857 гг. зліваў з дзяржаўнымі сялянамі і „вольнымі" людзьмі (на памешчыцкіх землях).

Хаця агульная колькасць сялян у павеце за першую палову XIX ст. узрасла больш чым на 12 тысяч душ м. п., але ўдзельная вага іх сярод усяго насельніцтва заставалася практычна нязменнай (каля 80%). Затое ўнутры ажыццяўляўся працэс нівеліроўкі і аб'яднання сялянскіх катэгорый у напрамку захавання толькі двух асноўных груп: дзяржаўных і памешчыцкіх, дзякуючы чаму колькасць і ўдзельная вага першых выросла ў 2 разы.

---

[1] Zytkowicz L. Rzady Repnina na Litwie w Latach 1794-7. Wilno, 1938. S. 398-401.
[2] РДДу С.-Пецярбургу. Ф. 571, воп. 9, спр. 53, арк. 24–29.
[3] Тамсама, спр. 36, арк. 68-69.
[4] ДГА Літоўскай Рэспублікі. Ф. 378, 1813 г., спр. 52, ч. 1, арк. 303-321.
[5] РДГА у С.-Пецярбургу. Ф. 1374, воп. 2, спр. 969, арк. 143–177.
[6] ДГА Літоўскай Рэспублікі. Ф. 515, воп. 22, спр. 54, арк. 6–7.
[7] РДГА у С.-Пецярбургу. Ф. 384, воп. 1, спр. 7, арк. 25–28.
[8] ДГА Літоўскай Рэспублікі. Ф. 378, 1830 г., спр. 592, арк. 328.
[9] РДГА у С.-Пецярбургу. Ф. 379, воп. 3, спр. 2043, арк. 15–16.
[10] ЦДГА РБ у Гродне. Ф. 24, воп. 6, спр. 4, арк. 15–17.
[11] Крестьянское движение в России в 1857 – мае 1861 г. М., 1963. С. 259–261, 538.
[12] ЦДГА РБ у Гродне. Ф. 1, воп. 13, спр. 5, арк 1–3.
[13] ДГА Літоўскай Рэспублікі. Ф. 378, 1842 г., спр. 1336, арк. 184–192.
[14] ЦДГА РБ у Гродне. Ф. 1, воп. 2, спр. 473, арк. 1–13.
[15] ДГА Літоўскай Рэспублікі. Ф. 378, 1802 г., спр. 145, арк. 29.
[16] ЦДГА РБ у Гродне. Ф. 1, воп. 2, спр. 1753.

Лідскія шляхі Ігната Дамейкі

М. І. БУЛАЙ
г. Ліда.

Час няўмольна аддаляе нас ад тых далёкіх падзей, з якімі звязалі свой лёс лепшыя людзі нашай айчыны. На вялікі жаль, за смугою часу, нават тыя, лёс чыіх дзядоў і прадзядаў быў цесна звязаны з жыццём слаўных сыноў народа, не заўсёды памятаюць

заслугі такіх людзей перад чалавецтвам. І сёння, наўрад ці хто з жыхароў невялічкай вёскі Дамэйкі, што размясцілася непадалёку ад горада Ліды, зможа расказаць, чаму яго вёска носіць такую назву.

Менавіта, з назвай гэтай невялікай вёсачкі звязана жыццё і дзейнасць вядомага ва ўсім свеце вучонага, Ігната Іпалітавіча Дамэйкі. Яго юнацкае жыццё і пачатак працоўнай дзейнасці звязаны з Лідчынай. Але лепш усё па парадку.

Нарадзіўся Ігнат Дамэйка ў ліпені 1802 года ў вёсцы В. Мядзвядка, што знаходзіцца ў 10 кіламетрах ад пасёлка Мір Навагрудскага павета (цяпер Карэліцкі раён), у заможнай шляхецкай сям'і. У Дамэйкаў, акрамя Ігната, было яшчэ два сыны і дзве дачкі. Усе дзеці атрымалі выхаванне і першапачатковую адукацыю пад наглядам адукаваных настаўнікаў-гувернёраў, у атмасферы павагі да простых людзей, цягу да ведаў і кнігі, патрыятызму, глыбокай рэлігійнай перакананасці. Усе яны, яшчэ да паступлення ў школу, размаўлялі не толькі на беларускай і польскай мовах, але і на некаторых заходнееўрапейскіх.

Пасля смерці бацькі, калі Ігнату ледзь споўнілася сем гадоў, хлопчыка ўзяў да сябе на выхаванне ягоны дзядзька Ігнат, якому належалі маёнтак Жабуртоўшчына на Дзятлаўшчыне і апека над памесцем Заполле непадалёку ад Ліды. Тут і быў некаторы час маленькі Ігнат. У дзесяцігадовым узросце, у 1812 годзе, юнак паступае ў школу манахаў-піяраў у Шчучыне, якую скончыў у 1816 годзе. Здольнасці да навукі ў Ігната былі бездакорныя, і ён без асаблівых цяжкасцей паступае ў Віленскі ўніверсітэт на факультэт прыродазнаўчых навук, дзе вывучаў біялогію, хімію, матэматыку. У тыя ж гады ва ўніверсітэце вучыліся маладыя паэты Адам Міцкевіч, Томаш Зан, Ян Чачот. У хуткім часе Дамэйка пазнаёміўся з імі і ўступіў у тайнае таварыства філаматаў, якім кіравалі Зан і Чачот. Таварыства было блізкім па духу рускім дзекабрыстам.

Універсітэт закончыў у 1822 годзе. Але не пакінуў яго – піша магістарскую работу, наведвае лекцыі па гісторыі і філасофіі. Дзядзька ўскладвае на яго ўсе абавязкі па самастойнаму кіраўніцтву маёнткам у Заполлі. У 1823 годзе абараняе навуковую работу па матэматыцы і з дыпломам магістра філасофіі пераязджае ў Заполле. Было ў той час у Заполлі хат каля трыццаці і значны зямельны масіў урадлівых зямель і сенажацяў, Ды нядоўга жыў Дамэйка ў Заполлі. У канцы кастрычніка за ўдзел у таварыстве філаматаў яго арыштавалі. Амаль паўгода правёў ён у Віленскім астрозе. Але дзякуючы клопатам дзядзькі, былога вядомага адваката Трыбунала Вялікага княства Літоўскага, маладога Дамэйку вызвалілі з турмы і дазволілі пасяліцца пад

наглядам паліцыі ў Заполлі без права працаваць у дзяржаўных установах і без права выезду за межы Лідскага павета. У Заполлі ён цалкам аддае сябе працы ў сельскай гаспадарцы і любімым кнігам. Пацягнуліся доўгія, нудныя, поўныя адзіноты гады. Ён шмат чытае кніг і часопісаў па жывёлагадоўлі і земляробству. Малады гаспадар займаецца развядзеннем пародзістых кароў, коней, наколькі гэта магчыма, імкнецца аблегчыць долю прыгонных сялян у сваім памесці, арганізуе школу для сялянскіх дзяцей. Бываючы на паляванні, наведвае ў Больценіках Марылю Верашчака (стрыечную сястру), у Жабуртоўшчыне – дзядзьку Ігната, зрэдку бываў у сястры ў вёсцы Далматаўшчына, але не можа наведаць родную маці ў маёнтку Сачыўкі, у Мядзвядцы братоў, магілу бацькі, таму што на выезд у суседні Навагрудскі павет трэба мець дазвол мясцовых улад. А прыніжацца перад жандарамі Дамэйку не дазваляе яго гонар.

Жыццё ў вёсцы не зламала дух патрыятызму І. Дамэйкі. Палітыка нацыянальнага прыгнечання ў заходняй частцы Расійскай імперыі выклікала адпор з боку народаў прыгнечаных украін. Ліпеньская рэвалюцыя 1830 года ў Францыі паскорыла выбух паўстання ў Польшчы, Літве і Беларусі. Ігнат Дамэйка далучыўся да паўстаўшых. Аднак сяляне не падтрымалі гэты рух і паўстанне пацярпела няўдачу. У сувязі з гэтым Дамэйка пакідае родныя мясціны і накіроўваецца у Парыж. Яшчэ ў дарозе ён сустракае А. Міцкевіча. У выгнанні іх сяброўства становіцца больш шчырым і дружалюбным. У Парыжы Дамэйка слухае лекцыі ў Горнай школе, у Сарбонскім універсітэце, займаецца грамадскай і палітычнай дзейнасцю, выступае на мітынгах з прамовай, заклікае суайчыннікаў працягваць барацьбу з царскім самадзяржаўем.

... І вось – Чылі. Гасцінна сустрэлі чылійцы маладога вольнадумца з рэвалюцыйнымі поглядамі, вучонага-славяніна. І згоду паехаць у Чылі Дамэйка даў, напэўна, таму што Чылі ўжо стала незалежнай рэспублікай. Каля двух дзесяткаў навучэнцаў Горнай школы ў Какімба ахвотна сталі дапамагаць Дамэйку будаваць лабараторыю. У краіне пасля іспанскага гаспадарання хутка развіваліся капіталістычныя адносіны ў эканоміцы. У багатай на карысныя выкапні краіне адкрываліся новыя руднікі, шахты, і для работы патрабаваліся кваліфікаваныя спецыялісты. У падрыхтоўцы іх вядучую ролю адыграў наш суайчыннік. Ігнат Дамэйка даследуе Анды, наведвае шахты. З болем і спагадаю назірае за жыццём шахцёраў, якім за мізэрную плату даводзілася працаваць у неймаверна цяжкіх умовах – у ствале шахты вертыкальна ставіліся бярвенні з высечанымі прыступкамі, і на такой вось лесвіцы шахцёру трэба было падымаць на паверхню здабытую руду. Вывучаючы Анды, вучоны адкрыў і апісаў шмат радо-

вішчаў карысных выкапняў. Яму належыць права першаадкрывальніка чылійскай салетры, якая пасля заваявала сусветную вядомасць. У час аднаго з падарожжаў на поўдзень краіны, у Араўканію, тубыльцы якой адмовіліся падпарадкоўвацца іспанскім заваёўнікам, сабраны матэрыял аб прыродзе Араўканіі, яе жыхарах даў магчымасць падарожніку выдаць кнігу „Араўканія і яе жыхары", якая ў 1860 годзе была выдадзена ў Вільні на польскай мове. Сярод дзікай прыроды Ігнат Іпалітавіч у думках вяртаўся на радзіму. Лясы гэтых мясцін нагадвалі яму бары і дубровы Гродзеншчыны.

На ўскраіне Сант'яга Дамэйка пабудаваў сабе дамок. У сціплым кабінеце была напісана большасць навуковых прац. У гэтым доме збіраліся лепшыя людзі Чылі – вучоныя, дзяржаўныя дзеячы, раіліся аб будучым краіны.

На багатыя радовішчы чылійскай салетры прэтэндавалі Балівія і Перу. Паміж Чылі, з аднаго боку, і Балівіяй і Перу, з другога, успыхнула вайна. Чылійцы перамаглі. Дамэйка абурыўся, калі чылійскія генералы даслалі яму трафейнае абсталяванне і бібліятэку з універсітэта ў Ліме. І даслаў ім свой пратэст: „Універсітэт накрадзеных трафеяў не прымае. Прашу не марудзячы забраць рэчы назад". Асудзіў захопніцкую пазіцыю чылійцаў публічна. Прагрэсіўнымі былі яго погляды на адносіны чылійскіх улад да арауканскіх індзейцаў. „Не бачу ніякай неабходнасці, каб дамагацца каланізацыі гэтых зямель, якія належаць не ўраду, а працоўнаму, чэснаму і мужнаму народу". І яшчэ з усёй катэгарычнасцю: „Арауканскія індзейцы не з'яўляюцца дзікунамі. Я лічу іх больш цывілізаванымі.., чым іх прыгранічныя цывілізатары..."

Удзячная чылійская грамадскасць абрала І. Дамэйку рэктарам універсітэта у Сант'яга, а затым тройчы перавыбірала яго на гэтую пасаду. Аўтарытэт нашага земляка ў Чылі быў бездакорны. Ён стварыў праект структуры выкладання дысцыплін у агульнаадукацыйнай і вышэйшай школах. У Сант'яга ўзначаліў работы па водазабеспячэнню горада, увёў метрычную сістэму мер і вагаў, напісаў падручнікі па мінералогіі і фізіцы. Ён патрабаваў ад улад паляпшэння ўмоў працы і жыцця гарнякоў. І ўрад прыслухоўваўся да яго голасу.

Творчая думка і энергія былі невычэрпныя і ён арганізаваў службу метэаралогіі, курсы фізікі і хіміі для моладзі, стварыў мінералагічны і этнаграфічны музеі, хімічную і горную лабараторыі. З яго імем звязана распрацоўка навуковай асновы эксплуатацыі прыродных багацяў Чылі. Вынікі яго даследаванняў выкладзены ў 130 навуковых працах, якія апублікаваны на многіх мовах свету.

Урад краіны ў гонар нашага земляка выпусціў памятны медаль і прызначыў яму самую высокую ў краіне пенсію – 6000 піястраў у год. У рэспубліцы шырока адзначаўся 30-гадовы юбілей

працы „Дона Ігнацыо", як з любоўю называлі яго чылійцы, прысвоена званне „ганаровы чыліец". У гонар вучонага былі выпушчаны спецыяльныя зборнікі, яго імем названа фіялка – „віёла дамейкана", выкапнёвы слімак „науцілус дамэйкус", мінерал дамэйкіт. А на геаграфічнай карце можна убачыць вулканічны горны ланцуг працягласцю каля 1000 км., які названы „Кардыльерай Дамэйкі".

У арэоле славы ў Чылі не забываўся Дамэйка пра радзіму, сваіх сяброў. Не згладзілі уражанняў маладосці ні час, ні адлегласць. З самотаю і пяшчотай згадваў ён у пісьмах да сяброў родныя наднёманскія лясы і пушчы, апавітыя жыццёвымі бедамі берагі Нёмана. Але толькі ў 1884 годзе, незадоўга да смерці, амаль праз паўстагоддзе, падумаўшы, што царскія ўлады ўжо нічога не зробяць яму, сусветна вядомаму вучонаму, Ігнат Іпалітавіч Дамэйка вырашыў наведаць родныя мясціны.

І зноў Еўропа. З вялікай пашанай сустракаюць Дамэйку вучоныя Сарбоны, Кракава, дзе яму прысуджаюць вучоную ступень ганаровага доктара. У Варшаве яго сустракаў апошні з філаматаў паэт Антон Адынец. Разам яны едуць у Беларусь. Але і праз паўстагоддзя не забыліся царскія ўлады пра вольнадумства вучонага і спрабавалі не пусціць Дамэйку на радзіму. Нарэшце, дазвол на паездку атрыман. Мясцовая інтэлігенцыя, сяляне Гродзеншчыны гасцінна і шчыра хлебам і соллю, народнымі песнямі сустракалі сусветна вядомага вучонага – чалавека з легендарнай біяграфіяй. Разам з Антонам Адынцом Дамэйка наведаў Мядзвядку, Мір, Навагрудак, Крошын і іншыя мясціны, дзе прайшло маленства, юнацтва, дзе ён сталеў і набіраўся мужнасці. Даўно ўжо няма блізкіх сяброў, толькі гаі ды лугі Прынямоння ласкава сустракалі свайго сына, як і ў тыя далёкія часы юнацтва.

І вельмі прыемна, што імя вядомага вучонага ўвайшло на старонкі падручніка геаграфіі для 7 класа „Мацерыкі і краіны", захавалася ў назве невялікай вёсачкі на Лідчыне, а ў сярэдзіне лістапада 1993 года выканкам Дзітвянскага сельскага Савета назваў новую вуліцу імем вучонага ў пасёлку Дзітва Лідскага раёна. Аб вядомым чалавеку напамінае і алея, якая выцягнулася роўнай стужкай ад былога памесця Заполле, якая, магчыма, была пасаджана у той час, калі тут жыў Ігнат Дамэйка.

---

1. **Ян Мілер.** Шарэнга вялікіх падарожнікаў. Наша ксенгарня Польша. г. Торунь 1975 г. с. 120–121.
2. **А. Мальдзіс.** Падарожжа ў XIX ст. „Народная асвета" г. Мінск. 1969 г. с. 130–139.
3. **В. Грыцкевіч.** Падарожжы нашых землякоў. г. Мінск, 1968 г. с. 97-121.
4. **Б. Клейн.** Знойдзена ў архіве г. Мінск 1968 г. с. 61-73.
5. **У. Урбановіч.** Газета „Уперад". 1989 г., 16, 19, 20 верасня.

Вайсковы начальнік Лідскага павета грамадзянін Нарбут

В. В. Швед
г. Гродна

Людвік Нарбут, аб якім тут пойдзе гаворка, адыграў у паўстанні 1863 года значную ролю. Аб гэтым сведчаць сучаснікі. А. Яліцкі-аўтар кніжкі „Нарбут" – пісаў: Каліноўскі – „найвялікшы з нашых рэвалюцыянераў, выразнік грамадскай думкі паўстання ў такой жа меры, як Нарбут быў выразнікам духу і гераізму эпохі..."

Сябра Народнага ўрада А. Гілер таксама ставіў Нарбута ў шэраг з Каліноўскім: Каліноўскі „человек безграничного самопожертвования, честности, разума и энергии. Личность выдающаяся, достойная стоять рядом с Сигизмундом Сераковским, Людвиком Нарбутом и Антонием Мацкевичем в памяти народной".[1]

У 130-годдзе з дня паўстання нельга не ўспомніць пра Людвіка Нарбута. Асабліва тут, на Лідскай зямлі, з якой яго звязваюць першыя і апошнія гады жыцця. 31 жніўня 1832 г. у маёнтку Шаўры Лідскага павета ў сям'і архітэктара, інжынера і вядомага гісторыка Літвы Тэадора Нарбута нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Людвікам. Ён вучыўся ў Лідскім павятовым вучылішчы, потым у Віленскай гімназіі, дзе ў канцы 1850 г. быў арыштаваны за спробу стварыць „общество патриотов с целью произвести восстание". У сакавіку 1851 г. Людвіка публічна пакаралі розгамі і аддалі ў салдаты. У пісьмах з Каўказа ён прасіў сястру Тэадору прыслаць хаця б засушаную кветку або жытні каласок з родных палёў. Вярнуцца сюды давялося толькі ў пачатку красавіка 1860 г. Жыў у бацькі, вёў гаспадарку, калі ажаніўся, пасяліўся ў маёнтку Сербянішкі, недалёка ад Шаўраў. У лютым-красавіку 1863 г. паміж Лідаю і Мерачам дзейнічаў атрад Л. Нарбута.

Калі пачалося рыхтавацца паўстанне, Нарбут звязаўся з „чырвонымі", Каліноўскім, бываў на канспіратыўных сходах у Лідзе. У падпольнай арганізацыі выконваў абавязкі акруговага арганізатара. 13 лютага загадам Віленскага рэвалюцыйнага камітэта Нарбут быў назначаны вайсковым начальнікам Лідскага павета (цяпер гэта тэрыторыя Лідскага і Воранаўскага раёнаў). Ён

адным з першых арганізаваў партызанскі атрад на Беларусі. Не схаваўся за псеўданімам, як гэта зрабіла большасць камандзіраў, а дзейнічаў у родных мясцінах, дзе мясцовыя жыхары яго добра ведалі і паважалі. Гэта быў смелы ўчынак і свядомы выклік царскаму ўраду.

Ядро паўстанцкага атрада Нарбута склалася ў пачатку лютага з яго, брата Баляслава (ад'ютанта) і былога студэнта Пецярбурскага ўніверсітэта Уладзіслава Пілецкага. У будаўніцтве атрада значную дапамогу аказала сястра Людвіка Тэадора Маньчуньска (Манджунская). Яна прывяла ў атрад двух расейскіх афіцэраў, групу віленскай моладзі, дастаўляла харчовыя прыпасы і нават сама ажыццяўляла пераходы з атрадам.

Першы лагер нарбутаўцаў быў заложаны ў 3 вярстах ад м. Нача. Сюды з невялікай групай прыйшоў Леў Краінскі. Разам перайшлі ва ўрочышча Сабалюнцы, куды прыбыў ксёндз, настаяцель Вішнеўскага касцёла Лідскага павета Юзаф Гарбачэўскі (ён стаў капеланам атрада). Аснову атрада Нарбута складалі сяляне – гэта адна з асаблівасцей, бо ў многія атрады іх уцягвалі сілком. Людвік, як я ўжо казаў, карыстаўся папулярнасцю, а яшчэ, будучы дэмакратам, ён абвясціў маніфест аб спыненні павіннасцей і надзеле сялян зямлёй. Атрад быў нядрэнна ўзброены (партыя зброі і экіпіроўкі паступіла таксама з Вільні), дысцыплінаваны, навучаны страляць і прыёмам партызанскай вайны.

Аб тактыцы атрада Нарбута пісаў у сваім рапарце начальніку расійскіх войск, якія знаходзіліся ў Віленскай губерні, палкоўнік Амсараў: „Шайка эта хорошо вооружена и организована, во время действий высылает цепи и в совершенстве пользуется местностью, даже устраивает засеки для собственного прикрытия. Не имея обоза, легко одетая, знакомая с местностью, она занимает в лесу трудно доступные позиции. При приближении войск, хотя не представляет большого сопротивления, но встречая войска она из-за надёжного прикрытия, быстро отступает в чащу, вновь занимая другую позицию, при этом образе действий войска наши, не имея возможности её настигать в частом лесу, могут нести бесполезные потери..."[2] На тактыку атрада Нарбута безумоўна спрыяў яго ваенны вопыт: ён удзельнічаў у двух войнах – Каўказскай і Крымскай, меў званне прапаршчыка і пайшоў у адстаўку падпаручнікам.

За амаль чатыры месяцы існавання атрад Нарбута ўдзельнічаў у шэрагу баёў і сутычак. 28 лютага нарбутаўцы з'явіліся ў наваколлі м. Эйшышкі Лідскага павета. Ішлі з вёскі да вёскі, начавалі ў памешчыцкіх мызах, вербавалі ў атрад, чыталі сялянам праклямацыі, адымалі зброю ад ляснічых. Паблізу Воранава на дарозе Вільна–Ліда паспрабавалі спыніць пошту, страляючы ў канвойных салдат. Першая буйная сутычка адбылася пры в. Руднікі Трок-

скага павета. З боку паўстанцаў – 80 чал., у праціўніка – рота лейб-гвардыі Маскоўскага палка на чале з палкоўнікам Вінбергам і сотня казакоў. Пасля першых стрэлаў паўстанцаў казакі адышлі, а пяхота трымалася здаля, каб не даляталі кулі. Атрад перапраўся праз Сольчу і рушыў да Аранаў. У баі было паранена 4 расійскіх салдаты і забіта 4 паўстанцы. Хутка атрад Нарбута аказаўся ў Радунскім прыходзе Лідскага павета і хадзіў паміж мястэчкамі Заблонц і Нача.

10 красавіка Нарбут паслаў атрад коннікаў у Бершты, каб ён знішчыў мост на р. Котра – гэта аперацыя перарвала камунікацыю ад чыгуначнай станцыі Парэчча. 11 красавіка адбыўся бой каля в. Лубічы Каняўскай воласці Лідскага павета. Сустрэліся паўстанцы Нарбута і 2 роты лейб-гвардыі Паўлаўскага палка з 36 казакамі Данскога № 4 палка пад камандаю капітана Шімафеева. Рухаючыся часам па пояс у вадзе, карнікі ўсё ж вымусілі паўстанцаў адступіць. Яны адышлі з цэльнай стральбой па праціўніку і выкарыстоўваючы мясцовасць. Страты іх: 1 забіты, 5 паранена, расійскіх салдат забіта – 2, паранена – 5[3]. Пасля гэтага бою генерал-губернатар Назімаў прызначыў за галаву Нарбута вялікую цану, а расійскія салдаты празвалі яго ведзьмаром.

Для разгрома атрада Нарбута ў Гродна была складзена асобая частка: атрад палкоўніка Вернера (3 роты Калужскага пяхотнага палка, эскадрон улан Курляндскага палка, 20 казакаў і 1 гармата). 14 красавіка ён рушыў з Гродна ў пошук нарбутаўцаў. 20 красавіка ў в. Буды Вернер даведаўся, што паўстанцы хаваюцца ў балотах у наваколлі возера Думбля (каля в. Кавалькі). Бой, які тут адбыўся, працягваўся чатыры гадзіны. Агульная колькасць атрадаў Нарбута і Навіцкага дасягала каля 600 чалавек, але Вернер меў 805 чал. Пасля цяжкага бою паўстанцы страцілі 7 забітымі (сярод іх – Навіцкі і брат Нарбута) і болей 10 параненымі (па іншых даных – забіта 100, паранена – болей 100). 10 расійскіх салдат было паранена.

Нарбуту ўсё ж удалося захаваць ядро атрада, а Вернер 23 красавіка пайшоў у Гродна. 30 красавіка Віленскі паўстанцкі камітэт прысвоіў Нарбуту званне палкоўніка паўстанцкіх войск і, можа быць, кур'ер, якога прыняў Нарбут у ноч з 2 на 3 мая, прывёз яму патэнт на кіраўніцтва ўсімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Паўночна-Заходняга края.

Апошні бой Нарбута адбыўся ля возера Полясы, каля в. Дубічы. Начальнік Віленскага атрада вядомы ўжо нам Шімафееў нарэшце выдапільнаваў няўлоўны атрад. Маючы значна большыя сілы (ланцуг стралкоў, рота Паўлаградскага палка, узвод казакаў 42 Данскога палка), чым паўстанцы, ён вырашыў іх атакаваць і знішчыць. Нарбут не чакаў праціўніка і яго байцы практыкаваліся ў стральбе. Карнікі ж пайшлі на хітрасць: пераапрануліся ў ся-

лянскую вопратку і іх прынялі за сялян чакаемага транспарта з хлебам. Такім чынам, атака расійскіх стралкоў была нечаканай. Яны выбілі паўстанцаў з балотных кустоў, а пяхотная рота атакавала левы фланг Нарбута, каб скінуць у балота. Манеўр атрымаўся, паўстанцы адышлі, але зрабілі гэта арганізавана (перакатамі). Восем атак патрабавалася Цімафееву, каб зламаць сапраціўленне і прымусіць Нарбута аддаць загад прабівацца з акружэння асобнымі групамі. Цімафееў праследаваў паўстанцаў па калена ў балотнай вадзе, праз густаслую лазу да самай цемры і толькі ў тры з паловай ночы вярнуўся ў м. Дубічы.

У выніку боя было забіта 13 паўстанцаў (па іншым даным – 61), паранена 8 (ці 9), у палон папала 6 чалавек. Сярод забітых – памочнік Нарбута Л. Краінскі і сам Людвік. Яго паранілі тройчы: спачатку ў нагу, потым – у грудзі. Паплечнікі неслі яго на руках, каб схавацца ў лесе, але смяротная куля папала ў шыю. Захаваўся цікавы расказ гвардзейскага афіцэра, які чуў падрабязнасці гібелі Нарбута ад Цімафеева: „Отступление совершалось в порядке, как вдруг Нарбут пошатнулся, упал на колени и присел на землю. Ближайшие повстанцы бросились к нему на помощь, но он замахал руками и проговорил: „то ниц, то ниц!.." (это ничего, ничего!). Он был смертельно ранен. Его подхватили на руки и побежали с ним, но спасти всё-таки не смогли, так как наши подошли и были уже в нескольких шагах. Нарбут ещё успел расстегнуть чамарку и передать бумаги и деньги одному из своих проводников, но затем упал мёртвым вместе с помощниками, пораженными несколькими пулями... Шайка при известии о тяжелой ране своего начальника приостановилась на свою гибель. Ее окружили и почти всю уничтожили". Далей ва ўспамінах царскага афіцэра гаварылася: „Мы вышли в переднюю: первое, что я увидел, был лежавший на скамейке труп. Нарбута. Он был в простой синей чамарке, без всяких отличий и в больших сапогах. Лицо покойника было красивое, привлекательное: высокий лоб, правильные черты лица, на котором как будто застыла горделивая улыбка"[4]. Вядомы віленскі мастак Эльвіра Андрыёлі, які ваяваў у атрадзе Нарбута і быў паранены ў апошнім баі, намалюе потым палатно „Смерць Нарбута".

Забітых паўстанцаў прывезлі ў Дубіцкі касцёл, адпелі і пахавалі паблізу ў брацкай магіле, але хутка зруйнавалі яе з зямлёй. А па вёсцы Дубічы яшчэ доўга патрулявалі казацкія раз'езды. Палонныя папалі ў Сібір, Баляслава Нарбута злапалі ў ваколіцах Друскенік і аддалі пад ваенны суд у Гродне. СястраТэадора збегла за мяжу.[5] Рэшткі атрада былі сабраны пад кіраўніцтва Парадоўскага–Астрога, які летам завёў атрад у Гродзенскую пушчу, а потым далей – у Аўгустоўскія лясы.

...У 1933 г. польскі 76 полк пяхоты імя Л. Нарбута на сабраныя

грошы паставіў на месцы пахавання паўстанцкага камандзіра помнік з надпісам: „За нашу свабоду і вашу"[6].

---

[1] Цыт па: Кісялёў Г. „Як салодка памерці за радзіму!.." Таленавіты камандзір паўстанцаў 1863 года Людвік Нарбут. Наш радавод. – Кн. 11. – Гродно, 1990. – С. 271; К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия. – Мн.: Беларусь, 1988. – С. 159.

[2] Виленский временник. Кн. УІ, Ч. 2. – Вильно, 1915. – С. 104.

[3] Миловидов А. И. Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампании 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края. – Вильна, 1915. – С. 4.

[4] Цыт па: Кісялёў Г. Указ. сач – С. 275-276.

[5] Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. – Менск; Ьел. АН 1930. – С. 113-114; Миловидов А. И. Указ. сач. – С. 4; Виленский временник... – С. 128-129.

[6] Нарбут А. Генеалогія сям'і „Чырвоная змена". – 1989, – 18.ХІ. –С. 9.

Старонкі тэатральнага жыцця Ліды першай паловы XIX стагоддзя

С. Я. Сяльверстава
г. Гродна

У першай палове ХІХ стагоддзя тэатр быў адной з найбольш папулярных галін мастацтва, і адпаведна, найбольш масавай. Ужо ў другім дзесяцігоддзі тэатральныя калектывы выступалі ва ўсіх губернскіх гарадах, а ў другой трэці стагоддзя тэатральныя паказы былі неад'емнай часткай культурнага жыцця многіх уездных гарадоў. Наяўнасць у горадзе тэатральнай трупы сведчыла аб дастаткова высокім узроўні культурных запатрабаванняў яго жыхароў, і часам, аб узроўні яго эканамічнага развіцця. У гэты час толькі ў буйнейшых гарадах і сталіцах – Вільні, Адэсе, Харкаве, Архангельску, Варшаве, Пецярбургу і Маскве – меліся пастаянныя тэатры. Астатнія гарады абслугоўваліся вандроўнымі трупамі, якія здзяйснялі турне па гарадах і мясцечках, затрымліваючыся ў некаторых з іх на больш доўгі час. Тэатральная рэформа 1845–1847 г.г., якая павінна была змяніць такое становішча і стварыць пастаянныя дырэкцыйныя тэатры са сталай трупай, сваей задачы канчаткова не выканала: І пасля яе вандроўныя трупы з'яўляліся галоўнай прыкметай тэатральнага жыцця беларускіх гарадоў на працягу ўсяго ХІХ стагоддзя.

У першай палове ХІХ стагоддзя Ліда не аднойчы прыцягвала

да сябе ўвагу вандроўных труп. У тыя часы гэта быў даволі буйны горад, які хутка развіваўся – з 1811 па 1861 г.г. яго насельніцтва павялічылася з 1300 да 4087 чалавек[1]. Праз Ліду праходзілі ажыўленыя шляхі на Вільню, Гродна, Мінск і іншыя гарады, што было зручным для вандроўных артыстаў. З Лідай звязаны вельмі цікавыя, а часам нават унікальныя старонкі тэатральнага жыцця Беларусі. Найбольш ажыўленай была тут дзейнасць тэатральных калектываў у 30-я –40-я г.г. Сярод труп, якія выступалі ў гэты час у Лідзе, прыцягвае да сябе ўвагу трупа Вікенція Вержбіцкага, каторая іграла на лідскай тэатральнай пляцоўцы ў 1832 г. Вікенцій Казімір Вержбіцкі быў у свой час вядомым антрэпрэнерам і акцёрам. На сцэне яго кар'ера пачалася ў канцы другога дзесяцігоддзя XIX стагоддзя. Шляхціч па паходжанню, ён на ўсё жыццё звязаў свой лёс з тэатрам. Больш за трыццаць гадоў Вержбіцкі выступаў на сцэнах Гродна, Вільні, Мінска, Брэста, Магілёва, атрымаў званне ганаровага грамадзяніна, у 40-я г.г. быў арганізатарам руска-польскага дырэкцыйнага тэатра у Мінску[2].

Трупа Вержбіцкага прыехала ў Ліду вясной 1832 года і гастрявала тут да канца чэрвеня. У яе складзе былі Ф. Беліца, К. Леснеўскі, Маліноўская, Гізберт, А. Беліца, Цвікевіч, Цэхановіч і інш.[3]. На жаль, нам не вядомы за рэдкім выключэннем назвы п'ес, якія ў гэты час ставіліся ў Лідзе трупай Вяржбіцкага. Матэрыялы, якія захоўваюцца у БДГА ў Гродна ўтрымліваюць у сабе толькі рапарты лідскіх гараднічых аб колькасці і датах тэатральных паказаў. Аднак праз год Вікенцій Вержбіцкі па запатрабаванню Гродзенскага грамадзянскага губернатара прадставіў для цэнзурнага разгляду рэпертуар свайго тэатра, які дае нам магчымасць з пэўным працэнтам прыбліжэння ўявіць, што глядзелі лідскія тэатралы ў сярэдзіне 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Вялікай папулярнасцю ў аматараў тэатра ў той час карысталіся п'есы Войцеха Багуслаўскага. У рэпертуары тэатра Вержбіцкага былі „Модныя спазмы", „Генрых УІ на паляванні", „Ланаса, або Малабарская ўдава" гэтага вядомага польскага драматурга, пачынальніка нацыянальнага польскага тэатра. Дарэчы будзе заўважыць, што трупа Вержбіцкага, як і падаўляючая большасць тэатральных калектываў Беларусі таго часу, працавала на польскай мове.

Вяржбіцкі ўключыў у рэпертуар сваёй трупы трагедыі „Гамлет" Шэкспіра, „Жаночы гонар" Вальтэра. Аднак гэтыя п'есы ставіліся ў той час вельмі рэдка. Часцей на сцэне можна было ўбачыць меладрамы і драмы А. Коцэбу („Жыццё Ролы" і „Дзяўчына Сонца"), В. Дзюканжа („Жыццё іграка" і „Тарэза або Жанеўская сірата"), вадэвілі Лістоўскага („Папугаі нашай бабуні"), Керубіні („Вадавоз", „Лодоіска"), К. Каміньскага („Замак у Чарштыне") і іншыя, якія ўключыў у рэпертуар сваёй трупы і В. Верж-

біцкі.[4] Менавіта з трупай В. Вержбіцкага звязаны кур'езны выпадак, які характарызуе становішча акцёраў і жорсткасць царскай цэнзуры ў адносінах да тэатра пасля паўстання 1830–1831 г.г. Праз год пасля выступленняў у Лідзе трупа Вяржбіцкага знаходзілася ў Гродна, дзе паставіла п'есу „Марыя, каралева Швецкая і Кацярына, каралева польская", якая па меркаванню мясцовага паліцмайстра была „по содержанию своему несообразная с духом настоящего времени". Па распараджэнню мясцовай паліцыі антрэпрэнер быў на тры дні пасаджаны на гаўптвахту.[5]

Лёс Вікенція Вержбіцкага склаўся не вельмі ўдала. У сярэдзіне 40-х гадоў ён спачатку працаваў у Мінску, а затым, пасварыўшыся з мясцовай тэатральнай дырэкцыяй, выехаў на Магілёўшчыну. У тыя часы для ўтрымальнікаў тэатральных антрыпрыз былі ўведзены пасведчанні аб добранадзейнасці, без якіх займацца тэатральнай справай забаранялася. У 1846 годзе Вяржбіцкі ў Старым Быхаве „выказал неўжывчивый свой характер" 1 быў пазбаўлены пасведчання, што пакінула акцёра ў канцы жыцця без сродкаў існавання.[6]

У пачатку 40-х гадоў Ліду наведвае яшчэ адзін цікавы тэатральны калектыў, які, дарэчы, быў адным з найбольш знаных у Беларусі ў тыя часы. У кастрычніку 1840 г. у Ліду прыехала трупа Станіслава Навакоўскага, якая затым неаднойчы наведвала гэты горад. Некалькі слоў трэба сказаць аб складзе трупы. Трымальнік антрэпрызы Станіслаў Навакоўскі быў на тыя часы ўжо вопытным антрэпрэнерам. Ён сам добра спяваў (бас), быў нядрэнным драматычным акцёрам, а таксама меў неблагі густ у падборы рэпертуара для трупы, чым выклікаў нязменную павагу публікі. Разам з Навакоўскім у Ліду прыехалі дванаццаць акцёраў, сярод якіх хочацца вылучыць Казіміра Скібінскага. Ліда можа ганарыцца, што на яе сцэне выступаў гэты выдатны тэатральны дзеяч. Казімір Скібінскі быў у той час адным з найбольш вядомых акцёраў, ён выступаў у Пецярбургу, Маскве, Варшаве, Кракаве, Вільні, Мінску. Скібінскі пакінуў выдатныя мемуары, якія даносяць незвычайна маляўнічую карціну культурнага жыцця Беларусі і Літвы першай паловы мінулага стагоддзя. У трупе Навакоўскага былі і іншыя вядомыя акцёры, якія выступалі на сцэнічных пляцоўках Вільні, Гродна, Мінска і іншых гарадоў: Бетлееўская, Блажыевіч, Слабадзінская і іншыя.[7] Трупа Навакоўскага паказала ў Лідзе, галоўным чынам, невялікія вадэвілі і камедыі-оперы. Гэта былі пераважна перакладныя п'есы. Але, бадай што, найбольш цікавы паказ адбыўся 26 кастрычніка 1840 г. Акцёрамі была паказана п'еса Шылера „Каварства і каханне".[8] Гэтая п'еса на той час была забаронена для паказаў у правінцыі. Царскія ўлады не вельмі лагодна ставіліся да твораў драматурга-рамантыка і амаль усе яго

п'есы былі або забаронены, або ставіліся з купюрамі. Як няцяжка заўважыць па афішы, „Каварства і каханне" была адной з цэнтральных п'ес у рэпертуары Навакоўскага, і пэўна, падабалася мясцовай публіцы: п'еса ставілася ў суботу, найбольш касавы дзень і ішла адна, без дадатковага вадэвіля ці дывертысмента.[9]

Трупа Станіслава Навакоўскага выступала на Гродзеншчыне на працягу шасці гадоў. У 1846 г. на яе базе быў створаны пастаянны руска-польскі дырэкцыйны тэатр, яна атрымала манапольнае права на паказы ў гарадах Гродзенскай губерні. Неаднаразова наведвала і Ліду.

Акрамя двух вышэй названых труп у Лідзе ў першай палове XIX стагоддзя гастраліравалі і іншыя тэатральныя калектывы: Маеўскага, Грунвальда, Клакоцкага і іншых антрэпрэнераў.

---

[1] Чепко В. В. Города Белоруссии в первой половине XIX века. Экономическое развитие. – Мн., 1981. – С. 119.
[2] ЛДГА, ф. 378, аг/аддз, 1845, спр. 1978, л. 50–51.
[3] БДГА у Гродна, ф. 1, воп. 10, спр. 514, л. 32.
[4] Там жа, л. 44-50.
[5] Там жа, л. 31-32.
[6] ЛДГА, ф. 378, аг/аддз. № 845, спр. 1978, л. 34, 145.
[7] БДГА у Гродне, ф. 1, воп. 20, спр. 397, л. 124.
[8] Там жа, Л. 117.
[9] Там жа.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ
пад польскай акупацыяй 1920-1939 г. г.

АНДРЭЙ ЧЭМЕР
г. Вільня

Беларускі народ спрадвеку вызначаўся талерантнасьцю. З належнай павагаю ставіўся да суседзяў і суайчыньнікаў іншых нацыянальнасьцяў. У старажытных і пазьнейшых помніках пісьменства не знаходзім сьлядоў пра нацыянальныя або рэлігійныя варожыя адносіны беларусаў. да якой-небудзь „чужой" нацыянальнасці альбо веры.

Нажаль ня ўсе нашы суседзі належна ўспрымалі дабрату й спагадлівасьць беларусаў. Аўтар ня мае намеру чыніць закіды якой-небудзь нацыі, народу. Народ – гэта заўсёды народ, яму патрэбны мір і праца, добрасуседзскія адносіны з кожным чала-

векам і кожным іншым народам. Аднак сярод многіх нацыяў знаходзіцца тонкая праслойка шавіністаў, якая стараецца абдурваць свой народ (і ня толькі свой), каб фальшывымі лозунгамі распаліць нездаровыя інстынкты, а пасьля, разыгрываючы псіхалогію натоўпу, захапіць уладу ў свае рукі. У выніку, – большая ці меншая група палітычных ашуканцаў стварае дыктатарскую сістэму кіраўніцтва і тэрорам змушае людзей падпарадкавацца інтарэсам гэтай групы.

Такім спосабам была захоплена ўлада ў Італіі фашыстоўскай партыяй (Мусаліні); у Нямеччыне – нацыянал-сацыялістычнай партыяй (Гітлер), у Расейскай імпэрыі – камуністычнай партыяй (Джугашвілі) і г. д...

Як вядома, у супольнай дзяржаве беларускага і польскага народаў (разам з украінцамі і жмудзінамі) быў ухвалены прынцып: у выпадку зьнешняй агрэсіі мы будзем супольна змагацца „За вольнасьць нашу і вашу". Гісторыя паказала, што беларусы сьвята шанавалі гэты прынцып. Успомнім хоць бы Грунвальд, Монтэ-Касіно , Варшаву, дзейнасьць Касьцюшкі, Каліноўскага. Нажаль пад націскам шавіністычнай польскай праслойкі, іншую пазіцыю адносна беларусаў заняла Польшча. Ідэя экспансіі на Беларусь стала больш прывабнай для ўладаў Польшчы, чым справядлівасьць і шматгадовае сяброўства.

Асабліва брыдкую ролю ў гэтым іграла і грае польскае духавенства.

Узгадніўшы „пазіцыі" з варшаўскім урадам, высокаадукаваныя біскупы Польшчы і ксяндзы парушылі хрысьціянскі закон ПРАЎДЫ і СПРАВЯДЛІВАСЬЦІ. Дасканальна ведаючы, што значная частка насельніцтва Беларусі – каталікі, польскае каталіцкае духавенства, падыходзячы да беларуса, пыталася:

– Ты каталік, ходзіш у касьцёл?

– Хаджу ў касьцёл, – гаварыў беларус.

– Значыць ты паляк! Польскай веры!

І малаграматны беларускі селянін (а часта й зусім неадукаваны) змушаны быў прымаць словы душпастыра за праўду. Яму не мясьцілася ў галаве, што творыцца масавае ашуканства. Што з касьцельнага амбона сам „намесьнік Езуса Хрыстуса" гаворыць няпраўду... Калі ня верыць духоўнаму айцу (у пышных залачоных і срэбраных арнатах) і яго сьвятому крыжу, то каму ж тады верыць?..

Ня гледзячы на вялікі маральны й палітычны націск польскага духавенства і афіцыйнай сьвецкай улады, ня ўсе беларусы- каталікі выракліся роднага народу. Калі ім даказвалі, што „ты паляк" альбо „ты рускі" (бо ходзіш маліцца ў царкву), то гвалтаваны беларус бараніўся:

– Я не паляк і ня рускі... Я – тутэйшы.

Тутэйшых набралася на тэрыторыі Заходняй Беларусі некалькі

дзесяткаў тысяч (толькі на Віленшчыне звыш дзесяці тысяч).

Як жа, аднак, разьвіваліся ўзаемаадносіны беларусаў і палякаў на працягу польскай акупацыі да 1939 года?

Начальнік польскай арміі і польскай дзяржавы Язэп Пілсудзкі у адозве да жыхароў былога Вялікага Княства 22 красавіка 1919 г. сказаў:

– „Стан бязупыннай няволі, які я, радзіўшыся на гэтай нешчасьлівай зямельцы, добра ведаю, павінен нарэшце быць зьніштожаны і ў гэтай быццам праз Бога забытай старонцы павінна запанаваць свабода...

...Хачу вам даць магчымасьць разьвязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы гэтак, як самі таго захочаце, бяз ніякага гвалту або націску з боку Польшчы".

Так абяцаў галоўны кіраўнік польскай дзяржавы маршал Язэп (Юзэф) Пілсудзкі. Беларусы паверылі (хоць ня ўсе). На пачатку сапраўды існавала нейкае супрацоўніцтва. У Варшаве і Горадні арганізаваліся беларускія батальёны і палкі. У занятых палякамі рэгіёнах прадаўжалі працаваць сотні беларускіх школ, існавала беларуская прэса і г. д. У Беластоку й Вільні паўсталі сярэднія беларускія школы, усьлед за тым – і ў Навагрудку, Клецку, Радашкавічах. Дзейнічалі беларускія арганізацыі і інш.

Хутка, аднак, адносіны да адраджэнцкага руху беларусаў сталі рэзка мяняцца. Перш за ўсё была зроблена вялікая крыўда сялянству. Урад замест патрэбнай зямельнай рэформы (як, напрыклад у Латвіі, дзе абшарнікам пакінулі 30 га зямлі, а рэшту перадалі беззямельным і малазямельным сялянам), значныя арэалы зямлі перадаў асаднікам-палякам (быўшым легіянерам). Гэта, зразумела, стала прычынай многіх антыпольскіх выступленняў, варожасьці беднай часткі беларускага сялянства да польскіх уладаў.

Пачалася бескампрамісная ліквідацыя беларускага школьніцтва. З трохсот беларускіх школ ужо ў дваццатыя гады засталося толькі некалькі (чатыры гімназіі і сэмінарыя). Пра вышэйшыя беларускія навучальныя ўстановы і гутаркі не магло быць. А ў трыццатыя гады ўцалела толькі адна беларуская школа – Віленская беларуская гімназія. І яна мелася ліквідавацца, ды пачалася вайна 1939-га году.

Ліквідаваліся сістэматычна ўсе беларускія арганізацыі: Інстытут гаспадаркі і культуры, Таварыства Беларускай школы, Беларускі банк, кааператыўныя арганізацыі, беларускія выдавецтвы і г. д.

Прасьледавалася ня толькі беларускае праваслаўнае духавенства, але й каталіцкае, уніяцкае. Ксёндз др. Кулак, кс. Адам Станкевіч, кс. Цікота, кс. Стэповіч, кс. Гадлеўскі, кс. Глякоўскі і іншыя бесперапынна прасьледаваліся, перасылаліся ў польскія

парафіі, альбо зусім заставаліся без прыходаў. Калі хоць малая частка беларусаў-каталікоў мела магчымасьць маліцца на роднай мове пры кіраўніцтве біскупа Матулевіча, то настаўнік яго – яры шавініст біскуп Яблжыкоўскі–распачаў і давёў да канца поўную ліквідацыю беларускай мовы ў касьцёлах. Зразумела, гэта таксама ня выклікала сімпатыі беларусаў да акупацыйнай улады.

Побач са школьніцтвам, першымі былі зьліквідаваны вайсковыя беларускія фарміраванні. Частка афіцэраў атрымала пэнсіі. Радавыя вайскоўцы пераведзены ў польскія фармацыі альбо звольнены.

Трагічна выкарчоўваўся беларускі палітычны рух. Пакрыўджаная сялянская беднота, а таксама гарадзкія рабочыя, якія трымаліся роднай мовы і звычаяў, апынуўшыся на самай нізкай ступені грамадства, былі падатнай глебай для бальшавіцкай агітацыі. Перасыланыя з усходу агітатары паўсюдна вялі тайную прапаганду, якой народ ахвотна верыў. І калі перадавыя беларускія дзеячы арганізавалі работніцка-сялянскую грамаду, у праграме якой асноўнымі дамаганьнямі было: даць сялянам зямлю без выкупу; устанавіць дэмакратычнае кіраўніцтва; адкрыць беларускія школы і ўстановы – людзі масава сталі запісвацца ў гэтую арганізацыю. Не мінула году, як грамада налічвала больш ста тысяч сябраў. Калі ўлады не давалі ходу легальнай беларускай прэсе, шырока распаўсюджвалася нелегальная рознага роду літаратура. Ажывіліся кантакты з Усходняй Беларусьсю. Умела праведзеныя выбары стварылі магчымасць арганізаваць моцны пасольскі клюб у сойме. Некалькі беларусаў было і ў сэнаце. Зьявіліся выдатныя дзеячы, беларускія правадыры, – Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Валошын, каторыя трымаліся левага напрамку, зьбліжанага да камуністаў.

Паслы Васіль Рагуля, Фабіян Ярэміч, Павал Каруза прапанавалі больш памяркоўны курс рэформаў. Аднак пасольская група была спаянай, заўсёды дзейнічала сумесна, і яе дзейнасць, якую часта падтрымлівалі левыя польскія партыі, стварала сур'ёзную апазіцыйную сілу. Асабліва тады, калі выступалі сумесна ўкраінцы ды іншыя нацыянальныя лідэры.

Пілсудзкі, які ў тыя гады прадаўжаў кіраваць дзяржавай, спалохаўся масавага ўсенароднага руху беларусаў. Канфлікт узмацняўся й тым, што маршал не навязваў асабістых кантактаў з беларусамі і часта шавіністы падсоўвалі яму дэзінфармацыю. Калі, нарэшце, не знаходзячы зразумення ў польскіх палітычных кругах, Тарашкевіч публічна заявіў, што „Беларускі дом будуецца ў Менску, там наша сапраўдная Бацькаўшчына", – Пілсудзкі прыняў рашэнне поўнасьцю зліквідаваць беларускі палітычны рух. Былі арыштаваны вядучыя дзеячы Грамады, у першую чаргу – Тараш-

кевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Мятла і іншыя. Жорсткая хваля арыштаў, рэпрэсій і закрыцця беларускіх установаў пракацілася па ўсёй Заходняй Беларусі.

Абаронцамі беларускіх палітзьняволеных выступілі лепшыя адвакаты Вільні і Варшавы. Працэсы выклікалі рэха ва ўсім сьвеце.

Пасыпаліся многія тысячы пратэстаў, мітынгаў, маніфэстацый. Тым ня менш, большасьць абвінавачаных была засуджана на 8 і больш гадоў турэмнага зьняволення. „Беларуская Работніцка-Сялянская Грамада" была зьліквідавана.

Пасьля гэтага былі зачынены апошнія беларускія гімназіі, улады засудзіўшы аднаго вучня (у Навагрудку) на сьмерць, а дзесяткі на розныя тэрміны турэмнага зьняволення.

Пры канцы існавання польскай дзяржавы, быў створаны ў Картузскай Бярозе спецыяльны лагер для палітычных вязьняў, у якім „пачэснае" месца было выдзелена многім беларусам...

Вось так выглядала „барацьба" польскіх лідэраў „за вольнасьць нашу і вашу"! Мы – беларусы дабравольна падстаўлялі свае галовы пад пулі, аддавалі жыццё ў абароне саюзнага польскага народу. А польскія шавіністы? Калі яны заступіліся за нас у бядзе?... У патрэбе?... Чаму так складалася, што яны трымаліся ня брацкага, раўнапраўнага супрацоўніцтва, а шавіністычнага, захопніцкага?.. Няхай на гэтае пытанне адкажуць сацыёлагі і гісторыкі.

Аднак можа ўзьнікнуць пытанне: ці не пара пакончыць з тым, што было? Забыць пра старое?.. Сёння ж жывуць і дзейнічаюць другія людзі, іншае пакаленне?..

Пара! Мы – беларусы даўно гэтага дабіваемся. Ідзём насустрач любым пажаданням з боку ўлад сучаснай Польшчы. Нават задалёка зайшлі. Уся тэрыторыя, населеная беларусамі, засыпана польскамоўнымі газэтамі, польскімі кнігамі, польскімі сьцягамі і радыё-тэлевізійнымі перадачамі і дэзінфармацыяй. Вось некалькі тыповых прыкладаў.

1). Прадаўжаецца і ўзмацняецца польская агітацыя, аснаваная на лозунгу: „Кажны паляк – католік, кажны католік – паляк". Што гэты лозунг фальшывы ясна для кожнага нармальнага чалавека.

Паняцце „польскай веры" выдумана для ашуканства цёмных, няпісьменных альбо малапісьменных людзей, у першую чаргу беларусаў. Бо ніколі ня было і няма „польскай" веры. Падумайце самі, калі кожны – хто ў касьцёл ходзіць (трымаецца каталіцкай веры) – паляк, то сколькі ж палякаў на зямлі?: у Польшчы 36 мільёнаў, у Італіі 50 мільёнаў, у Гішпаніі, Партугаліі, Францыі, Нямеччыне яшчэ больш 50 мільёнаў, а на Беларусі, Украіне, у Расіі, Прыбалтыцы мільёнаў 10... А ў Бразіліі, Аргенціне, Канадзе, ЗША, Ірляндыі, Кітаі, Японіі , Аўстраліі, Індыі, Кітаі... Усяго набіраецца ня 40 мільёнаў, як паказвае статыстыка, а МІЛЬЯРД

ПАЛЯКАУ!.. Чаму тады не хваліцца, што польская нацыя пераганяе Кітай сваёй колькасьцю?..

2). Да часу, калі надышлі гарбачоўскія рэформы і яўнасьць (свабода слова і друку), польскія афіцыйныя друкаваныя крыніцы справядліва залічвалі маласьвядомых „тутэйшых" да беларускай нацыянальнасьці. Аж раптам, пачынаючы з 1991 году польскі друк атрымлівае загад: усіх „тутэйшых" залічваць да палякаў... Такога нонсэнсу нават з часоў пілсудчыны не заўважалася.

3). Беластоцкі „Часопіс" у некалькіх намярах з 1991 г. падае каля трыццаці выпадкаў НАПАДАЎ польскіх АКОЎЦАЎ на беларускае насельніцтва на Беласточчыне, калі было спалена шмат паселішчаў і вёсак, замардавана больш 200 асобаў... ні ў чым ня вінаватых людзей, у тым ліку жанчын і дзяцей. Устаноўлены асобы забітых, мейсцы і даты, таксама прозьвішчы бандытаў-забойцаў. Вось некалькі фактаў. У вёсцы Залешаны забіта Пятра Дземянюка і Аляксандра Зялінку, а жывымі спалена 7 асобаў дарослых і 7 дзяцей, сярод іх Надзею Леанчук ва узросце – 2 тыдні, Сяргея Леанчука – 1 год, Мішу Нічыпарука – 16 гадоў, Спалена вёскі Заны і Шпакі Бельскага павету. Замардавалі 32 асобы, 24 цяжка паранілі, укінулі ў агонь і спалілі.

У дзень Вялікадня выцягнулі з пасьцелі Язэпа Дзьмітрука і на парозе сяней развалілі з аўтамату яму мазгі, пасадзілі яму на жываце аднагадовае дзіцятка і пайшлі ў вёску Сьвідзялоўку. На дарозе забілі 25-гадовага чалавека. Схапілі лясьніка Яцэвіча ў лесе, выпалілі яму вочы і выразалі язык.

Газэта падала толькі маленькую частку зладзействаў АК, яшчэ многія архівы – пад замком, а жывыя сьведкі баяцца гаварыць.

І што ж вы думаеце? Можа хоць адзін польскі ксёндз з амбоны пракляў крывавых забойцаў? Адслужыў паніхіду па нявінных ахвярах?..

Дык хто ж сее нязгоду паміж палякамі і беларусамі? Хто пробуе з ненавісьці і чужой крыўды ляпіць сваё „шчасьце"? Свой дабрабыт на чужой зямлі?.. Беларусы ў Любліне, Кельцах, Кракаве, ці палякі на Беласточчыне, Глыбоччыне, Навагрудчыне?

Мы паважаем працавіты польскі народ. Але для згоды і сяброўскага супрацоўніцтва патрэбна жаданне абсіх старон. І неабходна, каб нарэшце быў спынены варожы курс пра польскага духавенства і варшаўскіх уладаў адносна беларускага насельніцтва, спынена варожая дзейнасьць шавіністычнага польскага духавенства з мэтай далейшага апалячвання беларусаў. Касьцёлы для беларускіх католікаў павінны быць ня польскімі, а беларускімі! Бо, як кажа польская прыказка: „Допуты дзбан водэ носі, аж се ушко урве"...

Лідчына ў верасні 1939 — чэрвені 1941 гг.

М. ВАСІЛЮЧАК
г. Гродна.

1 верасня 1939 года фашысцкая Германія без абвяшчэння вайны напала на Польшчу. Адсталая ў эканамічных, слабая ў ваенных адносінах буржуазна-памешчыцкая Польшча не змагла супрацьстаяць куды большым сілам праціўніка. Польскі ўрад і камандаванне ўзброеных сіл пакінулі армію, народ і ганебна ўцяклі за граніцу.

17 верасня 1939 года па распараджэнню ўрада СССР Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую граніцу і пачала вызваленчы паход. Працоўныя Заходняй Беларусі сустрэлі Чырвоную Армію з радасцю, хлебам-соллю і кветкамі. За шэсць дзен уся Заходняя Беларусь была вызвалена ад буржуазнай Польшчы. Горад Ліда і павет былі вызвалены Чырвонай Арміяй 18 верасня 1939 года. Значнага супраціўлення з боку польскай арміі і мясцовых жыхароў не было. У гэты ж дзень у Лідзе адбыўся шматтысячны мітынг працоўных. На ім выступалі жыхары горада і бліжэйшых вёсак, выражалі падзяку Чырвонай Арміі за вызваленне.

У горадзе было ўтворана часовае ўпраўленне, якое узначаліў Пётр Захаравіч Калінін, які быў ўпаўнаважаны ЦК КП (б) Беларусі. Для падтрымкі парадку была створана рабочая гвардыя, якую ўзначаліў мясцовы жыхар М. Т. Рачкевіч.[1] Значную дапамогу ў навядзенні парадку аказалі былыя камуністы на чале з С. Кіселем (у 1938 годзе выканкомам Камінтэрна Кампартыя Польшчы і яе састаўная частка Кампартыя Заходняй Беларусі былі распушчаны).

Перад Часовымі ўпраўленнямі стаяла неадкладная і адказная задача: да канца зламаць старую ўладу і супраціўленне звергнутых класаў, пусціць у ход фабрыкі і заводы, арганізаваць работу школ, бальніц, культурных устаноў і прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці мясцовае насельніцтва.

На прадпрыемствах горада былі створаны рабочыя камітэты. Яны ажыццяўлялі кантроль над вытворчасцю і збытам прадукцыі, прымалі актыўны ўдзел у нацыяналізацыі фабрык і заводаў. На прадпрыемствах устанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

Але рашыць пытанне дзяржаўнага будаўніцтва часовыя ўпраўленні не маглі. Трэба было правесці выбары ўсеагульныя і на дэмакратычнай аснове. І 22 кастрычніка 1939 года адбыліся выбары ў Народны (нацыянальны) сход Заходняй Беларусі. За народных кандыдатаў галасавала 90,67 працэнта выбаршчыкаў ад

агульнай колькасці ўсіх, хто ўдзельнічаў у галасаванні. Усяго было выбрана 929 дэпутатаў[2], у Лідзе 5 і ад валасцей 40 чалавек атрымалі мандаты[3].

28–30 кастрычніка ў Беластоку праходзіла пасяджэнне Народнага сходу Заходняй Беларусі. Дэпутаты, ажыццяўляючы волю вызваленага народа, аднагалосна прынялі рашэнне ўстанавіць Савецкую ўладу на тэрыторыі Заходняй Беларусі, хадайнічаць аб уключэнні яе ў склад СССР і БССР, канфіскаваць памешчыцкія землі і нацыяналізаваць усю зямлю, буйную прамысловасць і банкі.

На Народным сходзе ў Беластоку ад горада выступіла рабочая фабрыкі „Ардаль" Е. А. Рэдзік, якая скардзілася на цяжкі лёс рабочых. Яна ўдзень атрымлівала за сваю працу адзін злоты, а за кватэру ў месяц павінна была плаціць 7 злотых. Ад сялян Лідчыны выступіў дэпутат Ю. В. Кароль, які таксама падкрэсліў у сваёй прамове марнае сялянскае жыццё пры Польшчы[4].

Значныя змены ў першыя дні Савецкай улады адбываліся і на сяле: ствараліся сялянскія камітэты, якія імкнуліся навесці парадак па раздзелу памешчыцкай маёмасці, жывёлы і зямлі. Так, сялянскія камітэты былога Навагрудскага ваяводства (куды ўваходзіла і Лідчына) за 30 дзён сваёй дзейнасці перадалі ў рукі працоўнага сялянства 304900 га зямлі, 900 коней і 23000 кароў.[5] Сялянскія камітэты ў тыя гады арганізоўвалі і падвоз у горад сельскагаспадарчых прадуктаў. Вельмі актыўна ў тыя дні дзейнічаў старшыня Ліпнішкоўскага сялянскага камітэта У. І. Кель.[6] У гады вайны змагаўся супраць нямецкіх акупантаў, а вясной 1944 года загінуў ад рук Арміі Краёвай.

Савецкі ўрад аказаў працоўным Заходняй Беларусі значную матэрыяльную дапамогу. Ужо ў першыя дні вызвалення сюды былі накіраваны 6 тыс. тон солі, 700 тон газы, 5 тыс. скрынь запалак, 7150 скрынь махоркі.[7]

У Лідзе былі нацыяналізаваны ўсе прадпрыемствы, а таксама банк, электрастанцыя, чыгуначны вузел, сувязь і буйныя пабудовы. Усе нацыяналізаваныя прадпрыемствы рэканструяваліся, абсталёўваліся новай, савецкай тэхналогіяй. Так, на „Лідсельмашы" быў пабудаваны новы зборачны корпус, у ліцейным цэху пачалі даваць прадукцыю дзве новыя вагранкі. Пачалі рэканструяваць і другі завод сельгасмашын. Усё гэта дало магчымасць павялічыць магутнасці ў два разы. Значныя змены адбыліся на фабрыцы „Ардаль". Калі ў самы лепшы перыяд фабрыка выпускала 800 тыс. пар абутку, то за 1940 год выпусціла 1210 тысяч галошаў, 165 тысяч скуранага абутку. На фабрыцы былі адкрыты сталовая, бібліятэка, дзіцячы садзік. Перамены адбыліся і на другіх прадпрыемствах. Таму не выпадкова ў канцы 1940 года ў горадзе ўжо нехапала рабочых рук, а пры буржуазнай Польшчы

пастаянна налічвалася 3 тысячы беспрацоўных.[8]

Новым зместам напаўнялася культурнае жыццё горада і павета. Да ўз'яднання да 7 тысяч дзяцей не мелі магчымасці вучыцца, а ў 120 вёсках павета навогул не было школ. І за кароткі час толькі ў горадзе былі адкрыты 2 сярэднія, 6 сямігадовых школ, якія ахапілі 4428 дзяцей. Да 1939 года ва ўсіх школах горада навучалася толькі 700 вучняў.

Адбываліся перамены ў вёсцы. Ужо вясной 1940 года ў раёне ствараюцца першыя калгасы. На 1 чэрвеня 1941 года на Лідчыне былі арганізаваны наступныя калгасы: „Чырвоны Сялец" (Неманскі сельсавет), імя Молатава (Бердаўскі сельсавет), імя Сталіна (Вяліка-Ольжаўскі сельсавет), імя Леніна, імя Сталіна, „17 верасня" (Ганчарскі сельсавет), імя Варашылава (Аполінскі сельсавет), „17 верасня" (Беліцкі сельсавет), „Камсамолец" (Нецецкі сельсавет). У сярэднім гэта былі невялікія па колькасці членаў сельгасарцелі. Калі ўзяць граніцы цяперашняга Лідскага раёна, сюды трэба прыбавіць калгас імя Леніна Ходараўскага сельсавета і імя Молатава Голдаўскага сельсавета.[9]

Усяго на 1 чэрвеня 1941 года на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі было створана 1115 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 48950 сялянскіх гаспадарак. У дапамогу сельскай гаспадарцы была створана 101 МТС з паркам 950 трактараў і іншых сельскагаспадарчых машын.

У заходніх абласцях БССР да вайны было 28 саўгасаў, у тым ліку саўгасы „Малое Мажэйкава" і „Тарнова". Вось адзін з архіўных дакументаў: „Лідскі раённы выканаўчы камітэт ад 27 сакавіка 1940 года. Аб арганізацыі племсаўгаса ў былым маёнтку „Тарнова". У мэтах павышэння прадукцыйнасці жывёлы ў раёне і паляпшэння яе ў пародных адносінах, улічваючы наяўнасць у былым памешчыцкім маёнтку „Тарнова" буйнай рагатай жывёлы галандскай пароды – 100 галоў, коней – 33, свіней 150, авечак – 200, пчол – 300 сем'яў, ворыўнай зямлі – 1009 га, садоў – 16 і розных 50 гектараў і дастатковай колькасці жылых і вытворчых памяшканняў, жылых дамоў на 48 кватэр, жывёльны двор на 150 галоў і наяўнасць паблізу маёнтка жывёльнага пасева зямель былых асаднікаў – пасяджэнне Лідскага райвыканкама пастанаўляе: прасіць аблвыканком і СНК БССР арганізаваць на базе былога памешчыцкага маёнтка „Тарнова" племсаўгас буйнай рагатай жывёлы.[10]

Між тым, у гэты перыяд было шэраг парушэнняў агульначалавечых норм жыцця. Па-першае, нічым не апраўдана дэпартацыя людзей з заходніх абласцей, у тым ліку і з Лідчыны, у аддаленыя раёны. Па-другое, пры нацыяналізацыі былі канфіскаваны малыя прадпрыемствы: млыны, воўначасалкі, тартакі, пабудовы і г. д.

Хаця трэба мець на ўвазе, што такія заваёвы сацыялізма, як ліквідацыя беспрацоўя, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, адукацыя і многа іншае было ўспрынята людзьмі вельмі радасна.

---

[1] Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук № 1. Мн.: 1969, стр. 63.

[2] Полымя: верасень, Мн.: 1979, стр. 147.

[3] Лида. Историко-экономический очерк. Мн.: 1976, стр. 52.

[4] Народное (национальное) собрание Западной Белоруссии. Стенографический отчет. Мн.: 1946, стр. 57, 174.

[5] „Чырвоная змена" ад 22 кастрычніка 1939 г.

[6] „Уперад" ад 16 чэрвеня 1967 г.

[7] „Советская Белоруссия" ад 5 кастрычніка 1939 г.

[8] Лида. Историко-экономический очерк. Изд. 2-ое, переработанное и дополненное. Мн.: 1980, стр. 30.

[9] Партыйны архіў Інстытута гісторыі партыі пры ЦККПБ ф. 4, воп. 28, стр. 972, л. 8.

[10] Партыйны архіў Інстытута гісторыі партыі пры ЦККПБ ф. 4, воп. 28, стр. 490, л. 7.

[11] З верасня 1939г – па 22 чэрвеня 1941 г. па Гродзенскай вобласці была рэпрэсіравана 31 тысяча чалавек, з іх на 1 ліпеня 1993 г. 17 тыс. чалавек рэабілітаваны.

Жыццё і дзейнасць Вацлава Іваноўскага

Ю. Туронак,
г. Варшава.

Вацлаў Іваноўскі нарадзіўся 7 чэрвеня 1880 года ў маёнтку Лябёдка Стара-Васілішкаўскай гміны Лідскага павета Віленскай губерні ў сям'і багатага беларускага шляхціча. У 1899 годзе скончыў 5-ю Класічную гімназію ў Варшаве. Восенню таго ж года пачаў заняткі на аддзяленні хіміі Тэхналагічнага Інстытута ў Пецярбурзе, які скончыў у 1904 годзе, атрымаўшы дыплом інжынера-тэхнолага. Па заканчэнні паслядыпломнай практыкі на цукровым заводзе ў Баранавічках пад Полацкам у студзені 1905 года пачаў навуковую дзейнасць у якасці асістэнта на кафедры тэхналогіі харчовых прадуктаў Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Дадатковую адукацыю набыў у па палітэхніцы ў Мюнхене, дзе ў 1909 годзе атрымаў званне доктара тэхнічных навук на аснове працы, прысвечанай вынікам даследаванняў цукровых буракоў у Віленскай губерні. Вынікі гэтых даследаванняў былі апублікаваны ў „Известиях технологического института", часопісе „Опытной агрономии" а таксама ў варшаўскай „Цукровавытворчай газеце".

У 1909–1913 гадах Вацлаў Іваноўскі займаецца навуковай даследнай работай у Пецярбурзе ў якасці дацэнта ў тэхналагічным інстытуце і выкладчыка ферменталогіі на Вышэйшых жаночых палітэхнічных курсах. Адначасова працуе ў якасці старшага кансультанта па пытаннях перапрацоўкі агародніны і садавіны пры Міністэрстве сельскай гаспадаркі. Выдавецтвам гэтага Міністэрства ў 1912 годзе была выдадзена ў Пецярбурзе яго першая кніга „Вынікі выпрабавання пладовых і гароднінных сушылак".

У студэнцкія гады В. Іваноўскі пачаў дзейнасць на ніве беларускага адраджэння, якая побач з хіміяй стала другім яго жыццёвым захапленнем. Арганізуе першыя беларускія арганізацыі асветы, абуджае творчую ініцыятыву сярод беларускай моладзі, якая навучаецца ў Пецярбурзе, бывае частым госцем у польскім Саюзе прагрэсіўнай моладзі, садзейнічае справе паяднання двух народаў. Асаблівую ўвагу звяртае пры гэтым на дзейнасць выдавецтва, нягледзячы на поўную забарону царскім законам друкавання на беларускай мове. Пасля рэвалюцыі 1905 года арганізуе першае легальнае беларускае выдавецкае таварыства, якім кіруе сем гадоў. Рознабаковая грамадская работа прымусіла В. Іваноўскага адысці ад далейшай навуковай дзейнасці ў сталіцы Расіі. У сярэдзіне 1913 года едзе ў Вільню, дзе становіцца кіраўніком прамыслова-гандлёвага аддзела Віленскага сялянскага таварыства і адначасова старшынёй зноўку створанага Беларускага выдавецкага таварыства.

У сакавіку 1915 года В. Іваноўскі становіцца старшынёй Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны, а восенню таго ж года арганізуе эвакуацыю людзей у Расію. Спачатку знаходзіцца ў Арле і працуе ў ваеннай прамысловасці, а восенню 1916 года едзе ў Петраград, дзе становіцца прадстаўніком Міністэрства сельскай гаспадаркі па справах забеспячэння фабрык сельгасабсталяваннем. Тут таксама кіруе дзейнасцю камітэта, клапоціцца аб лёсе бежанцаў. У бурлівыя гады 1917–1920 гг. В. Іваноўскі ўдзельнічае ў беларускім палітычным жыцці, лавіруючы паміж нацыянальнай праграмай бальшавікоў і федэралістычнай дэкларацыяй Пілсудскага. У 1918 годзе выконвае абавязкі рэктара Мінскага педагагічнага інстытута і міністра асветы ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі, а пасля гэтага працуе ў аддзеле асветы Літоўска-Беларускай Савецкай Рэспублікі, а у чэрвені 1920 года ўваходзіць у склад урада Сярэдняй Літвы, у якім кіруе аддзелам забеспячэння.

Пасля паражэння федэралістычных тэндэнцый у студзені 1921 года В. Іваноўскі выходзіць з урада Сярэдняй Літвы і палітычнага жыцця наогул. У хуткім часе запрашаецца для работы ў Варшаўскую Палітэхніку ў якасці надзвычайнага прафесара па кантракту, дзе ў пачатку 1922 года ўзначаліў кафедру і аддзел тэхналогіі

ферментацыі і харчавання, якімі кіруе ўвесь міжваенны перыяд. Акрамя гэтага, выкладаў хімію на аддзяленні механікі. 4 ліпеня 1924 года атрымаў назначэнне надзвычайным прафесарам, а 1 верасня 1925 года – звычайнага прафесара. У 1930–33 гг. займаў пасаду дэкана аддзялення хіміі, а ў 1935-37 гг. – кіраўнік ваеннага навучання.

Даследаванні, якія праводзіў прафесар Вацлаў Іваноўскі ў аддзеле тэхналогіі ферментацыі і харчавання ахоплівалі, галоўным чынам, пытанні перапрацоўкі гародніны і садавіны, хлебапячэння і малакавытворчасці, вытворчасці і выкарыстання спіртавых сумесей, імпрэгнацыі драўніны і, нарэшце, ачысткі і выкарыстання фабрычных пасляцэлюлозных сцёкаў. Вынікі гэтых даследаванняў былі апублікаваны ў прафесійнай перыёдыцы краіны („Химическая промышленность", „Химическое обозрение", „Ежегодник химии", „Сельскохозяйственная промышленность" і інш.) і за мяжой.

Варта таксама назваць падручнік па перапрацоўцы гародніны і садавіны, апрацаваны прафесарамі В. Іваноўскім і Н. Мерынгам, першае выданне якога выйшла ў 1923 годзе, а другое – у 1924 годзе.

У якасці вядучага эксперта тэхналагічных навук прафесар В. Іваноўскі прадстаўляў Польшчу на Міжнароднай канферэнцыі па пытанню стандартызацыі аналізаў харчавання ў Парыжы (1929), а таксама на Міжнародным кангрэсе малочнай вытворчасці ў Капенгагене (1931 г.).

Значэнне даследчых прац прафесара Іваноўскага заключалася ў паслядоўным імкненні ўкаранення іх вынікаў у практычную дзейнасць польскай прамысловасці. Быў стваральнікам 7-мі патэнтаў, прадстаўленых Бюро патэнтаў Р. П.

Такое накіраванне навуковай работы прадпрыемства і яго кіраўніка садзейнічала развіццю сувязей і супрацоўніцтва з прамысловасцю.

Гэтыя сувязі прафесар Вацлаў Іваноўскі выкарыстоўваў таксама для канцэнтравання сродкаў на будаўніцтва новых будынкаў Варшаўскай палітэхнікі – хімічнай тэхналогіі і электратэхнікі, якія былі пабудаваны з 1928 года аб'яднаннем „Тэхналагічнае навучанне". Быў ён пастаянным сакратаром тэхналагічнай камісіі гэтага аб'яднання, а таксама кіраўніком праектных работ новых лабараторый у будынку хімічнай тэхналогіі.

У 20-х гадах аднавіў разбураныя ў час 1-ай сусветнай вайны агародніцкія і садаводніцкія гаспадаркі ў Баярах, якія належалі маёнтку Лябёдка. Яны сталі цэнтрам культуры, дамінуючым у навакольлі.

Прафесар В. Іваноўскі быў шматгадовым куратарам інстытуцкіх

таварыстваў „Гурток Вільнян", „Гурток зямлі Навагрудскай". Быў вялікім сябрам моладзі, любімцам студэнтаў. Для дыпламантаў знаходзіў субсідыі з ферментатыўна-харчовай прамысловасці і аказваў дапамогу ў атрыманні работы. Як гуманіст і дэмакрат быў талерантным да палітычных перакананняў студэнтаў. Красамоўным выражэннем павагі прафесару В. Іваноўскаму стаў арганізаваны 11 кастрычніка 1979 года ў Варшаўскай рэзідэнцыі НОТ вечар, прысвечаны памяці прафесара з удзелам дзесяткаў яго вучняў.

У верасні 1939 года прафесар В. Іваноўскі пакінуў Варшаву перад яе акружэннем нямецкімі войскамі. Рашыў, што перад тварам вялікай вайны яго месца ў Беларусі. Прыбыў у Вільню, дзе да чэрвеня 1941 года быў кіраўніком кафедры хімічнай тэхналогіі Віленскага ўніверсітэта.

Правал нямецкага наступлення пад Масквой схіліў прафесара В. Іваноўскага ў канцы 1941 года да выезду ў Менск. У хуткім часе ён стаў бургамістрам гэтага горада, прадпрымаючы адначасова канспіратыўную палітычную дзейнасць, імкнучыся стварыць незалежную беларускую дзяржаву. Разлічваў пры гэтым на супрацоўніцтва польскага эміграцыйнага ўрада і яго мясцовых улад. Быў ініцыятарам перамоў з галоўным камандаваннем Арміі Краёвай. У гэтай дзейнасці меў у Менску не толькі памочнікаў, але і ворагаў, якія абвінавачвалі яго ў гестапа за прапольскую дзейнасць.

Памёр В. Іваноўскі 7 снежня 1943 года з прычыны ран, атрыманых у замаху, здзейсненым яго палітычнымі праціўнікамі. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках у Менску.

За што змагаліся акоўцы!

М. В. Васілючак
г. Гродна

Пра Армію Краёву раней не пісалі, ды і гаварыць асцярагаліся. Архіўныя матэрыялы былі для простага даследчыка забаронены, імі маглі карыстацца ў службовым парадку работнікі камітэта дзяржаўнай бяспекі, ды вышэйшыя начальнікі. Гэта тэма была забаронена для масавага чытача. Але мяняецца час, мяняюцца і тыя забароны, якія да гэтага існавалі на дзейнасць Арміі Краёвай у гады Айчыннай вайны.

Армія Краёва? Чыі інтарэсы яна абараняла? За што змагаліся акаўцы, не шкадуючы свайго здароўя і жыцця?

Пасля акупацыі немцамі Польшчы ў 1939 годзе за мяжой, спачатку ў Францыі, потым у Лондане быў сфарміраваны польска-эміграц-

цкі ўрад на чале з генералам Сікорскім. Пад яго кіраўніцтвам на акупаванай тэрыторыі пачалася работа па стварэнню польскага Руху Супраціўлення, у рамках якога дзейнічала Армія Краёва. У Прынямонне былі накіраваны вопытныя кадры для разгортвання тут польскага партызанскага руху. Трэба падкрэсліць, што Заходнюю Беларусь польскі эміграцыйны ўрад і Армія Краёва разглядалі як састаўную частку Польшчы. Значную ролю ў стварэнні атрадаў Арміі Краёвай у былым Навагрудскім ваяводстве, куды ўваходзіла і Лідчына, іграў афіцэр польскай арміі, а затым Арміі Краёвай Януш Праўдзіц-Шляскі. Першыя атрады (батальёны) АК на тэрыторыі Беларусі паявіліся ў канцы 1942 года. А колькасны асабовы склад акоўскіх атрадаў у Навагрудскай акрузе ў чэрвені 1944 года дасягаў 7,7 тысяч чалавек, у Лідскай акрузе – 6,5 тысяч чалавек.[1] Трэба зрабіць заўвагу, што ў гэтых акругах польскімі ўладамі была праведзена мабілізацыя мужчын у АК, прытым са згоды нямецкіх улад.

На першых парах АК мела някепскія адносіны з савецкімі партызанамі, але, на жаль, яны хутка перараслі ў сутычкі і крывавыя бойкі. Адной з прычын такіх паводзін беларускіх партызан і акоўцаў было тэрытарыяльнае пытанне. Польскі эміграцыйны ўрад і АК найвышэйшай мэтай лічылі далучыць Заходнюю Беларусь да Польшчы, што азначала аднавіць тэрыторыю Польшчы ў граніцах да 1939 года. Другімі словамі, амаль палова тэрыторыі і насельніцтва Беларусі павінны быць у межах польскай дзяржавы. Вядома, з гэтым не маглі мірыцца беларусы пасля ўз'яднання ў вераснёўскія дні 1939 года з Савецкай Беларуссю. Гэтыя супярэчнасці ўзмацніліся восенню 1943 года, пасля вядомага ліста ЦК КП(б)Б абкомам партыі „Аб ваенна-палітычных задачах у заходніх абласцях Беларусі". У гэтым лісце, у прыватнасці, былі сфармуляваны наступныя вызначэнні:

1. „Заходнія вобласці Савецкай Беларусі з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускай рэспублікі. На яе тэрыторыі, акупаванай Германіяй, дазваляецца дзейнасць толькі тых груп, арганізацый і атрадаў, якія кіруюцца інтарэсамі СССР.

2. Існаванне разнастайных арганізацый, якімі кіруюць польскія буржуазна-нацыяналістычныя цэнтры, трэба разглядаць як незаконнае ўмяшанне ў інтарэсы нашай айчыны.

3. Нашай найпершай задачай з'яўляецца як мага шырэйшае развіццё савецкага партызанскага руху, далучэнне да яго ўсіх слаёў насельніцтва, у тым ліку і палякаў. Атрады і групы, створаныя польскімі рэакцыйнымі нацыяналістычнымі коламі, неабходна ізаляваць ад насельніцтва шляхам стварэння сярод польскіх працоўных савецкіх атрадаў і партызанскіх груп.

4. Неабходна ўсялякімі сродкамі весці барацьбу супраць польскіх буржуазна-нацыяналістычных атрадаў і груп".[2]

Супярэчнасці паміж беларускімі партызанамі і АК скарысталі немцы. Яны аказалі АК дапамогу ў зброі і тыя з канца 1943 года да канца акупацыі супрацоўнічалі з фашыстамі. Так, камандзір Стаўбцоўскай групоўкі АК у Навагрудскай акрузе капітан Адольф Пільх заключыў з немцамі дагавор і да канца акупацыі ад іх атрымліваў зброю і амуніцыю. Такім жа чынам паступіў камандзір Прынёманскай групоўкі ў Лідзе паручнік Юзаф Свіда, які на працягу студзеня, лютага і сакавіка 1944 г. атрымаў ад немцаў пяць абозаў зброі.[3]

Невыпадкова на пачатку 1944 г. на Лідчыне нямецка-акупацыйная адміністрацыя пакінула свае воласці і іх месцы занялі акоўцы, якія ўжо адкрыта вялі ўзброеную барацьбу з беларускімі партызанамі. Армія Краёва кватаравалася ў многіх населеных пунктах Лідчыны, у тым ліку ў Дакудаве, Беліцы, Сцеркаве, Няцечы, а ў Табале знаходзіўся штаб акругі АК. Вельмі шмат гора прынёс працоўным Лідчыны кіраўнік батальёна АК, былы польскі афіцэр Заянчкоўскі, па мянушцы Рагнер.[4]

Здаецца дзівосным, але гэта факт, што мне і маім аднавяскоўцам у першай палове 1944 года не менш 3-4 разоў прыйшлося шукаць ратунку ад акаўцаў у нямецкім гарнізоне, які ахоўваў чыгуначны мост на р. Жыжме. Звычайна АК паяўляўся ў нас з Сонтак Ліпнішкоўскіх альбо Бялундзяў. Рабавалі насельніцтва, забіралі маёмасць у сялян і калі паяўляліся 2-3 чалавекі немцаў з Жыжэмскага гарнізона, акоўцы іх не чапалі, хоць іх было 50-70 чалавек, а па загаду нямецкіх фашыстаў пераставалі рабаваць насельніцтва і ўязджалі. Неверагодна, але факт. Добра памятаю вясну 1944 года. Я дапамагаў бацькам саджаць бульбу. У гэты час каля нас прайшлі два партызаны: Кель Уладзімір Іосіпавіч, актыўны барацьбіт за савецкую ўладу, дэпутат Баранавіцкага аблсавета і другі партызан, таксама мясцовы жыхар. Яны ішлі ў раён вёсак Мяляшы–Такары. У гэты момант з'явіліся на конях акоўцы, схапілі гэтых партызан і завялі ў свой штаб, які размяшчаўся ў Сонтаках і пасля катавання і здзекаў іх расстралялі.[5] Ёсць сведкі, якія не толькі чулі пра падзеі тых дзён, але і бачылі, як акоўцы „змагаліся" з немцамі. Згодна афіцыйных даных АК па Навагрудскай акрузе, яны ў гады вайны правялі 158 баёў, у тым ліку з „савецкімі бандытамі" – 83. Атрымоўваецца, што з немцамі яны правялі 75 баёў.[6]

Аб адным з баёў партызан Лідскай зоны сведчыць справаздача камандавання брыгады: „5 сакавіка 1944 года партызанскі атрад „Іскра" у складзе 135 чалавек у саставе Кіраўскай брыгады правёў аперацыю па ліквідацыі белапольскіх банд у Лідскім раёне Баранавіцкай вобласці. У выніку адбыўшагася боя ў раёне вёсак Боркі – Філонаўцы было забіта 9 і ранена 7 белапалякаў. Астатнія разбег-

ліся.[7] А такіх баёў у Прынёманні ў гады Вялікай Айчыннай вайны паміж савецкімі партызанамі і Арміяй Краёвай адбылося не адзін дзесятак. І гінулі хлопцы за чужыя інтарэсы, за інтарэсы Лонданскага польскага ўрада, які хацеў аднавіць Рэч Паспалітую ў тэрытарыяльных межах 1939 года.

Напярэдадні адыходу нямецкай арміі акоўцы нямала знішчылі патэнцыяльных праціўнікаў аднаўлення польскай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Паводле даных атрад Пільха на Навагрудчыне з снежня 1943 года да канца чэрвеня 1944 года знішчыў 6 тысяч „бальшавікоў". Вядома, што большая частка гэта былі мірныя беларусія жыхары. У гэты перыяд на Лідчыне ад рук акоўцаў загінула нямала мірных працаўнікоў горада і сяла. Шмат забойстваў адбылося ў Зблянах, Ямантах, Сяльцы, Навасадах, Табале, Сліжах, Ельні, Дзітрыках і іншых населеных пунктах Лідчыны. Так, у Зблянах былі расстраляны акоўцамі сям'і Місюкевічаў і Майсевічаў за тое, што сябры Саша Місюкевіч і Ваня Майсевіч у студзені 1944 года пайшлі ў партызаны, у Ямантах былі забіты АК – Дзям'ян Чэх, Паліна Ямяльянчык і яе сын Сцяпан, Васіль Васілевіч, яго трынаццацігадовы сын і трохгадовая дачурка (а ўсяго ў Ямантах былі знішчаны 15 сялян), у Навасадах у настаўніцы Анастасіі Макарэвіч акоўцы забілі трох маленькіх дзяцей, аднаго ў калысцы. Макарэвіч у гэты час дома не аказалася.

У Сліжах акоўцамі былі забіты Ігнась, Мікалай і Андрэй Ігнатовічы. Па няпоўных даных на Лідчыне АК было забіта 1200 мірных жыхароў.[8]

Так дзейнічалі акоўцы ў акупацыйны перыяд. А як адбываліся падзеі на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў? Армія Краёва ўжо адкрыта вяла барацьбу з савецкай уладай і працягвала ліцца кроў людская. Было гэта ў канцы ліпеня 1944 года. Былы партызанскі сувязны Астрэйка Міхаіл Васільявіч з хутара Вострава вяртаўся да дому, пры сустрэчы акоўцы забілі яго і цела кінулі ў раку Жыжма.[9]

Пасля выгнання нямецкіх акупантаў на тэрыторыі Прынямоння яшчэ некаторы час дзейнічалі атрады АК, якія тэрарызавалі мясцовае насельніцтва, распраўляліся з партыйнымі, савецкімі работнікамі і актывістамі. Так, на тэрыторыі Лідчыны за перыяд са жніўня 1944 года па чэрвень 1945 года ахвярамі ўзброеных нацыяналістычных банд сталі 112 чалавек, у тым ліку 28 раённых работнікаў, 10 старшынь сельскіх Саветаў, 27 дэпутатаў і ўпаўнаважаных.[10] Не менш ахвяр было і ў суседніх раёнах. Так, на Іўеўшчыне за першыя 6 месяцаў пасля вызвалення было забіта 32 чалавекі з ліку работнікаў і сем'яў актывістаў.

Вось скупыя архіўныя старонкі з Іўеўскага раёна праз паўтара года (пасля заканчэння вайны: „18 снежня 1946 года былі зверскі забіты бандыцкай групай старшыня Некрашанскага сельскага

Савета Глебаў і працаваўшы ў гэтым сельсавеце ўпаўнаважаны РККП(б)Б т. Ізмайлаў".[11]

І вось сёння знайшліся „абаронцы" дзеянняў Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі ў гады нямецкай акупацыі. Але гістарычныя факты і жывыя сведкі тых падзей пацвярджаюць, даказваюць, што АК, якая дзейнічала сярод нас, беларусаў, была супраць нас, супраць цэласнасці нашай тэрыторыі, па сутнасці, супраць беларускай дзяржаўнасці.

---

[1] Юры Туронак. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн.: „Беларусь", 1993. с. 173, 174.

[2] Юры Туронак. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн.: „Беларусь", 1993. С. 101-102.

[3] Там жа. С. 170.

[4] Газета „Звязда" 11 лютага, 1993 г.

[5] Іўе. Гісторыка-эканамічны нарыс. Мн. „Беларусь", 1991. С. 124-125.

[6] Газета „Советская Белоруссия" 13 февраля 1993 г.

[7] Партыйны архіў Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ фонд 3617, воп. 1. справ. 8 л. 85.

[9] Газета „Гродненская правда" ад 17 мая 1974.

[10] Партыйны архіў Гродзенскага АККПБ, фонд 4, вопісь 1, спр. 42, л. 19.

[11] Іўе. Гісторыка-эканамічны нарыс. Мн. „Беларусь", 1991, л. 74.

[12] Партыйны архіў Гродзенскага АККПБ, фонд 2460, вопісь 1, справа 19, л. 321.

Беларускія святары Гарадзеншчыны

Янка ТРАЦЯК
г. Гродна

Уздым нацыянальнага адраджэння на Беларусі напачатку 20 стагоддзя даў нашаму краю шматтысячную грамаду дзеячаў нацыянальнае думкі. І сярод іх асаблівай увагі заслугоўваюць беларускія святары, без якіх немагчыма ўявіць працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці нашага народу, бо ўклад іх у гэты працэс невымераны. Так, гэта яны ўнаследавалі святыя традыцыі заступнікаў беларускага народу Еўфрасіні Полацкай і Кірылы Тураўскага

і, натхнёныя творчасцю Францішка Багушэвіча і дзейнасцю прафесара Пецярбургскай каталіцкай духоўнай акадэміі Браніслава Эпімах Шыпілы, сталі ля вытокаў духоўнага адраджэння. Менавіта яны неслі свайму народу Слова Божае ў зразумелай ім мове, бо як і Вялікія Апосталы, як і Францыск Скарына, добра ведалі вартасць гэтага слова, роднага слова. І тым ратавалі душу беларускага народу, яе самабытнасць, і тонкую духоўнасць ад смерці, пасля якой немагчыма ўваскрашэнне.

І сярод гэтых людзей шмат было святароў з Гарадзеншчыны.

Да старэйшага пакалення такіх дзеячаў можна аднесці Адама Лісоўскага, Аляксандра Астрамовіча, Янку Семашкевіча. Менавіта яны былі першымі нацыянальна свядомымі святарамі з Гарадзеншчыны і, вядома, былі першымі такімі святарамі са сваёй мясцовасці. Іх выбар – служыць Богу і арыентацыя на беларускасць была падхоплена іншымі і ў першую чаргу тымі, хто іх добра ведаў, хто верыў ім і паважаў іх, каму яны былі прыкладам. Такое магло быць на іх радзіме і там, дзе яны працавалі. Так узнікла ў такой мясцовасці добрая і слаўная традыцыя „вучыцца на ксяндза". Да прыкладу: на радзіме Адама Лісоўскага (былы Ашмянскі павет, Крэўскае гміны, цяпер Смаргонскі р-н, Ардашынскі с/савет) добра ведаюць такіх беларускіх дзеячаў і святароў на роднай ніве як Францішак Чарняўскі, Адам Станкевіч, Уладыслаў Чарняўскі. Добрым словам адклікаюцца людзі пра тых, хто маліўся „па-простаму". Але, менавіта, Адам Лісоўскі шмат каму на сваёй радзіме дапамог зразумець пачуццё нацыянальнай годнасці і патрэбы нацыянальнага абуджэння. Удзячны яму за гэта і Адам Станкевіч і Аляксандр Астрамовіч.

Адама Лісоўскага па праву лічылі „хрышчоным бацькам беларускім"! Нарадзіўся ён 6 студзеня 1882 года ў в. Каранды. Навуку праходзіў у Віленскай духоўнай семінарыі, у духоўнай акадэміі ў Пецярбурзе, у Інсбруку і Мюнхене. Займаў розныя касцельныя пасады на абшарах Расеі і Беларусі. Апроч беларускамоўных казанняў і прапаганды роднага слова сярод насельніцтва Адам Лісоўскі пераклаў на беларускую мову наступныя часткі Новага Закону: Апакаліпсіс, Апостальскія Дзеі, Лісты св. Паўла да Рымлян, да Галатаў, да Карынтаў.

Памёр 9 кастрычніка 1929 года. Пахаваны ў Кляшчэлях (Бельскі пав.)

Францішак Чарняўскі, нарадзіўся 17 лістапада 1893 года ў в. Чухны, што ў двух кіламетрах ад Карандоў. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Працаваў у Сухаволі, Саколцы, Кузьніцы. Далейшую вучобу праходзіў у Рыме ў „Грыгорыянуме", а затым

перавёўся ва Ўсходні Папскі інстытут, які скончыў са ступеняй магістра. Працаваў у Вільні, а з 1929 года ў Францыі, Бельгіі, ЗША. У Бельгіі выдаваў часопіс „Божае слова", выйшла ўсіх 176 нумароў. У ЗША рэдагаваў часопіс „Сейбіт". Змест яго быў рэлігійна-патрыятычны. Апроч гэтага Францішак Чарняўскі займаўся выдавецкай дзейнасцю. Памёр 31.05.1979г. у ЗША.

Адам Станкевіч – беларускі дзеяч, без якога немагчыма ўявіць адраджэнскі рух. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў БХД, затым Беларускага Нацыянальнага Аб'яднання (БНА), шматгадовы рэдактар „Беларускай крыніцы" і „Хрысьціянскай Думкі", заснавальнік друкарні Францыска Скарыны, аўтар дзесяткаў кніг, брашур, прадмоў, артыкулаў...

„Адам Станкевіч, – піша Язэп Найдзюк, – быў тым кардынальным, арганізацыйным цэнтрам усяго культурнага жыцця ў міжваенны час, адкуль ішоў жывы імпульс адраджэння нацыянальнай сьвядомасці народу"[2]

Адам Станкевіч скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю (1914) і духоўную акадэмію ў Пецярбурзе (1918). Жыў і працаваў пераважна ў Вільні. Адам Станкевіч быў абаронцам усяго, што праяўляла свае нацыянальныя рысы, што імкнулася да жыцця, да сцвярджэння сябе, каб „вольны стаў з вольным". Пра гэта яскрава сведчаць яго выступленні супраць палітыкі паланізацыі, яго клопаты аб пашырэнні ўніі на Беларусі, яго падтрымка і дапамога праваслаўным беларусам, яго вечныя хваляванні пра лёс беларусаў на Віленшчыне, пра каталіцка-касцельныя справы ў Беларусі. У 1949 г. Адама Станкевіча засудзілі на 25 гадоў лагераў. Нарадзіўся Адам Станкевіч 24.12.1891 г. у в. Арляняты, якая знаходзіцца ў трох кіламетрах ад роднай вёскі Адама Лісоўскага. Памёр з 29 на 30 лістапада 1949 года. Апошнім прытулкам беларускаму святару стала Тайшэцкая зямля.

Уладыслаў Чарняўскі – адзіны беларускі святар, які пранёс эстафету беларускасці ў святынях ад сваіх землякоў і настаўнікаў да сённяшніх дзён. Нарадзіўся ён 14.01.1916 г., у засценку Амбружына, што каля Гальшан, але вучыўся хадзіць і ўсё маленства прайшло ў в. Біцяняты, якая знаходзіцца ў двух кіламетрах ад Арлянятаў і Карандоў. Вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі. Працаваў на Літве. У 1954 годзе перавёўся ў м. Вішнева, што на Валожыншчыне, дзе працуе і па сённяшні дзень. У 1967 годзе па запрашэнню Ватыкана а. Уладыслаў наведаў Рым і атрымаў назначэнне на сан біскупа Беларусі, але рэлігійныя ўлады не падтрымалі ні ў Варшаве, ні ў Маскве адзіную кандыдатуру беларускага святара.

Уладыслаў Чарняўскі пераклаў на родную мову Літургічныя чытанні на круглы год (усіх 7 тамоў), Імшал, Чытанкі на травень і чэрвень месяцы, Катэхізмоўку, падрыхтаваны да друку Біблія –

Стары і Новы Закон (пераклады зацверджаны Папам Рымскім).[3]

У адлегласці 12 кіламетраў ад вышэй згаданага гнязда святароў знаходзіцца вёска Навасады, у якой у 1878 годзе, 26 лістапада нарадзіўся будучы беларускі святар і паэт **Аляксандр Астрамовіч.** Літаратурны псеўданім – Андрэй Зязюля. Скончыў Пецярбургскую каталіцкую духоўную семінарыю (1910) і ў гэтым годзе быў пасвечаны на святара. Працаваў у Ракаве, Ганнаполі, што пад Менскам, Смілавічах (Ігуменскі павет), Рубяжэвічах (Стаўпецкі пав.), у Абольцах і Сенна (Магілёўская губ.). А. Астрамовіч быў блізкім сябрам і земляком Адама Лісоўскага. Менавіта дзякуючы яму ён пазнаёміўся з творчасцю Францішка Багушэвіча, пад уздзеяннем якога пачаў пісаць вершы на беларускай мове. Першы верш Андрэй Зязюля надрукаваў у „Нашай Ніве" у 1910 г. Выйшлі асобныя яго кніжкі: „З роднага загону" (1913), „Слова праўды" (1917), „Аленчына вяселле" (1922).

„Зязюля – гэта праўдзівы ідэаліст, гэта мучанік за родную ідэю, – піша Адам Станкевіч у прадмове да зборніка паэта. – Гнаны польскай духоўнай уладай за сваю беларускасць з парафіі ў парафію, а часта і цалкам пазбаўлены за гэта пасады, туляўся бяздомны па шырокай Беларусі"[4]

Памёр Аляксандр Астрамовіч 17.01.1921 года ў Сенна, дзе і пахаваны.

Усяго два кіламетры раздзяляюць родную вёску Астрамовіча на Ашмяншчыне ад славутых Гальшан, ад тых Гальшан, пра якія так шмат гаварыў **Язэп Германовіч,** – беларускі святар і паэт Вінцук Адважны. Нарадзіўся ён тут 4.03.1890 года. У 1902 годзе ідзе вучыцца ў гарадскую школку ў Ашмяны, дзе ўпершыню праз беларускага святара Гуневіча пазнаёміўся з „Дудкай Беларускай" Францішка Багушэвіча. У 1913 годзе скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю і быў пасвечаны на святара. Душпастарскую працу праводзіў ў Польшчы, Слонімскім павеце, Друйскім доме айцоў Марыянаў, Харбіне, Вільні і пасля разгону айцоў Марыянаў – ізноў у Харбіне. У 1948 годзе, выдадзены кітайскімі камуністамі ў рукі бальшавікоў, быў засуджаны на 25 гадоў. Пра сталінскія лагеры апісаў у кнізе „Кітай – Сібір – Масква" (1962, Мюнхен). Пасля смерці Сталіна быў рэабілітаваны, але вярнуцца на Радзіму дазволу не атрымаў. Выехаў у Польшчу (1955), затым Рым, ЗША, Аўстралія, Новая Зеландыя, Англія.

Першы верш быў надрукаваны ў „Крыніцы" (1919) пад псеўданімам Хлопчык з-пад Горадні. Творчая спадчына Язэпа Германовіча багатая і разнастайная. Гэта каля 11 кніг і сотні артыкулаў, баек, успамінаў, роздумаў у часопісах і газетах. Памёр Язэп Германовіч 26 снежня 1978 года ў Марыян Гаўзе (Лондан).

Ксёндз Ян Вярсоцкі таксама быў родам з Гальшан. Быў ён блізкім сябрам Язэпа Германовіча і Адама Станкевіча. З апошнім вёў

ліставанне. У 1920 гадах працаваў у Савецкай Беларусі, дзе і быў арыштаваны. Пакаранне адбываў на Салаўках, а ў 1930 гадах быў вывезены ў Казахстан, недалёка каля Караганды, на пасяленне. Там, па ўсёй верагоднасці, і памёр. Адам Станкевіч уключае яго ў спісак, складзены ў 1940-ых гадах, пакойных беларускіх святароў.[5]

Янка Семашкевіч – вядомы паэт і байкапісец Янка Быліна нарадзіўся ў 1883 годзе на Астравеччыне. Скончыў Віленскую каталіцкую духоўную семінарыю. Працаваў на Віленшчыне ў розных парафіях. Вельмі шмат пісаў. Асобнымі кніжкамі выйшлі творы рэлігійнага зместу: „Ружанец да Найсьвяцейшае Дзевы Марыі" (1928 г., Вільня), „Песьні жальбы або набожныя разважаньні аб муках і сьмерці збаўцы нашага Езуса Хрыста" (1929 г., Вільня), „Дарога крыжа" (1930 г., Вільня), зб. вершаў „На прызьбе". Апроч гэтага некалькі дзесяткаў рэлігійных гімнаў, вершаў, баек, артыкулаў было змешчана на старонках тагачаснага друку. Памёр на Радзіме ў 1955 годзе.

Астравеччына дала нашаму народу яшчэ аднаго цудоўнага беларускага святара і паэта **Канстанціна Стэповіча.** Літаратурны псеўданім – Казімір Сваяк. Нарадзіўся ён 19.02.1890 г. у в. Барані. Выпускнік каталіцкай духоўнай семінарыі ў Пецярбурзе. За сваю беларускую дзейнасць праследаваўся польскімі рэлігійнымі ўладамі, пераводзіўся з парафіі ў парафію нягледзячы на заступніцтва і прашэнні вернікаў. У апошніх лістах да Адама Станкевіча цяжка хворы ён пісаў, каб „сярод сваіх мог дажыць кароткі свой дзянёк" і каб над ім „не было дзярно чужое".[6] 6.05.1926 г. Казімір Сваяк памёр. Пахаваны ў Вільні.

Яго таленавітаму пяру належаць наступныя кнігі: „Мае думкі" (Вільня, 1914 г.), „Голас душы". Кніжка да набажэнства для беларусаў-каталікоў. (Вільня, 1926 г. Перавыдавалася ў 1934 і 1947 гадах), „Мая ліра" (1924 г., Вільня), „Дзея маёй мысьлі, сэрца і волі", (Вільня, 1932 г.).

„Усё жыццё і творства, без пары згасшага беларускага песьняра Казіміра Сваяка – гэта адно безупыннае, поўнае мукі і болю імкненьне злучыць у разумную і гарманістую цэласьць расьцярушаныя беларускія думкі, скрышыць путы няволі духа народу і даць яму вольны бег у развіцьці, згодна з прыродным законам жыцьця, асьвечанага нябесным блескам хрысьціянства"[7]. Так пісаў пра яго Адам Станкевіч.

На гэтай Гальшанскай зямлі, пра якую мы ўвесь час гаворым, убачыў божы свет і яшчэ адзін вядомы дзеяч на беларускай рэлігійнай і асветнай ніве – Віктар Шутовіч.

Віктар Шутовіч нарадзіўся 27.10.1890 года ў в. Шутавічы, што на Смаргоншчыне. Вучыўся ў духоўнай семінарыі ў Вільні і два гады ў каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбурзе (пакінуў вучобу з-за

матэрыяльных прычын). Працаваў у розных парафіях: Барадзевічы, Ліда і Трысценнае, што за Беластокам. Польскія рэлігійныя ўлады спецыяльна пераводзілі яго далей ад беларусаў, каб ён не мог займацца беларускасцю сярод сваіх людзей, бо там, „дзе расла беларускасць – гінула польскасць". У 1929 годзе Віктар Шутовіч накіроўваецца ў Амерыку „шукаць супакою для душы". Але сум па Беларусі не дае супакою. І сведчанне гэтаму – яго артыкул „Думкі ў далёкай Амерыцы аб Беларусі"[8]. У 1932 годзе ён вярнуўся і быў назначаны на вікара і школьнага прафекта ў Харошч, што знаходзіцца за Беластокам. Аб жыцці ў Харошчы святара-беларуса і адносінах да яго польскіх улад можна даведацца з яго лістоў да святара Уладыслава Талочкі: (...) Праз гэта яны (польскія ўлады – Я. Т.) мне проста гавораць: кідай беларускае і рабіся палякам, тады будзе табе магчымасьць у нас працаваць і жыць, а інакш мы табе не дадзім жыцця"[9].

З прыходам савецкай улады Віктар Шутовіч быў рэпрасаваны (1944), а вызвалены на волю быў толькі ў 1955 годзе. Памёр у Барысаве 1.03.1960 г.

Засталіся нам у спадчыну яго перакладныя кнігі на родную мову: „Кароткая гісторыя сьвятая" (1914 г.), „Маёвая чытанка" (1939 г.) і глыбока патрыятычная публіцыстыка, якая раскінута па розных часопісах і газетах.

Непасрэдным земляком а. Віктара Шутовіча быў Андрэй Цікота.

Архімандрыт Андрэй Цікота нарадзіўся 5 снежня 1891 года ў маёнтку Тупальшчына, што на Смаргоншчыне. Духоўную навуку праходзіў у каталіцкай семінарыі ў Вільні (1909–1912) і духоўнай акадэміі ў Пецярбурзе (1913–1917). Душпастарскую працу пачынаў у Маладзечне, працаваў у Менскай духоўнай семінарыі і ў Друі. У 1924 годзе быў назначаны пробашчам і суперыёрам айцоў Марыянаў у Друі.

„Друйскі кляштар айцоў Марыянаў, – піша Юры Туронак, – быў першым у гісторыі беларускім каталіцкім кляштарам – беларускім не толькі ў геаграфічным сэнсе, але і па сваёй ідэйнай накіраванасці".[10] Галоўнай жа мэтай айцоў Марыянаў было „адраджэнне духоўнага жыцця сярод беларусаў і пашырэнне царкоўнай еднасці"[11].

З 1933 па 1939 Андрэй Цікота быў прызначаны генералам айцоў Марыянаў у Рыме, а затым яго накіроўваюць у Харбін апостальскім адміністратарам грэка-каталіцкай царквы ў Мандчжурыі. Пасля яе ліквідацыі (1948) Андрэя Цікоту арыштавалі. Савецкія ўлады не раз прапаноўвалі яму высокія пасады пры праваслаўным мітрапаліце, але Андрэй Цікота ўсякі раз катэгарычна адмаўляўся ад гэтых спакус. Пасля катаванняў і здзекаў 11.02.1952 г. вязня Тайшэцкіх лагераў архімандрыда Андрэя Цікоты не стала.

Такі ж пакутніцкі лёс выпаў на долю лепшага сябра Андрэя Цікоты, першага дарадчыка і надзейнага паплечніка – беларускага святара **архімандрыда Фабіяна Абрантовіча.** Нарадзіўся ён у Навагрудку 14.09.1884 г. Вучыўся ў Пецярбурзе ў каталіцкай духоўнай семінарыі і акадэміі, дзе атрымаў ступень магістра тэалогіі. Затым скончыў Лювенскі каталіцкі ўніверсітэт са ступеняй доктара філасофіі: дысертацыя „Філасафічныя канцэпцыі Лоскага". Працаваў прафесарам у Пецярбургскай духоўнай семінарыі, быў рэктарам Менскай каталіцкай духоўнай семінарыі. Быў адзін з арганізатараў з'езду беларускага каталіцкага духавенства, прымаў актыўны ўдзел у стварэнні БХД. У 1926 годзе ўступае ў ордэн айцоў Марыянаў у Друі. А з 1928 па 1938 год быў накіраваны Папам Рымскім у Харбін для арганізацыі епархіі для грэка-каталікоў расейцаў. У 1939 годзе вярнуўся на Радзіму, дзе і быў арыштаваны бальшавікамі. Замучаны ў сталінскіх турмах. Можна смела сцвярджаць, што доктар, прафесар Фабіян Абрантовіч стаяў у вытоках адраджэння і станаўлення айчыннай філасофіі і тэалогіі. Яго шматлікія артыкулы ў друку, творы „Бог" (1928) і „Чалавек" (1929) былі толькі першымі прыступкамі да гэтай працы.

Святары, пра якіх пойдзе гутарка далей, былі таксама землякамі і аднадумцамі, і лёс іх быў падобны, і смерць была з адных рук. Гэта Вінцэнт Гадлеўскі і Станіслаў Глякоўскі.

Вінцэнт Гадлеўскі нарадзіўся ў в. Шурычы (Свіслацкі р-н) 16.06.1888 г. Пасля сканчэння каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбурзе, працаваў у Менску. Быў арганізатарам з'езда беларускага каталіцкага духавенства і БХД, уваходзіў ва ўрад БНР. Вінцэнт Гадлеўскі ў 1933 годзе першы пасля Скарыны на нашых землях зрабіў поўны пераклад на сучасную беларускую мову Біблії „Гісторыя Сьвятая або біблейная Старога і Новага Закону". З 1936 г. выдае газету „Беларускі Фронт". У часы нямецкай акупацыі працаваў у Чырвоным касцёле і галоўным інспектарам школ. У 1942 годзе ад улад атрымаў вымову, затым было забаронена чытаць казанні, затым быў арышт і расстрэл. Не да спадобы новай уладзе была яго дзейнасць па стварэнню незалежнай Беларусі, што, відаць, ішло ў разрэз з нямецкімі планамі на Ўсходзе.[12]

Станіслаў Глякоўскі нарадзіўся ў м. Поразаве (7 км. ад Шурычаў). Пасля сканчэння духоўнай акадэміі вучыўся ва Усходнім Папскім інстытуце ў Рыме. Быў высокаадукаваным чалавекам. Напісаў некалькі доктарскіх дысертацый. У канцы 1930-ых гадах быў ініцыятарам стварэння арганізацыі „Хрыстосаўцаў". Ідэя арганізацыі – „ідэя Ягелонаў, а валадарства Хрыста"[13]. У гады вайны працаваў у Чырвоным касцёле разам з Вінцэнтам Гадлеўскім. У 1942 годзе быў арыштаваны немцамі і імі знішчаны.

Расстраляны немцамі быў і беларускі праваслаўны святар

Аляксандр Коўш. Нарадзіўся ён у 1880 годзе у в. Рыдзякі (Гродзенскі р-н). Працаваў на парафіі ў м. Дзятлаўцы, затым у Вільні. Быў арыштаваны па справах „Грамады". Сядзеў у адной камеры з Радаславам Астроўскім. Пасля вызвалення адрамантаваў Пятніцкую царкву ў Вільні, а пры ёй зрабіў беларускую гімназію. Выдаваў часопіс „Зарніца". Уваходзіў у склад Міжнароднага Чырвонага Крыжа. Па даносе расейскага духавенства быў арыштаваны немцамі. У хуткім часе яго не стала.[14]

Непасрэдна ў Гародні ў сям'і ўрадаўца ў 1887 годзе нарадзіўся **Уладыслаў Талочка.** Вучыўся ён у Гародні, Беластоку, Вільні, Інсбруку. Працаваў святаром у Ваўкавыску, Гародні, Вільні. Беларускую працу распачаў у 1907 годзе першымі артыкуламі ў беларускім друку, затым пайшлі перадавіцы ў палітычных друкаваных органах 1919–1920-ых гадах. Друкаваў амаль што ва ўсіх беларускіх выданнях пад сваім прозвішчам і пад псеўданімам А. (Адам Саладуха) артыкулы на тэмы беларускай культуры, рэлігіі, гісторыі. Вёў карэспандэнцыю з інстытутам Усходняй Еўропы ў Рыме, прадстаўнікамі Апостальскай сталіцы з просьбай аб патрэбах беларускага народа ў касцельным жыцці. „Агулам трэба сказаць, – піша Адам Станкевіч, – што ў гэтым часе Уладыслаў Талочка быў кіраўніком, галавой, будзіцелем беларускага каталіцкага руху як такога. Усё, што тады рабілася беларускае, каталіцкае – гэта быў яго справа".[15]

Памёр Уладыслаў Талочка 13.11.1942 г. у Вільні.

Амаль што нічога невядома пра беларускага святара **Павела Хоміча,** апрача кароткіх паведамленняў у „Хрысьціянскай Думцы" пра тое, што „Павел Хоміч з Магілёўскай дыяцэзіі знаходзіцца ў бальшавіцкай турме, дзе цяжка захварэў на расстройства нэрваў. Родам з Гарадзеншчыны. Будучы ў Петраградскай Акадэміі належаў да гуртка беларускіх студэнтаў"[16] і „Павел Хоміч у Салаўках (астрозе) памяшаўся розумам. Знаходзіцца ў шпіталі для псіхічна хворых у Ленінградзе"[17]. Да гэтага хіба што яшчэ можна дадаць тое, што яго прозвішча ўнесена ў 1940-ых гадах у спісак пакойных беларускіх святароў.[18]

Некалькі слоў трэба сказаць пра святароў, якія не па свайму замыслу пакінулі межы сваёй Бацькаўшчыны. Пра такіх тут ужо ішла гаворка (Фр. Чарняўскі і Язэп Германовіч), але апроч іх вымушаны былі эміграваць на чужыну такія святары як Мікола Урбановіч, Янка Тарасевіч, Уладзімір Тарасевіч і Леў Гарошка.

Мікола Урбановіч нарадзіўся 30.10.1890 г. у м. Астрыно. У 1924 годзе выехаў у ЗША. Там працаваў прафесарам у духоўнай семінарыі. Друкаваўся ў замежных беларускамоўных выданнях.

Янка Тарасевіч – адзін са старэйшага пакалення беларускіх эмігрантаў. Нарадзіўся 20.10.1892 года ў Клешняках (Шчучынскі

р-н). Прыехаў у ЗША ў 1911 годзе. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Швейцарыі, г. Фрыбург (1919-1925). Тут абараніў дысертацыю на тэму „Пакора паводле сьв. Тамаша Аквінскага" і стаў доктарам тэалогіі. Працаваў прафесарам у семінарыі і калегіі. Наведаўшы ў міжваенны час Радзіму прыйшоў да выніку, што „Польшчай кіруюць масоны, паны і ксяндзы шавіністы".[19] Янка Тарасевіч выдаваў за мяжой расейска-ангельскі часопіс „Голас царквы" і „Лісток да беларусаў". Быў шматгадовым старшынёй Беларуска-Амерыканскай Нацыянальнай Рады, заснаваў парафіі Хрыста Спаса для беларусаў у Чыкага. Пісаў вершы, публіцыстычныя і багаслоўскія артыкулы, якія друкаваў у замежных выданнях. Для разумення яго творчасці варта прывесці адну цытату: „Яго кніжка „Беларусы ў сьвятле праўды" ёсьць адзінай у нашай літаратуры, якая бярэ пад развагу глыбокія прынцыпы хрысьціянскай філасофіі і этыкі, якія нічуць не пярэчаць сьведамасьці і самаакрэсьленасьці беларуса. Чуваць боль сэрца і ліюцца ў аўтара сьлёзы, калі піша пра нядолю беларуса, але адчуваецца і моцная вера ў ягоныя непахісныя сілы"[20]

Памёр Янка Тарасевіч 11.06.1978 года. На пахаванні прысутнічала пяць біскупаў, каля сотні святароў і маса вернікаў – вельмі рэдкая з'ява за мяжой.

Справу свайго дзядзькі Янкі Тарасевіча прадоўжыў **Уладзімір Тарасевіч,** які нарадзіўся ў 1921 годзе таксама ў Клешняках. У 1939 годзе выехаў у ЗША, дзе паступіў у каледж айцоў бенедыктынцаў у Лайлі, каля Чыкага, затым вучыцца ў каталіцкім універсітэце ў Вашынгтоне (1944 – 1949). З 1949 года – у папскім усходнім інстытуце ў Рыме. Працаваў у Чыкага кіраўніком прыхода і беларускай царквы Хрыста Спаса.

12 ліпеня 1983 года Папа Рымскі назначыў архімандрыда Уладзіміра Тарасевіча тытулярным Біскупам марыянітамскім і Апостальскім візітарам для беларусаў, якія жывуць у ЗША і, наогул, за межамі Бацькаўшчыны.[21]

Шмат карыснага за мяжой для Беларусі, для прызнання беларусаў у свеце зрабіў **архімандрыд Леў Гарошка.** Нарадзіўся ён 26.02.1911 года ў в. Трашчычы (Карэліцкі р-н). Вучыўся ў Навагрудскай беларускай гімназіі (1926-1931) і Львоўскай грэка-каталіцкай акадэміі (1931-1936). Пасля вайны выехаў у Францыю, дзе заснаваў і рэдагаваў часопіс „Божым шляхам" на працягу дзесяці гадоў. Творчая спадчына айца Льва Гарошкі вельмі багатая і разнастайная. Яго пяру належаць філасофска-тэалагічная кніга „Душа" (1948), гістарычныя кнігі „Сьвятая Еўфрасіньня–Прадслава Полацкая. Патронка Беларусі" (1950 г.), „Беларусь у датах, лічбах, фактах" (1953 г.), „Пад знакам „рускае" і „польскае" веры" (1954- 1955 гг.), „Прычыны паланізацыі на Беларусі" (1955 г.), мовазнаўчая кніга „Своеасаблівасьці беларускае мовы" (1951 г.), прыродазнаў-

чая „Паходжаньне чалавека ў сьвятле сучасных фактаў" (1948г.) і іншыя. Ён склаў грэка-лацінска-царкоўнаславянска-беларускі слоўнік і слоўнік беларускіх прымавак і прыказак. Апроч гэтага ён напісаў кнігу апавяданняў пад псеўданімам Анатоль Жменя. 28.07.1977 года ў шпіталі ў Парыжы Леў Гарошка памёр.

Падводзячы вынікі, варта зазначыць, што сёння неабходна як мага хутчэй адшукаць, вярнуць, даць нашаму народу вельмі багатую творчую і духоўную спадчыну беларускіх святароў, а прозвішчы іх ушанаваць у народнай памяці. Яны былі больш чым дзеячы нацыянальнага адраджэння. Яны былі Вялікімі Пакутнікамі за веру Хрыстову і за сваю Бацькаўшчыну. Яны былі нашымі Апосталамі. Гарадзеншчына можа ганарыцца сваімі сынамі.

---

1. ЦБ АН Рэспублікі Беларусь. Ф.4, В.1, С.32.
2. „Беларуская крыніца", 1940г., № 3.
3. Запісана са слоў а. Уладыслава Чарняўскага.
4. Андрэй Зязюля. „З роднага загону". Вільня, 1931г.
5. ЦБ АН РБ. Ф.4, В.1, с.150.
6. Адам Станкевіч. „Казімір Сваяк. Нарысы аб ягонай ідэалогіі". Вільня, 1931 г.
7. Тамсама.
8. „Хрысьціянская думка". 1930 г., № 21-22.
9. ЦБ АН Літвы. Ф.21, С.69777.
10. „Спадчына". 1991 г., № 5.
11. Тамсама.
12. Больш падрабязна чытай: „Гарадзенскія запісы". 1993 г. №1.
13. „Хрысьціянская думка". 1939 г., №7.
14. Запісана са слоў З. А. Кратовіч (дочкі А. Каўша).
15. „Хрысьціянская думка". 1938 г., №13.
16. 'Хрысьціянская думка". 1933 г., № 10.
17. „Хрысьціянская думка". 1934 г., №4.
18. ЦБ АН РБ. Ф. 4, в. 1, с. 150.
19. „Божым шляхам". 1979 г., № 150.
20. Тамсама.
21. „Ніва". 1984 г., № 3.

Літаратурныя мясціны Лідчыны

Л. Я. Кулажанка
г. Мінск

Апісанне горада, замка і ваколіц пакінулі ў сваіх творах польскі храніст, гісторык і паэт М. Стрыйкоўскі, італьянскі падарожнік А. Гван'іні, польскія літаратары Ю. Нямцэвіч, Э. Хлапіцкі. Радзіма Багдановіч Ірыны Эрнэстаўны (н. 1956), паэтэсы, крытыка.

Аляксандр Блок бываў тут праездам з Пецярбурга на Палессе. У кнізе „Аляксандр Блок. Лісты да жонкі" ёсць тэлеграма з подпісам: 7 кастрычніка 1907 г. Ліда, Віленскай губерні".

Карусь Каганец (1868-1918), паэт, празаік, драматург, працаваў у Лідзе на будаўніцтве чыгункі, бываў тут у 1902 г., аб чым згадвае ў творы „З рэферату на калядны сход беларускай грамады 1903 года".

„Лидское слово" – штотыднёвая грамадска-палітычная і літаратурная газета – выдавалася ў Лідзе з 17/30/.11.1912 да 31.5/13.6/.1913 г. на рускай мове. Друкавала апавяданні і нарысы мясцовых аўтараў, вершы самадзейных паэтаў.

„Земя Лідзка" („Земя наша") – краязнаўчы часопіс, – выходзіў на польскай мове ў 1935–1939 гг. пад рэдакцыяй Уладзіслава Абрамовіча ў Лідзе. Змяшчаў матэрыялы па гісторыі і тагачасным жыцці Лідчыны.

І. П. Катлярэўскі (1769-1838), украінскі пісьменнік, у 1807 г. служыў тут у драгунскім палку.

У сакавіку 1940 г. ў Ліду прыязджаў Янка Купала. Выступаў у чыгуначным клубе і ў кінатэатры „Эдысон" (будынкі не захаваліся) перад рабочымі і сялянамі з навакольных вёсак. 15 сакавіка ў кінатэатры „Эра" (цяпер гарадскі Дом культуры) адбыўся літаратурны вечар, у якім разам з Я. Купалам бралі ўдзел Пятро Глебка, Валянцін Таўлай, Ніна Тарас, Анатоль Іверс, Пятрусь Граніт. Я. Купала наведаў таксама гарадскую бібліятэку, сустракаўся з чытачамі, падараваў бібліятэцы сваю кнігу „Над ракой Арэсай". Перад ад'ездам Купала меў гутарку з маладымі паэтамі Н. Тарас, А. Іверсам, П. Гранітам. Сёння гарадская бібліятэка і адна з вуліц носяць імя паэта.

Ежы Путрамант (1910-1986), польскі пісьменнік, вучыўся ў Лідскай гімназіі. Ва ўспамінах („Паўвека", т. 1-4, 1966-1969) апісаў горад, сваю вучобу ў гімназіі.

У 1922-1924 і ў 1939-1941 гг. тут жыў Валянцін Таўлай. Вучыўся ў польскай школе (1922-1924), у гэты ж час пачаў пісаць вершы. У 1939-1941 гг. быў літработнікам лідскай газеты „Уперад", працаваў

над паэмай „Кобрыншчына", „Песняй пра сухар". У 1943 г. пераехаў з Ліды ў Навагрудак. Захаваўся дом, дзе жыў В. Таўлай (вул. Камсамольская, 5). У 1965 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка з надпісам на рускай мове: „У гэтым доме з верасня 1939 года і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў беларускі паэт-рэвалюцыянер Валянцін Таўлай". Адна з вуліц горада і раённая бібліятэка носяць імя В. Таўлая.

Ніна Тарас (н. 15.5.1916), паэтэса, працавала ў лідскай раённай газеце „Уперад", у час вайны (1942-1944) была ўдзельніцай партызанскага руху на Лідчыне.

Радзіма Аляксандра Юрэвіча (н. 18.10.1952), паэта, празаіка. Выехаў з Беларусі ў 1957 г. Жыве ў Гданьску. Выдаў кнігу вершаў і прозы „Ліда" на польскай мове (Беласток, 1990).

хутар Банева (не існуе) Дакудаўскага с/с

Месца жыхарства Ежы Путраманта ў 1928-1939 гг. У гэты час напісаў зборнік паэзіі „Лясная дарога" (1938). Тут хаваў рукапісы сваіх твораў у час вайны. Наведаў гэтыя мясціны ў 1960-я гг. разам з М. Танкам і П. Панчанкам. Напісаў нарыс пра ўрочышча Банева. Ва ўспамінах („Паўвека", т. 1–4, 1966-1969) апісаў Банева і суседнюю вёску Дакудава.

в. Беліца, цэнтр с/с

Тут у 30-я гг. вучыўся ў вячэрняй школе Граніт Пятрусь (сапр. Івашэвіч Іван Пятровіч; 1909–1980), паэт. У 1939-41 гг. працаваў сакратаром валаснога выканкама, старшынёй Беліцкага сельсавета.

в. Біскупцы Дакудаўскага с/с

На хутары каля вёскі нарадзілася 1.1 1938 г. Бічэль-Загнетава Данута Янаўна, паэтэса. Родным мясцінам прысвяціла нарыс „Я паеду ў мурожныя Біскупцы..." – ў кн. :Слова пра родны кут. Мн. 1970, вершы „Вёска Біскупцы" – у кн. :Браткі. Мн. 1979, „У Біскупцах"- у кн. :Дзе ходзяць басанож. Мн. 1983. і інш.

горад Бярозаўка

У 1946, 1950, 1954 гг. тут пабываў Якуб Колас. Сустракаўся з выбаршчыкамі, наведаў шклозавод „Нёман", выступаў перад рабочымі.

в. Дзітрыкі Ганчарскага (Тарноўскага – ?) с/с

Радзіма Карыцкага Міхаіла Аляксандравіча (1714-1781), паэта. Пісаў на лацінскай мове. Нарадзіўся ў дваранскай сям'і. Дзяцінства правёў у спадчынным маёнтку Дзітрыкі. Тут атрымаў першапачатковую адукацыю. Адсюль выехаў на вучобу ў бабруйскую езуіцкую школу. У Дзітрыках пахаваны бацькі М. Карыцкага.

Лябёдка, каля в. Галавіч-Поле

У снежні 1902 г. рэвалюцыйна настроеныя студэнты-беларусы адбілі тут тыраж 1-га нумара газеты „Свабода". (Увесь тыраж быў канфіскаваны). У газеце былі надрукаваны вершы „Мужыцкая доля" А. Пашкевіч і „Добрыя весці" У. Сыракомлі. Верагодна, што

Цётка ўдзельнічала ў падрыхтоўцы газеты.

фальварак Устронь Лідскага павета

Мяркуецца, што тут жыла Адэля з Устроні, паэтэса, аўтар паэмы „Мачаха" (на бел. мове, 1850) і верша „Кракаў" (на польск. мове, 1850). Рукапіс зберагаецца ў бібліятэцы Ягелонскага універсітэта (Кракаў).

в. Хадзюкі Голдаўскага с/с

Радзіма Лялько Хрысціны Аляксееўны (н. 30.3.1956), празаіка.

маёнтак Яшнец Лідскага павета

Радзіма Нарбута Казіміра (1738-1807) філосафа, асветніка, аўтара першага падручніка па логіцы на польскай мове (Вільня, 1769).

У Лідскім павеце настаўнічала, запісвала фальклор, збірала этнаграфічны матэрыял Бірута (сапр. Даравінская Амелія 1863-1891), беларуская і польская фальклярыстка і этнограф. Найбольш значная яе публікацыя – „Беларускія песні Лідскага павета". Напісала таксама манаграфію „Апісанне Лідскага павета", якая была забаронена цэнзурай.

Прабач нам, мілая Пашкевічанка!

А. В. Жалкоўскі,
г. Ліда

Калі ні бываю ў Астрыне, заўсёды з хваляваннем і замілаваннем іду па Гродзенскай вуліцы. Яна мне любая ўдвайне. І таму, што выводзіць на дарогу да маёй роднай лясной вёсачкі, і таму, што на гэтай вуліцы знаходзіцца помнік нашай знакамітай зямлячцы Цётцы (Алаізе Пашкевіч). Спыняю свой крок у запаветным месцы і рады новаму спатканню са слыннай паэтэсай. Гляджу на выяву маладой жанчыны ў гарадской сукенцы, з накінутым на плячо шалікам, з прыціснутай да грудзей кнігай. Праніклівы і добры позірк выпраменьвае ўнутраную сілу і эмацыянальную ўсхваляванасць пісьменніцы, быццам пытае ў кожнага, хто прыйшоў сюды на сустрэчу: „Як жывецца табе, чалавеча? Што зрабіў ты дзеля сваёй беларускай старонкі?"

З увасобленай у помніку выявай Цёткі я пазнаёміўся ў пачатку 50-х гадоў. Працаваў тады адказным сакратаром Васілішкаўскай раённай газеты „Ленінскі шлях". Помніцца, панёс неяк па даручэнню рэдактара П. К. Дубовіка тэкст даклада старшыні райвыканкама Ф. П. Шабеце, з якім ён выступаў на сесіі райсавета. Аддаў галаве раёна папку з паперамі, а ён мне і кажа: „Не спяшай, хлопча! Зараз табе нешта пакажу". Феафан Паўлавіч дастаў з шуфляды

стала эскізы помнікаў паэтцы і сказаў: „Па аднаму з праектаў паўстане помнік Цёткі ў Астрыне. Толькі няведама калі". Не ведаў тады я, жаўтароты камсамолец, як у нас усё складана закручана-перакручана.

Імя Цёткі з намі з малых гадоў. І можна зразумець, якую падтрымку выклікала ў землякоў паэтэсы думка пабудаваць ёй у райцэнтры помнік (Астрына мела ў той час такі адміністрацыйны ранг). Пераканаўчым сведчаннем таму з'явіўся праведзены ў маі 1953 года мнагалюдны фестын у вёсцы Стары Двор, дзе ля старога гасцінца пахавана пісьменніца, якую мясцовыя людзі называлі папросту Ліза, Лізанька, Пашкевічанка.

Не асмелюся сцвярджаць, каму тады належала ініцыятыва правесці такую ўрачыстасць. Добра памятаю адно: падрыхтоўкай да своеасаблівай маёўкі былі заклапочаны ў райвыканкаме і рана, райкамах партыі і камсамола, рэдакцыі „раёнкі"... Будучай падзеяй жылі наш настаўнік-паэт Сяргей Бандарэнка, вядомы пясняр Прынямоння Міхась Васілёк і адказны сакратар абласной газеты Аляксандр Кіркевіч. Два апошнія часта наведваліся ў Астрыну, унікаючы ў дэталі падрыхтоўчай работы.

Бандарэнка і Кіркевіч, мае старэйшыя сябры па супрацоўніцтву ў мясцовым друку, гаварылі мне, трапіўшаму тады на пасаду сакратара райкама камсамола: „Глядзі, Алесь, не падвядзі са сваімі камсамалятамі". І я з актывам стараўся не падвесці грамадскасць. Гэта ж да нас была звернута Цётчына публіцыстыка – артыкулы „Да вясковай моладзі беларускай", „Шануйце роднае слова!", „Да дзяўчатак", „Аб душы маладзёжы", „Да школьнай моладзі". Бо гэтыя творы не проста спадчына, а і вялікі запавет. І камсамольцы, на маю думку, аказаліся на ўзроўні, асабліва школьныя актывісты.

Вызначыліся ў падрыхтоўцы да паэтычнага свята многія настаўнікі, камсоргі і старшыя піянерважатыя. Іх, бадай, ніколі не хвалілі з раённых трыбун і ў мясцовай газеце. І сёння, больш чым праз сорак гадоў, мне хочацца прыгадаць імёны тых, хто разам з вучнямі збіраў для Цёткі на той фестын першыя вясновыя кветкі, укладваў майстэрства і душу, плятучы адмысловыя вянкі і вяночкі, рэпетыруючы да свята нашы родныя беларускія песні, дэкламацыю вершаў Цёткі. Гэта Таццяна Сільвановіч і Надзея Ляпеша, Аня Карсакова і Аляксандр Харытонаў, Галіна Амяляшка і Валянціна Махнач, Ганна Лемяноўская і Марыя Бярнадская, Кацярына Карнеева і Канстанцін Бурак, Мая Міроненка і Аляксей Нясцёркін, які ў дзявочым асяроддзі піянерважатых быў адзіным хлопцам у раёне.

Хай не падумае чытач, што фестын у гонар Цёткі рыхтаваўся ў асноўным маладымі рукамі. Зусім не! Шчырых працаўнікоў-добраахвотнікаў хапала і ў асяроддзі сталых людзей. Не магу не ўспомніць светлай памяці дырэктара Шастакоўскай сямігадовай школы Алены Рыгораўны Рэўт. У той час сталоўкі працавалі, акрамя райцэнтра, толькі ў мястэчках Васілішкі, Новы Двор, Сабакінцы (зараз в. Першамайская). Вось чаму так да месца была гасціннасць Алены Рыгораўны, якая разам з іншымі ўзяла на сябе клопат пакарміць людзей, што прыехалі з Гродна і Вільні, іншых месц. Нельга не ўспомніць тагачаснага дырэктара Хадзілонскай НСШ І. М. Тарасевіча. Іван Міхайлавіч на аснове прапаноў грамадскасці падрыхтаваў і зачытаў на ўрачыстасці рэзалюцыю. У гэтым дакуменце была выказана просьба да ўрада рэспублікі садзейнічаць устанаўленню ў г. п. Астрына помніка Цёткі і прысвоіць яе імя Астрынскай сярэдняй школе.

Коратка аб літаратурным свяце. На сустрэчу ў гонар Цёткі тады сабралася больш за тысячу чалавек. Вельмі шмат было сялян з навакольных вёсак, настаўнікаў. Адны ехалі на фурманках, іншыя дабіраліся ў Стары Двор пешшу. Бабулі ішлі ўшанаваць любімую ў народзе Пашкевічанку з унукамі. Вясковыя маладзіцы былі апрануты ў самаробныя блузкі-вышыванкі і прыгожыя спадніцы. А колькі было кветак!

Мнагалюдны сход замоўк, калі слова атрымаў Аляксандр Кіркевіч. Ён расказаў аб жыцці, літаратурнай і рэвалюцыйна-дэмакратычнай дзейнасці славутай зямлячкі. З успамінамі пра Цётку выступіла яе стрыечная сястра Шмігіра. Паэт Пятрусь Макаль прачытаў верш, які прысвяціў Алаізе Сцяпанаўне. А потым гучалі вершы паэткі ў выкананні вучняў Шастакоўскай школы.

Тая маёўка ў гонар Цёткі, напэўна, засталася ў памяці ўдзельнікаў першай у раёне такой мнагалюднай урачыстасці. Аб гэтым я чуў ад многіх знаёмых. Аб гэтым думаю я, стоячы перад помнікам пісьменніцы ў Астрыне. Многае прыгадваецца ў час гэтых сустрэч. Хочацца расказаць мілай Пашкевічанцы пра рэспубліканскае свята паэзіі, прымеркаванае да стагоддзя з дня яе нараджэння. Пра іншыя святы, праведзеныя ў Старым Двары і Астрыне. Пра тое, што ў Астрынскай СШ стараннямі настаўніцы Галіны Багумілаўны Пугач і яе добрых памочнікаў адкрыты музей паэтэсы. Як цяперашні лідчанін хачу паведаміць Алаізе Сцяпанаўне пра тое, што намаганнямі журналісцкай арганізацыі рэдакцыі газеты „Уперад" імя славутай зямлячкі прысвоена адной з вуліц Ліды. У горадзе, дзе наша Ліза адзін час вучыла дзяцей, дзе пахаваны яе бацька.

Часта ў памяці ўсплываюць мае паездкі ў Стары Двор, Бакшты, Шастакоўцы разам з пісьменніцамі Валянцінай Коўтун і Хрысцінай Лялько, калі Валянціна Міхайлаўна збірала матэрыялы для напісання сваёй кнігі „Крыж міласэрнасці". Там былі незабыўныя

сустрэчы з людзьмі шаноўнага ўзросту, якія памяталі Цётку і яе бацькоў. Дзед Макарэвіч з Бакштаў у дэталях, напрыклад, расказваў нам пра тое, як Алаіза Сцяпанаўна любіла спяваць з вясковымі кабетамі беларускія і польскія народныя песні, як успамінала цудоўныя казкі бабы Югасі. Стары чалавек добра характарызаваў бацьку паэтэсы Сцяпана Пашкевіча. Гаспадар невялікага фальварка, у сялянскім разуменні пан, прыязна і папросту адносіўся да беднага сялянскага люду. І ў такім духу выхаваў сваіх дзяцей. Аб чым з задавальненнем і гонарам апавядалі нам вяскоўцы.

Ураджэнка Бакштаў Марыя Міхайлаўна Тарасевіч прыгадала расказы сваёй маці пра Пашкевічанку часоў першай расейскай рэвалюцыі. Тады маладая Ліза разам з сябрамі хавалася ў бацькоўскім гумне. Ад царскіх жандараў яны схаваліся, а вось ад цікаўнасці вясковай блазноты не маглі. Падлеткі праз шчыліны заглядвалі ў гумно, імкнучыся даведацца, што там робяць панічы з Вільні. І толькі стаўшы дарослымі людзьмі, зразумелі прычыну незвычайнага пражывання ў фальварку гарадскіх гасцей.

Калі я ў думках размаўляю з Цёткай, міжволі апаноўвае неспакой, што мы ў даўгу перад памяццю таленавітай пісьменніцы. Чаму б педвучылішчу ў Лідзе не насіць імя паэткі? Чаму ў Шчучынскім і Лідскім раёнах няма ні аднаго калгаса імя Цёткі? Наконт гэтага былі прапановы грамадскасці, ды яны разбіваліся аб раўнадушша і бяспамяцтва мясцовага бюракратычнага кіраўніцтва. Хіба можна такое ўявіць у суседняй Украіне ў адносінах да Лесі Украінкі? Ні ў якім разе!

Так, мы не ўсё зрабілі для ўшанавання першай і лепшай беларускай паэткі. Прабач нам за гэта, мілая Пашкевічанка! І разам з намі парадуйся адраджэнню роднай Беларусі пад гістарычным бел-чырвона-белым флагам і незабыўнай Пагоняй.

Этнаграфічнае вывучэнне Лідчыны

Т. М. Мікуліч
г. Гродна

Ліда і яе ваколіцы ўяўляюць несумненную цікавасць з пункту погляду этнографа. Складаная сацыяльна-палітычная і этнічная гісторыя Беларусі паўстае перад даследчыкам, які дакранаецца да мінулага і сучаснага гэтай зямлі. Некалі тэрыторыю Лідчыны называлі то Літвою, то Чорнай Русею, пакуль яна не набыла сваё сённяшняе імя – Беларусь.

Асаблівасць этнакультурнага твару Лідчыны звязана з суіснаваннем здаўна побач літоўцаў, беларусаў, палякаў, татар, яўрэяў.

Матэрыяльная і духоўная культура насельніцтва дадзенага рэгіёну, цесна звязанага з усім Панёманнем, характарызуецца спалучэннем беларускіх, балцкіх і польскіх рыс.

Тэрытарыяльна-адміністрацыйнае дзяленне Беларусі мянялася ў розныя часы. У 19 – пач. 20 стст. Ліда была цэнтрам паветá спачатку Гродзенскай, а з 1842 г. – Віленскай губерні. Да Лідскага павету адносіўся і маёнтак Нача, дзе нарадзіўся і ўсё жыццё пражыў вялікі аматар гісторыі роднага краю, археолаг, этнограф Вандалін Шукевіч (1852–1919). Свае археалагічныя і этнаграфічныя даследы ён праводзіў пераважна ў Лідскім павеце.

Менавіта ў ваколіцах Ліды Шукевіч пачуў народныя паданні, легенды, прыкметы, якія потым апублікаваў у часопісах „Wisla„ і „Kwarntalnik Litewski„. Дзве вялікія цікавыя працы Вандаліна Шукевіча данеслі да нас сотні запісаў помнікаў духоўнай народнай творчасці. Так, у артыкуле „Народныя вераванні і абрады (забабоны, прымхі, прадказанні і інш.), сабраныя ў Віленскай губ." змешчана 432 запісы.[1] Гэты збор дапаўняецца тэкстамі 15 легенд, паданняў, чарадзейных апавяданняў і 159 вераванняў, прымхаў у артыкуле „Некаторыя вераванні, прымхі і забабоны нашага люду, легенды і паданні"[2].

Паданні і легенды, сабраныя на Лідчыне, змяшчаюць успаміны пра каралеву Бону, пра ваенныя дзеянні з татарамі, шведамі, французамі і інш. Некалькі легенд і частка вераванняў, якія надрукаваў Шукевіч, былі запісаны яго дачкой Вандай Нарбут, вялікай аматаркай фальклору. Заўчасная смерць гэтай таленавітай жанчыны пазбавіла нас многіх цікавых знаходак.

Наколькі разнастайныя па зместу вераванні, апублікаваныя Шукевічам, можна меркаваць ужо па групах, вылучаных самім аўтарам: 1/ спосабы хутчэйшага замужжа (жаніцьбы); 2/ паводзіны ў замустве, адносіны да цяжарнасці, да немаўлят; 3/ сакрэты забеспячэння поспеху ў жыцці і гаспадарцы, спосабы барацьбы са шкодніцтвам; 4/ спосабы шкодзіць іншым і розныя заклінанні; 5/ варажба і прадказанні; 6/ лячэнні і замовы.

Падчас аналізу народных вераванняў, ўяўленняў Шукевіч прыходзіць да высновы, што трывалая вера ў таямнічыя, звышнатуральныя сілы захоўваецца ў народзе, дзякуючы яго глыбокай рэлігійнасці. Даследчык адзначае, што забабоны часам даходзяць да абсурду. Перажыткі ў свядомасці народа, паводле Шукевіча, былі настолькі трывалымі, што калі б не юрыдычныя нормы і не страх пакарання з боку дзяржаўных улад, то простыя людзі карысталіся б у жыцці звычаевым сярэдневяковым правам дзеля расправы з „чараўнікамі", людзьмі, якія могуць „сурочыць". Вандалін Шукевіч падкрэсліваў, што ў народзе створаны цэлы кодэкс паводзін, прыдатны на ўсе выпадкі жыцця, які складаецца з розных перасцярог, абмежаванняў, забарон і г. д.

Значную цікавасць ўяўляе і артыкул Вандаліна Шукевіча „Старажытныя лекавыя сродкі", прысвечаны народнай медыцыне.[3] У аснову яго лягліматэрыялы, атрыманыя даследчыкам ад свайго дзеда Мацея Карачэўскага. Згодна запісу, зробленаму самім дзедам, усе прыведзеныя спосабы лячэння адносяцца да 18 ст. Вандалін Шукевіч зрабіў агульны аналіз дадзеных матэрыялаў і вылучыў сярод спосабаў лячэння, па-першае, тыя, якія заключаліся ў выкананні пэўных дзеянняў, а, па-другое, тыя, якія былі звязаны з выкарыстаннем рэчавых сродкаў раслінnага і жывёльнага паходжання. Да першай групы ён ставіўся вельмі скептычна, затое лічыў, што веданне прыродных лекаў можа быць вельмі карысна. Менавіта таму даследчык і звяртае ўвагу на апошнія. У артыкуле згадваюцца 32 спосабы лячэння з дапамогай сродкаў раслінnага і жывёльнага паходжання, прыводзяцца рэцэпты выкарыстання жывёльнага тлушчу, сала, мяса, асобных органаў жывёл, малака. Усе гэтыя рэчывы браліся ў свіней, мядзведзяў, зуброў, зайцоў, вожыкаў і іншых хатніх і лясных жывёл. Розныя захворванні лячыліся рознымі метадамі, нават калі выкарыстоўвалі адны і тыя ж сродкі (тлушч, малако і інш.).

Жыццё простага чалавека заўсёды цікавіла Вандаліна Шукевіча. Ён спачуваў „страшэннай галечы „беларускага і літоўскага сялянства, яго бытавым цяжкасцям, спрадвечнай матэрыяльнай нястачы, адсутнасці магчымасцей вучыцца на роднай мове. Вучоны імкнуўся прыцягнуць увагу грамадскасці да цяжкага становішча простага чалавека. Дзеля гэтага ён, у прыватнасці, неаднойчы выступаў з артыкуламі ў Віленскай газеце „Kurier Litewski„. Вось адно з апісанняў беларускай вёскі на Лідчыне, змешчанае ў згаданай газеце ў артыкуле „Статыстыка і рэчаіснасць" (1908 г.): нізкія, убогія, цьмяныя хаткі з глінабітнымі печамі, якія нярэдка былі без коміна, самая простая ежа ў іх гаспадароў (бульба, улетку розная зеляніна), хранічнае малазямелле.

Тэрытарыяльная блізасць Лідчыны да Польшчы, традыцыйны інтарэс польскай інтэлігенцыі да Панёманскага рэгіёну абумовілі з'яўленне ў к. 19-пач. 20 ст. шматлікіх публікацый па гісторыі, этнаграфіі, фальклору Ліды і яе ваколіц у такіх польскамоўных часопісах, як „Wisla , „Ziemia , „Ziemia Nasza„ /„Ziemia Lidzka„/. Дазволім сабе спыніцца на некаторых артыкулах этнаграфічнага характару, надрукаваных у свой час у названых часопісах.

Несумненную цікавасць выклікае матэрыял Ежы Іваноўскага, прысвечаны беларускаму народнаму тэатру, батлейцы, „Батлейкі ў Лідскім павеце Віленскай губерні" (1901 г.)[4]. Батлейка вядома на Беларусі з 16 ст. Назва тэатру паходзіць ад польскай назвы г. Віфлеема, месца нараджэння Хрыста, Бетлеем.

Ежы Іваноўскі адзначаў, што батлейка здаўна вядома ў Лідскім

павеце і сумежных землях. На Каляды, на Новы год моладзь абыходзіць вёскі і двары з лялечным тэатрам, збіраючы напрыканцы ахвяраванні гледачоў. Змест тэатральнай дзеі рэлігійны, з устаўкамі сцэн народнага жыцця. Аўтар артыкула „Батлейкі ў Лідскім павеце Віленскай губерні" прысутнічаў на паказе драмы „Цар Ірад". Дадзеная батлейка адносілася да ліку так званых „жывых батлеек", у якіх іграліі людзі.

Ежы Іваноўскі даў падрабязнае апісанне ўсіх неабходных для прадстаўлення прыстасаванняў і змест актаў драмы. Для арганізацыі батлейкі звычайна выбіралася вялікая хата, пасярод якой ставілі стол і крэсла (трон цара Ірада). Акцёры-батлеечнікі апраналі касцюмы „анёла", „салдата", „пастараў", „пілігрыма", „д'ябла", „караля Ірада". Трупа налічвала 12-15 чалавек. Усе акцёры гаварылі „па-мазурску". У пачатку прадстаўлення „анёл" ставіў на стол „шопку" – скрынку ў выглядзе хаткі, аклееную паперай, з выявамі Ісуса Хрыста, Святога Іосіфа, Божай Маці. Ён запальваў святло ў гэтай хатцы, гаварыў „Няхай будзе ўсхвалены Ісус Хрыстос!", і пачыналася п'еса.

Батлейку заўсёды суправаджалі песні. Спяваў хор з 3-5 мясцовых галасоў. У п'есе было шмат гумару. Батлеечнікі мелі нязменны поспех. Яны ўносілі ажыўленне ў аднастайнае вясковае жыццё. Але ў пач. 20 ст. гэты цікавы від народнай творчасці пачаў знікаць.

Усе этнаграфічныя публікацыі, якія мы разглядалі вышэй, выходзілі ці то ў Вільні, ці то ў Варшаве. Зараз жа звернемся да часопіса, які не толькі змяшчаў матэрыялы па Лідчыне, але і рабіўся ў Лідзе. Мы маем на ўвазе рэгіянальна-краязнаўчы месячнік „Ziemia Lidzka„. Ён выходзіў у 1935 – 1939 гг. Грошы на выданне часткова даваў фонд народнай культуры Пілсудскага. „Ziemia Lidzka„ друкавалася адначасова і пад назвай „Ziemia Nasza„ (магчыма, на Лідчыне распаўсюджваўся часопіс „Земя Наша", а за яе межамі – „Земя Лідска"). За гады свайго існавання ў часопісе было апублікавана шмат каштоўных краязнаўчых матэрыялаў. Адзін з такіх – артыкул Адама Хоміча „Навагрудская вёска і яе багацце„[5]. Прыгадаем, што ў 1921-39 гг. Ліда з'яўлялася цэнтрам павета Навагрудскага ваяводства, у які яшчэ ўваходзілі Баранавічы і Слонім. Адам Хоміч даў апісанне тыповай вёскі на Навагрудчыне, якое сведчыць пра трывалае захаванне яшчэ ў канцы 30-х гг. традыцыйнай беларускай культуры.

Вясковая хата была звычайна аднакамернай, гэта значыць, яна складалася з аднаго пакоя. У хаце знаходзілася вялікая печ, ложак, на якім адначасова спала некалькі чалавек, стол, лавы, вялікі куфар для адзення і рознае гаспадарчае начынне. Замест падлогі – убітая гліна. Пры кожнай хаце паблізу знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы: хлеў (звычайна насупраць хаты), стадола (авін, рыга),

азярод, які ўяўляў два слупы з жэрдкамі паміж імі для снапоў або сена. Амбар для захоўвання збожжа мелі толькі багацейшыя сяляне.

Асноўнай ежай людзей краю з'яўлялася бульба і хлеб. Разам з імі ўжывалі свіное сала, малако. У час посту, калі забаранялася ўсё скаромнае (мяса, сала), харчаваліся кіслымі гуркамі, капустай, алеем. З мукі выраблялі квас – „саладуху". Любімай стравай сялян Навагрудчыны Адам Хоміч лічыў „мачанне", прыгатаванае з яек, мукі, малака на сале. Елі мачанне з блінамі або бульбай.

Адзенне сялян нават напрыканцы 30-х гг. было галоўным чынам з самаробнага палатна (з лёну) і сукна (з воўны). Самым распаўсюджаным абуткам заставаліся плеценыя лапці з лыка, якія прымацоўвалі да нагі шнурком.

Артыкул Адама Хоміча быў прысвечаны матэрыяльнай культуры беларусаў. Але значна болей „Земя Лідска" друкавала цікавыя звесткі па духоўнай культуры. Вясельны абрад, які бытаваў на Лідчыне, апісаў Міхал Шумялевіч у артыкуле „Вяселле".[6] Аўтар дэталёва разгледзеў падрыхтоўку да вяселля ў хаце маладога. Непасрэдна да застолля пачыналі рыхтавацца недзе за тыдзень. Для прыбірання хаты запрашаліся дзяўчаты гэтай вёскі. Сваю працу яны суправаджалі песнямі, накшталт:

Пара, маці, жыта жаці, колас нахіліўся,
Пара сына жаніці, бо развалачыўся.
Сядзіць голуб на дубочку, галубка на вішні,
Скажы, скажы, мой сыночку, хто табе наймільшы?[7]

Калі хата жаніха прыводзілася ў парадак, дзяўчат частавалі „палудзеннікам", які складаўся з 2–3-х місак забеленага крупніку, альбо грэцкай кашы з маслам. Пад вечар гэтага ж дня ў хаце маладога збіраліся дзяўчаты і хлопцы і ладзілі апошняе халасцяцкае застолле, якое суправаджалася песнямі і танцамі. М. Шумялевіч зрабіў цікавыя запісы вясельных песень Лідчыны ў 1933-1937 гг.

Да песеннай народнай творчасці неаднойчы звярталіся аўтары часопіса „Земя Лідска". Запісы жніўных песень знаходзім у артыкуле Уладзіміра Урбановіча „Жніўныя песні".[8] Жніво, як вядома, заўсёды было адным з найважнейшых перыядаў земляробчай працы. Таму яго пачатак і заканчэнне лічыліся святам, суправаджаліся абрадамі і песнямі. Працяглыя, меладычныя песні жніўнага сезону паэтызавалі працу жанчыны ў полі, яе асабістае жыццё. У. Урбановіч зрабіў пяць запісаў жніўных песень.

Трэба адзначыць, што поўны агляд этнаграфічных матэрыялаў, якія былі надрукаваны ў часопісе „Земя Лідска", мы пакуль не маем магчымасці. Гэты краязнаўчы месячнік, на жаль, у бібліятэках Беларусі амаль не захаваўся. Нам удалося натрапіць толькі на асобныя яго нумары за 1938–1939 гг. Напрыканцы хочацца адзна-

чыць, што этнаграфічная спадчына даследчыкаў Лідчыны далёка не вычэрпваецца прааналізаванымі матэрыяламі.

---

[1] Szukiewicz W. Wierzenia i praktyki ludowe (zabobony, presady, wrozby i t.d.), zebrane w qub. Wilenskiej //Wisla, 1903. T. XYII. Str. 265-280, 432-444.

[2] Szukiewicz W. Niektore wierzenia, przesady i zabobony ludu naszeqo, leqendy i padania //Kwartalnik Litewski, 1910. T. II. Str. 85-102; T. IY. Str. 111-124.

[3] Szukiewicz W. Dawne srodke lecznicze // Kwartalnik Litewski. 1911. T. Y. Str. 123-128.

[4] Jerzy Iwanowski. Betlejki w powiecie Lidzkim, qubernji Wilenskiej //Wisla, 1901. T.XY. Str. 401-411.

[5] Adam Chomicz. Wies nowoqrodzka i jej boqactwo // Ziemia Lidzka. 1939. N 1. Str. 19-23.

[6] Michal Szymielewicz. Wesele //Ziemia Nasza. 1939. N 2. Str. 41-45.

[7] Michal Szymielewicz. Wesele. Str. 43.

[8] Wlodzimierz Urbanowicz. Piesni zniwne //Ziemia Lidzka. 1939. N 7-8. Str. 206-208.

Фальклор Лідчыны ў запісах Амеліі Даравінскай (БІРУТЫ)

Уладзімір Васілевіч
г. Мінск

Жанчын, імёны якіх упісаны ў беларускую фальклярыстыку, няшмат. І сярод іх ёсць адно, што нібы знічка на небасхіле, прамільгнула і хутка згасла: Бірута. Пад гэтым псеўданімам прыходзіла да чытача на працягу нядоўгага свайго жыцця Амелія Даравінская /Derewinska/. Нарадзілася яна ў вёсцы Ройсталі, што знаходзілася побач з тагачаснай Вільняй, а з сённяшняй даўно злілася. Выхоўвалася і атрымлівала адукацыю будучая збіральніца народнай паэзіі ў Варшаве, вярнуўшыся адкуль пачала працаваць настаўніцаю ў Лідскім павеце. З'яўленне маладой адукаванай жанчыны ў правінцыі несумненна магло толькі ўзмацніць яе жаданне глыбей пазнаёміцца з навакольлем, з жыццём сялян, іх матэрыяльным і духоўным светам. Назіранні Даравінскай пастаянна выклікалі ў яе жаданне занатаваць убачанае і пачутае ў народзе.

Адной з першых яе публікацый за подпісам „Бірута" стаў прыкметны этнаграфічны нарыс „Лажынкі на Літве", апублікаваны ў краязнаўчым часопісе „Вісла" ў 1889 г. Прадстаўлены матэрыял быў запісаны ў вёсцы Шаўры Лідскага павета, дзе настаўніца назірала за абрадам уласнымі вачыма. Яна адзначыла, што час і характар правядзення дажынак амаль аднолькавы ва ўсіх маёнтках правінцыі. Бірута паказала падзеі апошняга дня жніва, калі жнеі і касары,

скончыўшы на полі справы, вяртаюцца ў панскі двор, дзе на расстаўленых сталах іх ужо чакалі пачастункі. Па ходу аўтарка робіць заўвагі пра парадкі, заведзеныя ў гэтай мясціне (напрыклад, што песні тут спяваюцца толькі жанчынамі). Як на сапраўднае ўпрыгожанне свята, указвае Бірута на жніўныя песні: „Мелодыя песні, падцягнутая некалькімі дзесяткамі галасоў за запявалаю, дадавала хараства нязмушаным, але сваёй натуральнасцю кранальным сэрца словам". У якасці ілюстрацыі прывяла песню „Дажалі жыта аж да аблогу", на вялікі жаль, пераклаўшы яе на польскую мову, хоць і пакінуўшы выдзеленыя курсівам некаторыя беларускія словы, якія стваралі прыкметы мясцовага каларыту і захоўвалі ў песні рыфму.

Дажалі жыта **па каласочку**,
Пазнай нас, паня, **па галасочку**...

Бірута падрабязна расказала пра ўсе моманты ўрачыстасцяў на дажынках: як спяваюцца пану і пані велічальныя песні, як вядучая песельніца здыме з галавы залацісты вянок, сплецены са збожжа і віншуе ім пана, цалуючы яму руку і прымаючы ўзамен хлеб-соль з грашыма, як пасля вясёлага пачастунку пачынаюцца вясёлыя танцы. У ацэнцы правядзення абраду прысутнічала, аднак, не столькі адчуванне і разуменне народнай душы, колькі крыху сентыментальная замілаванасць паненкі сялянскім святам, песнямі простых людзей: „Песня гэтая, якая пачынаецца на полі, пры нетаропкай хадзе з сярпамі, і заканчваецца пасля заходу сонца перад дваром, пакінула пранікнёнае, прыемнае ўражанне".

Неўзабаве Бірута апублікавала ў „Вісле" некалькі паданняў. Адно з іх – „Сосны ў Лідзе" – расказвае пра дзве сасны, якія выраслі на месцы забойства дзевяці францішканцаў, што з'явіліся ў гэты край, калі тут яшчэ панавала язычніцтва, каб пасвяціць людзей у хрысціянскую веру. Паданне гаворыць, што са зламаных галін цячэ кроў, і таму ніхто не адважыцца падняць сякеры на дрэвы, узросшыя над магілаю пакутнікаў.

Пасылаючы падборку паданняў, Бірута пісала рэдактару „Віслы" Яну Карловічу: „...Прыемна мне будзе бачыць матэрыялы надрукаванымі, тым больш, што пра маю радзіму Літву так мала польскія часопісы пішуць, нібыта яна зусім не існуе!" Гэтыя творы, на вялікі жаль, аказаліся апошнімі, якія Бірута магла пабачыць у друку. У 1891 г. часопіс паведаміў пра яе заўчасную смерць: „Здольная і вельмі заслужаная ў айчынным народазнаўстве панна Амелія Даравінская, вядомая чытачам „Віслы" пад прыдуманым імем Біруты, народжаная ў 1863 г... літаратарка і настаўніца, памерла ад

хваробы сэрца 27 ліпеня г.г. у Варшаве, пахавана на Павонзках. Пасля яе засталося багата рукапісаў і сярод іх „Апісанне Лідскага павету". Няхай зямля ёй будзе такая лёгкая, як страта яе нам і сям'і – цяжкая!"

Пакінутае Бірутаю ў рукапісах мела значнасць не меншую, чым тое, што пры яе жыцці паспела пабачыць свет, іначай наўрад ці салідны часопіс ацаніў бы так высока яе краязнаўчую дзейнасць. Толькі праз год пасля смерці Біруты часопіс „Збюр вядомасці до антрополёгіі краёвэй" змясціў паводле яе рукапісаў падборку „Беларускія песні з Лідскага павета", куды ўвайшло 25 тэкстаў. Усе песні пазаабрадавыя, у асноўным, сямейна- бытавыя, любоўныя, рэкруцкія. Амаль ля кожнага тэксту ўказана месца запісу: вёска Красна, Лазяны, Кемейшы, Сядзеймы. Звесткі пра выканаўцаў у публікацыі адсутнічаюць за выключэннем заўвагі збіральніцы да рэкруцкай песні „Стаяла каліна, стоячы завяла". У аснове сюжэта – развітанне з роднымі і суседзямі хлопца, якога забіраюць у салдаты „праз красну дзявіцу". Бірута, відаць, сама адчула пры запісванні нейкую незразумеласць у змесце і папрасіла выканаўцу даць тлумачэнні: „Дыктуючы мне гэтую песню, русінка дадала, што яна спяваецца на падставе фактаў, якія парой здараліся ў час прыгону. У войска даўней у нас выбіралі галоўным чынам са сваіх вёсак толькі тых хлопцаў, што вызначаліся благім характарам і паводзінамі... Бывала часам і так, што хтосьці, маючы злосць на маладога хлопца, наўмысна прадстаўляў яго ў такім святле ў двары, а аканом, падахвочаны хабарам, выдаваў яго ў рукі паліцыі, ці тых, хто фарміраваў палкі, і абвінавачаны мусіў ісці ў войска. Такім вось чынам карысталіся помстаю, здаралася, дзяўчаты, прымаючы на сябе ролю даносчыц". З іншых салдацкіх песень сустракаюцца такія, як „Скора восені дажджом, мы ў Расію жыць пайдзём", „Дзяўчына жаўнераньку любіла", „Не дай Божа смерці ў чужом краю ўмерці". У апошняй перадаецца змрочная карціна смерці салдата на чужой старонцы і яго апошняя просьба да птаха: „Орле мой, орле, ты сіненькі браце, нясі маёй маці косці пахаваці..."

Разнастайнасцю вызначаюцца лірычныя і сямейныя песні. Тут і скарга жанчыны на жыццё ў свякрушынай хаце, успаміны пра матчыну ласку. Тут і ўзаемныя кпіны хлопцаў і дзяўчат. Жартоўныя матывы чуюцца ў песнях „Бедавала пападдзя сваёю бядою", „У гародзе на ўзгорках зялёна бацвінка". Чысціня кахання апяваецца ў песнях „Ой пайду я каля луга", „Пад калінаю, пад зялёнаю". Тэму няўдалага замужжа раскрывае песня „Не стой, міла, над вадою".

Не размінулася ў сваёй збіральніцкай дзейнасці Бірута і з новымі сацыяльнымі матывамі, што праніклі ў фальклор. Адна з песень перадае цяжкія ўмовы працы на будаўніцтве чыгункі. Занесена ў беларускую вёску песня была хутчэй за ўсё кімсьці з рабочых-ады-

ходнікаў. Шурпатасць тэкста сведчыць пра нядаўняе яе паходжанне.

Нізка песень з пасмяротнай публікацыі пры ўсёй сваёй нешматлікасці выглядае досыць разнастайна. Нягледзячы на адсутнасць сёння дадатковых матэрыялаў, можна меркаваць, што гэтая публікацыя – відаць, не адзінае, што было ў песенным рэзерве збіральніцы. Наўрад ці не траплялiся ёй у часе даследавання Лідскага павета песні каляндарныя і сямейна-абрадавыя, а таксама і казкі. Напэўна, іншыя матэрыялы адкладваліся асобна, для самастойных публікацый.

Лёс рукапісаў, пакінутых Бірутаю, склаўся неаднолькава, часам нават драматычна. Несумненна, самай значнай яе працай была манаграфія „Апісанне (Народ) Лідскага павета". У мясцінах, добра вядомых даследчыцы, напэўна ж, было знойдзена ёю багата матэрыялаў для грунтоўнай навуковай працы, у якой яна падагуліла ўвесь вопыт сваіх назіранняў. Шкада, што да гэтага часу рукапіс манаграфіі не адшуканы. І толькі па пісьмах Біруты мы можам цяпер уяўляць пра яго каштоўнасць. За год да сваёй смерці Амелія Даравінская пісала Яну Карловічу: „...Цяпер апрацавала этнаграфічны нарыс „Народ Лідскага павета", але не ведаю, ці будзе ў гэтай форме прыняты ў „Віслу", ці яе „Бібліятэку" (Дадатак да часопіса, які выходзіў асобнымі кнігамі – Ул. В.) Пасылаю... толькі яго палову, з якой лёгка мець уяўленне пра нарыс у цэлым... Другую частку гэтага нарыса, якая ахоплівае паданні, загадкі, прыказкі і г. д. маю гатовую, але да тых часоў не буду яе перапісваць, пакуль не даведаюся, ці прыдасца на што. Як толькі шаноўны Пан праінфармуе мяне ў гэтым пытанні, у выпадку патрэбы заканчэння гэтай працы, у хуткім часе перапішу і прышлю..."

Карловіч азнаёміўся з рукапісам Біруты яшчэ пры яе жыцці, з задавальненнем адзначыўшы яе творчы рост. У адказ на яго водгук Даравінская пісала: „Невыказаную прыемнасць зрабіла мне добразычлівая... ацэнка маёй працы і шчырыя словы ліста Пана. Прысылаючы заканчэнне „Народа Лідскага павета", са спакойнымі думкамі буду чакаць часу, калі шаноўны Пан знойдзе магчымым гэта надрукаваць. Звыш першапачатковага плану дадала назвы мясцовасцяў і са шматлікага збору некалькі дзесяткаў народных паэтычных твораў. Баюся толькі, ці між гэтымі астатнімі не знойдзецца чагосьці, што б ужо некалі, недзе было надрукавана. Якія маю сумненні адносна „Чорнага колеру" і „За Нёман". З-за іх цудоўнай мелодыі (якую можа хтось іншы падасць, бо я не спрабавала пісаць ноты), не магла не спакусіцца, каб не змяніць іх..."

Пра вартасць неадшуканага рукапісу можна меркаваць таксама і па тым, што славуты вучоны Ян Карловіч меў сур'ёзны намер

выдаць яго асобна ў „Бібліятэцы „Віслы", дзе друкаваліся найбольш значныя па зместу і аб'ёму даследаванні і зборы. Зразумела, такая прапанова рэдактара з гонарам была б прынята кожным аўтарам. Імпанавала яна і Біруце: „На пытанне, ці згаджуся я, каб „Народ Лідскага павета" пабачыў свет як том „Бібліятэкі „Віслы", спяшаюся запэўніць Пана, што мне вельмі прыемна будзе бачыць сваю працу ў такой форме выдання... Што датычыцца цэнзуры – змагацца з ёю было б справаю беспаспяховаю, нягледзячы на тое, што кожны з апісаных фактаў я магла б у выпадку патрэбы растлумачыць яшчэ больш дакладна – застаецца нам толькі пакорліва падпарадкоўвацца ёй".

За тры месяцы да смерці Бірута паводле ўказанняў Карловіча актыўна працавала над удасканаленнем сваёй галоўнай працы – з асаблівай паўнатою гэта выяўляецца ў яе апошніх лістах да Карловіча: „Шаноўны Пане рэдактар! „Народ Лідскага павету" не можа быць так хутка выпраўлены, таму што асоба, якую я прасіла дапамагчы ў пошуках правінцыяналізмаў, абяцала іх толькі на наступны тыдзень... Беларускія тэксты, якія падаюцца – перакладаю. Большую частку песень выкрэсліваю, паколькі ў перакладзе шмат траціліў форме. Правінцыяналізмы, за выключэннем пары толькі выразаў, не ідуць ад няведання, я іх сама цяпер падкрэсліваю, але... мая віна, што раней гэтага не зрабіла... Суровы прыгавор з вуснаў Пана за выказванне супраць цэнзуры вельмі закрануў мяне, але прыняла яго пакорліва, як пакаранне за маю непрактычнасць на літаратурнай ніве..."

Але жаданне Яна Карловіча выдаць „Народ Лідскага павета" асобна – не здзейснілася. У перапісцы Карловіча маюцца звесткі, звязаныя з перашкодаю гэтага намеру: „Цэнзура канфіскавала ў мяне рукапісы кс. Пляшчынскага і Біруты „Народ Лідскага павета". Першы ўзяў на пару тыдняў, каб перапісаць; што датычыць другога, то падаў прашэнне ў Пецярбург. Гэта меліся быць тамы IX і X „Бібліятэкі „Віслы"... Так праз ускосныя звесткі праглядаюцца абрысы асноўнай працы жыцця Біруты. Дзе сёння шукаць рукапіс „Народ Лідскага павета"? Верагодней за ўсё ў Санкт-Пецярбурзе, куды ў свой час запатрабавала яго царская цэнзура. Але не выключана, што нейкімі шляхамі неапублікаваны нарыс завандраваў у варшаўскія ці кракаўскія архівы.

Невялікая творчая спадчына Амеліі Даравінскай – Біруты, якая за адмеранае лёсам кароткае жыццё не паспела да канца выявіць свае навуковыя здольнасці, не забылася з бегам часу. Без тых публікацый, якія яна прысвяціла блізкай ёй Лідчыне, сёння беларуская фальклярыстыка і этнаграфія выглядалі б хай сабе трошкі, але бяднейшымі.

III. АРХЕАЛОГІЯ ЛІДЧЫНЫ

(Прысвячаецца памяці Міхася Ткачова)

Першыя людзі на Лідчыне

М. М. Чарняўскі
г. Мінск

Археалагічныя работы на Лідчыне засведчылі, што чалавек упершыню тут з'явіўся каля 10 тысячагоддзяў назад. Гэта адбылося ў самым канцы ледавіковай эпохі, калі тэрыторыя Беларусі стала спрыяльнай для існавання не толькі жывёл, але і людзей.

Найбольш выразныя рэшткі паселішчаў-стаянак першых мясцовых жыхароў захаваліся на ўчастках высокай наднёманскай тэрасы паміж вёскай Бурносы і вусцем ракі Гаўя, на мысе пры ўпадзенні ў Нёман Дзітвы, а таксама паміж Беліцай і Зблянамі. Тысячы апрацаваных крамянёў, што сустракаюцца на тутэйшых пясках, указваюць на працяглую заселенасць берагоў каля нёманскіх брадоў, дзе было асабліва зручна паляваць на дзічыну. Сёння пяскі засаджаны хвойнікам, апалая ігліца прыхавала сляды колішняй жыццядзейнасці.

Першажыхары адносіліся да так званай даследчыкамі-археолагамі свідэрскай культуры. Яе носьбіты ў самым канцы старажытнакаменнага (палеаліту) і ў пачатку сярэднекаменнага (мезаліту) вякоў засялялі пераважна тэрыторыю Польшчы і Беларусі. На Верхняе Панямонне свідэрцы маглі трапіць двума шляхамі – ад Прыпяці праз Наваградскае ўзвышша, або з захаду па ўзбярэжжы Нёмана. Находнікі выраблялі прылады працы з крэменю і костак, жылі ў буданападобных хацінах, апраналіся ў скураную вопратку. Асноўным іх заняткам было лучнае паляванне пераважна на паўночных аленяў, незлічоныя статкі якіх панавалі тым часам на раўнінах Беларусі. Важнае дапаможнае значэнне таксама мелі рыбалоўства і збіральніцтва.

Каля 9 – 8 тысячагоддзяў назад назіраўся заняпад свідэрскай культуры. Значная частка яе носьбітаў адышла на паўночны ўсход

асвойваць разлеглыя прасторы Прыбалтыкі. У гэты ж час на Панямонні з'яўляецца новае насельніцтва, культуру якога называюць яніславіцкай. Характэрным стала выкарыстанне дробных крамянёвых вырабаў, з якіх рабіліся лёзы нажоў, вастрыі коп'яў, стрэлаў, гарпуноў. Клімат на Беларусі значна пацяплеў. Стаў багатым і разнастайным жывёльны і раслінны свет. Акрамя традыцыйнага паляванне асабліва распаўсюдзілася рыбалоўства, у тым ліку і з дапамогай чоўнаў, а таксама збіральніцтва. Гэтыя заняткі істотна павялічылі запасы спажывы, што вяло да росту колькасці насельніцтва. У мезаліце былі заселены не толькі берагі Нёмана, пачалося паступовае пранікненне і на яго прытокі. Так, стаянкі гэтага часу існавалі на Дзітве каля Ганчароў, Даржоў.

Найбольш значнае паселішча яніславіцкай культуры выяўлена на высокім нёманскім поплаве ніжэй вусця Залатой Рэчкі, паўднёва-заходней Беліцы. Тут на раскапанай археолагамі плошчы больш як на паўтысячы квадратных метраў былі знойдзены рэшткі агнішчаў, а вакол іх – разнастайныя крамянёвыя прылады працы і паляўнічая зброя. Сярод іх – доўгія трохкутныя наканечнікі стрэлаў, скрабкі для апрацоўкі скураў, нажы, разцы для костак, праколкі і пракруткі, скоблі, прымітыўныя сякеры.

Больш як 5 тысячагоддзяў назад першабытнае жыхарства Лідчыны ўступіла ў новую эпоху – новы каменны век (неаліт). Важнейшыя асаблівасці неаліту – вынаходніцтва глінянага посуду для гатавання ежы, зараджэнне земляробства і жывёлагадоўлі.

Калі позненепалеалітычных паселішчаў на Лідчыне вядома пакуль што не больш трох, мезалітычных – да дзесятка, то ў неаліце берагі Нёмана і нізоўі Дзітвы і Гаўі былі асвоены спрэс. У асабліва зручных месцах сустракаліся цэлыя скапленні стаянак. Так, толькі на берагах Нёмана каля Беліцы іх вядома каля дзесяці. Шмат такіх помнікаў у наваколлі Бярозаўкі, Пескаўцаў, Моцевіч, на Дзітве паміж Даржамі і вусцем. Пры раскопках неалітычных стаянак асаблівую ўвагу звяртаюць на сябе абломкі ляпных вастрадонных гаршкоў, аздобленых насечкамі, наколамі, адбіткамі грэбня. Падобная кераміка сустракаецца на ўсім Беларускім Панямонні. Гэта дало падставу выдзеліць у заходняй Беларусі асобную нёманскую неалітычную культуру, плямёны якой засялялі таксама паўднёвую Літву, паўночна-усходнюю Польшчу і часткова паўночна-заходнюю Украіну.

Пашырэнне земляробства вымагала высечкі лясоў. Для гэтай мэты пачалі вырабляць больш сякер, для чаго выкарыстоўваўся высокаякасны крэмень, які здабывалі на радовішчах крэйды, а апрацоўвалі на адмысловых майстэрнях. Адна такая буйная майстэрня знойдзена паўночней Даржоў на краі поплаўнага пясчанага павышэння, побач з неалітычным паселішчам. Крамянёвую сыравіну прыносілі сюды з недалёкага радовішча ў правабярэжжы Дзітвы.

На мяжы 3-га і 2-га тысячагоддзяў да н. э. на Лідчыне пачынаецца бронзавы век. Аднак з-за адсутнасці ў Беларусі металаў для ўласнай бронзавытворчасці, і ў новую эпоху на нашай тэрыторыі працягвалі дамінаваць каменныя (крамянёвыя) вырабы. Асабліва характэрнымі сталі каменныя сякеры з зашліфаванымі паверхнямі і прасвідраванымі адтулінамі для рукаятак. Такія знаходкі захоўваюцца ў некаторых школьных краязнаўчых музеях, а таксама ў музеі раённым. У бронзавым веку пачалі вырабляць і каменныя арнаментаваныя булавы, якія былі сімваламі племяннoй улады.

Эпоха першага металу на Лідчыне, як і на ўсёй Беларусі, распачалася з пранікнення груп новага насельніцтва культуры шнуравой керамікі. Культура названа так па тыповаму пласкадоннаму гліняному посуду, арнаментаванаму адбіткамі шнура. Находнікі былі прадстаўнікамі ваяўнічых плямёнаў, чыя экспансія распаўсюдзілася на велізарныя прасторы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ад Рэйна да Сярэдняй Волгі. Праўда, на Панямонні шнуравікі былі адносна нешматлікімі і не змаглі выцесніць абарыгенаў. Суіснаванне гэтых двух груп насельніцтва працягвалася доўгі час і прывяло да фармавання мясцовай культуры сярэднебронзавага часу. У познім бронзавым веку жыхары Лідчыны ўжо пачынаюць карыстацца посудам з заштрыхаванай паверхняй. Гэта сведчыць пра тое, што прыкладна з пачатку 1-га тысячагоддзя да н. э. тут фармуецца культура штрыхаванай керамікі, росквіт якой прыпадае на наступную эпоху – на жалезны век.

Гістарычная тапаграфія горада Ліда

А. К. Краўцэвіч
г. Мінск

Тапаграфічнае развіццё Ліды характарызуецца шэрагам арыгінальных рысаў. Ліда – другі па велічыні горад Гродзеншчыны – абагнаў ў сваім развіцці больш старажытныя традыцыйна значныя цэнтры, такія як Навагрудак, Слонім, Ваўкавыск.

Даволі незвычайнае тапаграфічнае размяшчэнне горада. Асноўны гістарычны раён займае невысокую пляцоўку паміж балоцістымі рэчышчамі невялікіх рачулак Лідзеі і Каменкі, у той час як буйныя гарады ўзнікалі большай часткай на ўзвышшах. Незвычайна і наяўнасць такога фактара, паўплываўшага на развіццё паселішча, як мураваны замак пачатку 14 ст.

Паглядзім жа, што вядома сучаснай навуцы аб развіцці горада Ліда як матэрыяльнага аб'екта. Інфармацыя сабрана галоўным чынам праз археалагічныя раскопкі і вывучэнне картаграфічных

матэрыялаў 18 – 19 ст.ст. Буйныя археалагічныя даследаванні праводзіліся ў лідскім замку (раскапана каля 3260 кв.м), на гарадскім пасадзе былі закладзены шурфы вакол рыначнай плошчы і ў наваколлі замка. Аўтар вывучаў матэрыялы геалагічнага бурэння, якія далі каштоўную інфармацыю па наяўнасці і магутнасці культурнага слою ў розных частках гістарычнага раёна.

Ліда ўпершыню ўпамінаецца ў пісьмовых крыніцах паміж 1323 і 1328 гадамі.[1] Вядомы гісторык 19 ст. Т. Нарбут называў іншую дату – 1180 г. Даныя археалагічных даследаванняў пацвярджаюць больш познюю датыроўку – 14 ст. На тэрыторыі Ліды не знойдзены матэрыялы часоў Кіеўскай Русі. Самыя старажытныя знаходкі – фрагменты керамічнага посуду 14 ст. выяўлены на адлегласці каля 100 м на паўночны захад ад замка. Адсутнічаюць рэльефныя прыкметы горада 12 – 13 ст. ст., узвышша, рэшткі валоў, равоў і т. п.

Ліда адносіцца да паселішчаў, якія набылі памеры і статус горада ў познім сярэднявеччы, а менавіта ў 15 – 16 ст.ст.

Верагодна, штуршком да больш інтэнсіўнага развіцця паселішча стала пабудова ля зліцця двух рэчак мураванага замка. Лідскі замак уваходзіў у абарончую сістэму, скіраваную супраць крыжакоў.[2] Ён збудаваны па ўзору ордэнскіх замкаў – кастэляў. Не выпадковым было размяшчэнне гэтага магутнага па тых часах абарончага збудавання ў моцна забалочанай мясціне. Такое ж імкненне забяспечыць прыкрыццё замка забалочаным рэчышчам мы назіраем і ў Крэве. М. А. Ткачоў высветліў, што паўночна-усходняя вежа Лідскага замка, збудаваная ў канцы 14 – пачатку 15 ст., гэта значыць пазней за паўднёва-заходнюю.[3] Відавочна, у тыя часы існаваў замаскіраваны праход цераз балота на поўдзень ад замка (магчыма, гаць, схаваная пад вадой) – у паўднёвай сцяне замка маецца невялікі праём. Відаць, якраз праз яго ў 1392 г. уцёк князь Дзьмітрый Карыбут са сваімі воямі, пакінуўшы ворагам усё, што было ў замку.

Магчыма, да пабудовы замка на месцы Ліды існавала невялікае паселішча, аднак знайсці яго сляды – вельмі складаная задача.

У познім сярэднявеччы ў Лідзе склалася тыповая для беларускіх гарадоў планіроўка. На адлегласці каля 600 – 700 м ад замка сфарміравалася гандлёвая плошча, да якой падводзяць тры галоўныя вуліцы: Замкавая, Віленская, Каменская. Раён вакол плошчы пачаў засяляцца, як сведчаць раскопкі, ў 15 ст.

Замак паступова страціў сваё ваенна-стратэгічнае значэнне. У ім адбываліся сеймікі, суды, захоўваліся архівы. Моцна разбураны ў 1659 і 1702 г. ён, урэшце, быў закінуты.

У выніку шматвекавой жыццядзейнасці ў горадзе сфарміраваўся даволі значны культурны слой – да 2 м у замку і да 2,5 м на

пасадзе.

Да нашага часу захавалася аснова сярэднявечнай вулічнай планіроўкі, але амаль нічога не засталося ад старой мураванай забудовы. У пасляваенныя часы будаўніцтва ў цэнтры праводзілася без уліку яго гістарычнага значэння. Замак аказаўся „зацiснутым" паміж высокімі будынкамі інтэрната і гатэля. Ужо не першы дзесятак гадоў вядзецца яго рэстаўрацыя, планавалася скончыць аднаўленне помніка ў 1985 г., але і зараз канца работам не відаць.

---

1. ПЗРЛ. М. 1975. Т. 32.с.41.

2. Краўцэвіч А., Трусаў А. Археалагічнае вывучэнне Лідскага замка і горада Ліды. //3 глыбіні вякоў. Мн., 1992. С. 83 – 96.

3. Ткачоў М. А. Замкі Беларусі. Мн. 1977. С.29.

Аднаўленне Лідскага замка — помніка архітэктуры і гісторыі 14 стагоддзя

У. М. Логаш
г. Гродна

Час сённяшні такі, што адраджэнне беларускай нацыі ідзе і ідзе яно, перш за ўсё, намаганнямі высока свядомых людзей, з кожным днём набывае больш шырокае і масавае аблічча, сведчаннем чаму з'яўляюцца і гэтыя чытанні.

Горад Ліда, як і многія другія гарады нашай краіны, мае багатую гістарычную спадчыну. Заснаваны ў далёкія часы, дакладна якія яшчэ належыць высветліць навукоўцам, маючы ўдалае геаграфічнае размяшчэнне, ён у розныя часы свайго існавання адыгрываў выключна важную ролю ў эканамічным, абарончым, культурным і другіх накірунках грамадскага жыцця беларускай дзяржавы.

Думаецца, што першым і самым моцным імпульсам у развіцці горада была пабудова нашым вялікім князем Гедымінам Лідскага замка, дата пачатку закладкі якога дакладна вядома пад годам 1323-м, і з гэтага часу горад Ліда і яго крэпасць уліліся ў агульную добра прадуманую сістэму абарончых вузлоў такіх, як Крэва, Меднікі, Вільня, Трокі, Гародня, Навагрудак і іншыя, што станоўча садзейнічала пашырэнню і ўмацаванню магутнасці Вялікага Княства.

Далейшы лёс горада і яго замка ў многім вывучаны, асветлены ў розных працах вучоных, асабліва ў працах гісторыка і археолага, вядомага грамадскага дзеяча, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Трусава Алега Анатольевіча, які ў 80-гадах глыбока даследаваў гісторыю і замка і горада. Хачу яшчэ дадаць, што ў наш час пачатак у вывучэнні замка і горада залажыў вядомы і паважаны вучоны, якога сёння няма ўжо, Ткачоў Міхась Аляксандравіч.

Горад Ліду я помню яшчэ з польскіх часоў, перад вайной, помню, якой разбуранай яна стала пасля выгнання немцаў. І ўвесь гэты час у цэнтры ўвагі былі руіны Лідскага замка, але у той час мала хто ведаў чаму засталіся толькі астаткі сцен.

На жаль, мы ў свой час гісторыю нашага краю вывучалі не па Ермаловічу, а той кароткі нарыс па гісторыі Беларусі Абецэдарскага мала што даваў і нават уводзіў у зман. У пачатку 1969 года мне пашчасціла натрапіць на кнігу „История Литовского государства", выданую прафесарам Віленскага ўніверсітэта Бранцавым у 70-гадах мінулага стагоддзя, у якой у храналагічнай паслядоўнасці выкладзены ўсе перыяды жыцця нашага краю. Хаця сёння не з усім, што падаецца ў гэтай кнізе, можна пагадзіцца, аднак вельмі многае стала разумецца па-другому, іншым стаў погляд на нашу дзяржаўнасць, нашу нацыю, наш народ.

Калі сёння ідзеш па горадзе Лідзе, глядзіш на яе забудову, добраўпарадкаваныя вуліцы, на тое як ужо вырысавалася крэпасць, здаецца, што так было і заўсёды, маладому чалавеку можа і не прыходзіць у галаву як было раней, як складаліся абставіны і колькі сіл было патрэбна каб усё гэта зрабіць.

Кожны пражыты дзень – гэта гісторыя, хаця і не напісаная. Тым больш гісторыя горада Ліды і яе замка пасляваенных гадоў – больш даўняя, і, думаю, што жывы расказ пра яе можа дапоўніць дакументальныя распрацоўкі таго часу.

Што датычыць крэпасці, то недзе ў 1967 годзе рашэннем мясцовых улад яна была перададзена пад шэфскі нагляд будаўнічаму трэсту № 19 і там былі абсталяваны спартыўныя пляцоўкі, падведзена вада і некалькі зімаў колькі дазваляла надвор'е там заліваўся каток. На працягу ўсяго гэтага часу са сцен паступова вывальваліся валуны, што стварала і нязручнасць і пагрозу для акружаючых.

У пачатку 70-га года была зроблена спроба некалькі ўмацаваць кладку сцен, для чаго даручана трэсту № 19 зрабіць замазку месц, дзе быў найбольш пашкоджаны раствор кладкі. Работа была выканана, але многага яна не дала.

Стала відавочным, што такі аб'ект патрабуе іншага падыходу Прыкладна тады пачала зараджацца ідэя аднаўлення замка ў тым

выглядзе, якім ён быў створаны нашымі продкамі. Гэтыя ідэі мацаваліся тым, што суседзі нашы літоўцы поўным ходам вялі работы па аднаўленню Трокскага замка, рэстаўрыравалі Вільню, вяліся работы па кансервацыі замка ў Мерачы.

Недзе ў 1973 годзе на адной з абласных сесій народных дэпутатаў было ўзнята пытанне аб аднаўленні Лідскага замка і зроблена абгрунтаванне гэтай патрэбы. Для праўды трэба сказаць, што была падтрымана тагачасным старшынёй аблвыканкама Рыгорам Фамічовым, які затым асабіста пры мне размаўляў з міністрам культуры рэспублікі. І справа зрушылася. Самае галоўнае – аб'ект уключаўся ў план, бо ў той час гэта быў рашаючы аргумент, без яго нельга было атрымаць грошы і матэрыялы, выплаціць заработную плату. Пасля пачаліся перагаворы са спецыяльнымі навуковымі рэспубліканскімі рэстаўрацыйнымі майстэрнямі і іх канкрэтнымі выканаўцамі.

Як і любая сур'ёзная справа – трэба было пачынаць з агульнага і паступова вырашаць асобныя пытанні. З гэтай мэтай было прынята рашэнне зрабіць пошук па розных крыніцах гістарычных звестак, правесці археалагічныя даследаванні, каб выявіць магчымыя забудовы ўнутры двара і за межамі замка, зрабіць перш-наперш кансервацыю рэштак сцен замка, скласці праект рэстаўрацыі, затым прыступіць да аднаўленчых работ.

Узначалілі гэту работу два чалавекі з рэстаўрацыйных майстэрань: Трусаў Алег Анатольевіч, які ажыццяўляў збор звестак і на працягу больш пяці гадоў вёў археалагічныя даследаванні, і Багласаў Сяргей Рыгоравіч, які зрабіў праект кансервацыі замка, а таксама даў архітэктурную рэстаўрацыю яго з канструктыўнымі рашэннямі ўсёй забудовы. Пачынаючы з 1976 года ў замку пачаліся археалагічныя раскопкі. Кожны год летам з Белдзяржуніверсітэта прыязджаў будаўнічы студэнцкі атрад з будучых гісторыкаў. Увесь клопат па арганізацыі работ, самога атрада ляжаў, канешне, на Трусаве Алегу Анатольевічу. Выканкам гарсавета таксама не стаяў у баку: вырашаліся пытанні харчавання, жылля, быту, адпачынку і многае іншае.

Вялікую цікавасць праводзімыя даследаванні і работы выклікалі ў гараджан і гасцей горада. Прама на вуліцы былі выстаўлены малюнкі будучага замка, каля якіх збіралася многа людзей, прыходзілі вучні школ, а самому Трусаву не раз даводзілася быць гідам на замкавым двары. Спецыяльна была праведзена экскурсія для начальнікаў цэхаў і кіраўнікоў аддзелаў завода „Лідсельмаш" на чале з дырэктарам Кашынскім Міхаілам Аляксандравічам і яго намеснікам Бубенам Уладзімірам Міхайлавічам, пасля чаго завод дапамагаў на працягу ўсяго часу работ. Адначасова з раскопкамі пачаліся работы па кансервацыі рэшткаў муроў, а затым і аднаў-

ленчыя работы. І перш за ўсё закладваліся вуглы сцен, якія былі ўзарваны пад час вайны са шведамі. Для вядзення рэстаўрацыйных работ была створана брыгада з дванаццаці чалавек, а ўзначаліў яе майстар Мацейка Іосіф.

Як толькі былі складзены чарцяжы замка, выявіліся яго прапорцыі, стала відавочным, што ў забудове горада гэты аб'ект зойме дамінуючае становішча, таму ўзнікла патрэба добраўпрадкаваць навакольле. Дзякуючы міністэрству жыллёва-камунальнай гаспадаркі рэспублікі і яго міністру Бязлюдаву Артуру Іосіфавічу, у горадзе была створана праектная група ў складзе 10 чалавек па распрацоўцы праектаў добраўпарадкавання тэрыторый, каб не дапусціць непрадуманых рашэнняў. Вялікую работу па добраўпарадкаванню пачало праводзіць рамонтна-будаўнічае ўпраўленне горада, якое ў сваім складзе стварыла спецыяльны ўчастак для гэтых работ. Вялікі творчы ўклад уносіў тагачасны галоўны архітэктар горада Анатоль Сяргеевіч Пархута.

Неўзабаве ўсё гэта дало добры плен. У 1979 годзе на пасяджэнні Савета Міністраў БССР станоўча была ацэнена работа Лідскага гарвыканкама па добраўпарадкаванню горада і было рэкамендавана выкарыстаць гэты вопыт другім.

Вырашаць гэтыя пытанні станоўча немагчыма было без дапамогі прадпрыемстваў горада, будаўнікоў. Кожны ў меру сваіх магчымасцей садзейнічаў аднаўленню замка і яго тэрыторыі. Сёння, калі ідзеш з боку вуліцы Савецкай і набліжаешся да замка, вялікае ўражанне выклікае маштаб усёй забудовы: сцен і вежы. І між волі ўзнікае думка, што продкі нашы беларусы былі вялікімі майстрамі, маглі тварыць па ўсіх правілах архітэктурнага і будаўнічага мастацтва. Замак будавалі не людзі з далекага ці блізкага замежжа, а менавіта навакольнае насельніцтва прымала ўдзел у гэтым будаўніцтве, стварала шэдэўр свайго часу.

Крыху толькі крыўдна, што работа ідзе маруднавата. Што трэба зрабіць, каб паскорыць яе? На маю думку, неабходна перш за ўсё закончыць да канца работы па першай вежы. І, так як і планавалася, зрабіць экспазіцыю і пачаць яе эксплуатацыю. Гэта выкліча цікавасць людзей і пачне хоць якую даваць аддачу.

І яшчэ адна думка. Перша прычына заняпаду замка – гэта вайна Расіі са Швецыяй. Дакладна вядома, што падчас гэтай вайны замак узарвалі шведы – яны разбурылі дзве вежы і два процілеглыя вуглы сцен двара. І адразу ж замак страціў сваё абарончае значэнне і прызначэнне для жылля. У той час Беларусь была ў складзе Рэчы Паспалітай і нам было не да таго, каб заявіць прэтэнзіі і патрабаваць кампенсацыі. Пазней Беларусь апынулася ў складзе Расійскай імперыі і зноў жа некаму было клапаціцца аб гэтым. Такое становішча цягнулася аж да апошняга часу. Нядаўна

дзяржава наша набыла самастойнасць, але апынулася ў цяжкім эканамічным становішчы і, думаю, яно яшчэ няскора палепшыцца. Таму лічу, што ад імя нашай канферэнцыі трэба выказаць просьбу да грамадскасці Швецыі, а можа і да ўлад, няхай і яны ведаюць, што нарабілі іх далёкія продкі на чужой зямлі, ну і няхай хоць неяк прымуць удзел у пакрыцці тых страт, якія мы нясем не па сваёй віне. Думаю, што гэта будзе справядліва. Ну і няхай будзе прэцэдэнтам таго, што даўнасці ў вайны і злачынства не бывае.

На заканчэнне хачу выказаць спадзяванне, што ўсё-такі рэстаўрацыя замка будзе завершана ў бліжэйшы час, бо гэта гонар нашай нацыі, гэта той корань, сокі якога будуць доўга жывіць самасвядомасць нашага народа.

Першыя ўгодкі смерці Міхася Ткачова

31 кастрычніка – гадавіна смерці Міхася Ткачова – бліскучага гісторыка, прынцыповага палітыка, таленавітага арганізатара, заснавальніка Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады і яе першага старшыні.

У гэты дзень у Гародні адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі на доме, дзе жыў Міхась Ткачоў, а 2 лістапада, у Дзень памінавання, быў адкрыты помнік на магіле гэтага выдатнага чалавека.

Каб ушанаваць памяць Міхася Ткачова ў Гародню прыехала дэлегацыя Цэнтральнай Рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады ў складзе А. Сідарэвіча, А. Кажэры, Т. Паляковай, а таксама навукоўцы з Мінска і Беласточчыны.

Мітынг з нагоды адкрыцця памятнай дошкі пачаўся хвілінай маўчання, пасля якой з цудоўным спевам выступіў хор гісторыка-культурнага клуба „Паходня". Сімвалічна, што дошку ва ўшанаванне памяці выдатнага знаўцы беларускай мінуўшчыны асвяціў настаяцель самай старажытнай у Гародні святой Барысаглебскай царквы айцец Анатоль.

З цёплымі словамі ўспамінаў аб прафесары Ткачове выступілі намеснік старшыні Гародзенскага гарвыканкама Аляксандр Мілінкевіч, вучань Міхася Ткачова, кандыдат гістарычных навук Генадзь Семянчук, літаратар з Беласточчыны Алег Латышонак.

Міхась Ткачоў прыехаў у Гародню ў 1978 годзе, у гады работы ва ўніверсітэце ён паспяхова спалучаў пленную навуковую і педагагічную працу з грамадскай і палітычнай дзейнасцю. Менавіта яго намаганнямі гародзенскі гісторыка-культурны клуб „Паходня" зрабіўся цэнтрам і ініцыятарам адраджэнскага руху.

Аб прыцягальнай сіле, аб значэнні Ткачова-палітыка, Ткачова-грамадскага дзеяча для сучаснасці і будучыні Беларусі сказаў у сваёй прамове член Цэнтральнай Рады БСДГ Анатоль Сідарэвіч.

З цёплымі, кранаючымі душу словамі пра Міхася Ткачова, сябра і паплечніка, выступіў Старшыня Народнага фронта Зянон Пазняк.

Вядучы мітынга, старшыня Гародзенскай філіі БСДГ Міхась Патрэба падзякаваў аўтару памятнай дошкі скульптару Уладзіміру Панцялееву, архітэктару Анатолю Капцюху, які аформіў месца, дзе ўстаноўлена дошка, а таксама фундатарам, якія зрабілі грашовы ўклад у яе выраб і ўстаноўку, у тым ліку беларусам, якія жывуць за мяжой – рэдактару Нью-Йоркскай газеты Янку Запрудніку і сям'і прафесара Вітаўта Кіпеля.

„Мы не спынім намаганні, – сказаў Міхась Патрэба, – каб дошка ва ўшанаванне памяці Ткачова з'явілася і на будынку ўніверсітэту".

2 лістапада, на Дзяды, на Усходніх могілках адбыўся мітынг з нагоды адкрыцця помніка на магіле Міхася Ткачова.

На цырымоніі адкрыцця прысутнічалі: аўтар помніка скульптар Алесь Шатэрнік, родныя і блізкія Міхася Ткачова, сябры БСДГ, вядомыя навукоўцы, культурныя, дзяржаўныя і палітычныя дзеячы, у тым ліку Народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў, Старшыня Народнага Фронту Зянон Пазняк і Старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч.

Выступоўцы гаварылі аб тым, што Міхась Ткачоў быў найперш бліскучым гісторыкам, які па-новаму асвяціў старонкі беларускай мінуўшчыны, а ўжо потым палітыкам. Ён прыйшоў у палітыку таму, што добра ведаў – толькі праз яе вядуць шляхі да адраджэння Бацькаўшчыны, яе культуры і мовы.

М. Ткачоў хацеў бачыць Беларусь незалежнай дэмакратычнай прававой дзяржавай, у якой абаронены правы і свабоды простага чалавека. Грамадская дзейнасць Ткачова была разнастайнай і шматграннай. Як палітык ён глыбока разумеў неабходнасць стабільнасці і грамадскай згоды ў перыяд дзяржаўных і эканамічных рэформаў, неабходнасць паяднання ўсіх дэмакратычных сіл на грунце палітычнага, сацыяльнага і духоўнага адраджэння Беларусі.

Міхась Ткачоў застаўся ў нашай памяці не толькі сумленным, прынцыповым, памяркоўным палітыкам, які карыстаўся ўсеагульнай павагай, але і чалавекам вялікай душэўнай шчодрасці і абаяльнасці. Ён пайшоў ад нас у росквіце сваіх інтэлектуальных і духоўных магчымасцей, але ж яго высілкі сталі адным з падмуркаў будавання незалежнай вольнай Беларусі.

ЗМЕСТ

Прадмова

І. СКАРЫНІЯНА

Адам Мальдзіс. Францішак Скарына як прыхільнік паяднання народаў 5

Ю. А. Лабынцев. Литературное творчество Франциска Скорины и традиции европейского Рянессанса 9

А. Г. Майсяёнак. Францыск Скарына і навацыі еўрапейскай медыцыны пачатку 16 стагоддзя 13

Л. Р. Шагун. Гродзенская Скарыніяна 16

Ф. И. Игнатович. Состояние и перспективы увековечивания имени Ф. Скорины 19

И. В. Пантюк, Т. П. Разуменко. Доктор медицины Ф. Скорина и медицина средневековья Беларуси в экспозиции Республиканского музея истории медицины Беларуси 23

В. Рамук. Слова аб Скарыне – доктары медыцыны 26

А. Н. Нарбут. Родословная Франциска Скорины и его возможность потомков 27

П. ГІСТОРЫЯ І КРАЯЗНАЎСТВА ЛІДЧЫНЫ

В. М. Чарапіца. Асноўныя напрамкі комплекснага навуковага даследвання гісторыі горада Ліды 35

А. П. Цыхун. Хан Тахтамыш і Вітаўт Вялікі 38

В. В. Сливкин. Островское соглашение 41

А. Н. Нарбут., Н. И. Нарбут. Нарбуты лидские 44

І. Г. Трусаў. Матэрыялы па гісторыі архітэктуры Лідчыны ў беларускіх і замежных сховішчах 52

М. Сачак. Гісторыя Ліды ў дакументах Беларускага дзяржаўнага гістарычнага архіва 55

А. Ф. Кулеш. Горад Лида и лидчáне. Исторический очерк 59

С. В. Палуцкая. З гісторыі уніяцтва на Лідчыне 66

У. А. Сосна. Саслоўна-групавы склад сялянства Лідскага павета ў першай палове XIX ст 74

М. І. Булай. Лідскія шляхі Ігната Дамейкі 78

В. В. Швед. Вайсковы начальнік Лідскага павета грамадзянін Нарбут 83

С. Я. Сяльверстава. Старонкі тэатральнага жыцця Ліды першай паловы XIX стагоддзя 87

Андрэй Чэмер. Заходняя Беларусь пад польскай акупацыяй 1920-1939 г.г..... 90
М. В. Васілючак. Лідчына ў верасні 1939-чэрвені 1941 г.г..... 96
Ю. Туронак. Жыццё і дзейнасць Вацлава Іваноўскага..... 99
М. В. Васілючак. За што змагаліся акаўцы..... 102
Янка Трацяк. Беларускія святары Гарадзеншчыны..... 106
Л. Я. Кулажанка. Літаратурныя мясціны Лідчыны..... 116
А. В. Жалкоўскі. Прабач нам, мілая Пашкевічанка..... 118
Т. М. Мікуліч. Этнаграфічнае вывучэнне Лідчыны..... 121
Уладзімір Васілевіч. Фальклор Лідчыны ў запісах Амеліі Дарвінскай (Біруты)..... 126

ІІІ. АРХЕАЛОГІЯ ЛІДЧЫНЫ (Прысвячаецца памяці Міхася Ткачова)

М. М. Чарняўскі. Першыя людзі на Лідчыне..... 130
А. К. Краўцэвіч. Гістарычная тапаграфія горада Ліды..... 132
У. М. Логаш. Аднаўленне Лідскага замка – помніка архітэктуры і гісторыі ХІУ стагоддзя..... 135
Першыя ўгодкі смерці Міхася Ткачова..... 139

63.3 /4 Бел/

З 11.

НАШ РАДАВОД

З гісторыі Лідчыны

Зборнік матэрыялаў міжнародных гісторыка-краязнаўчых чытанняў у Лідзе, якія адбыліся 24-26 ліпеня 1993 г.

Чытач знойдзе тут звесткі і факты, якія раней не прыводзіліся ў нашай гістарычнай і краязнаўчай літаратуры. Кніга разлічана на ўсіх, хто любіць свой край, цікавіцца яго гісторыяй і культурай.

Ліцэнзія № 221
Здадзена ў набор 2.03.94 г.
Падпісана да друку – 7.06.94 г. Фармат 60x84 1/16.
Папера кн. журнальная. Друк афсетны.
Умоўных друк. аркушаў 9. Тыраж 2000.
Заказ 1582.
Гродзенскае аддзяленне Беларускага фонду культуры.

Лідская друкарня вул. Ленінская, 23.